WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 САКАВІКА 2010 г.
СЕРАДА
№ 43
(26651)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«ДЗЯРЖАВА НЕ БУДЗЕ ЗАБАРАНЯЦЬ ІГРАЛЬНЫ БІЗНЭС, АЛЕ ЎЗМОЦНІЦЬ КАНТРОЛЬ ЗА ІМ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў краіне не варта забараняць ігральны бізнэс, а ўзмацніць дзяржаўны кантроль за гэтай сферай дзейнасці. Такое меркаванне ён выказаў на нарадзе, на якой абмяркоўвалася канцэпцыя развіцця ігральнага бізнэсу ў Беларусі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Пры правільным падыходзе ігральны бізнэс можа і павінен стаць дадатковай крыніцай папаўнення бюджэту за кошт падаткаў, садзейнічаць стварэнню новых рабочых месцаў, прыцягненню турыстаў і інвестыцый у нашу краіну, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — На фоне змяненняў у расійскім і ўкраінскім заканадаўствах у нас ёсць усе шанцы выйсці на вядучыя пазіцыі ў гэтай тонкай, важнай сферы. Дзейнічаць тут неабходна вельмі асцярожна, прадумана і дасведчана, з карысцю для краіны».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такі спецыфічны від дзейнасці ў сучасных умовах патрабуе асаблівай увагі. У свеце існуюць розныя падыходы да яго арганізацыі і функцыянавання. У адных краінах гэты бізнэс падтрымліваюць, у іншых — забараняюць, у трэціх — абмяжоўваюць і кантралююць.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, як паказвае вопыт Расіі і Украіны, адсутнасць узважанай палітыкі з боку дзяржавы ў адносінах да ігральнага бізнэсу прыводзіць практычна да яго поўнай забароны. А гэта садзейнічае таму, што высокадаходны бізнэс ідзе ў цень, становіцца здабычай крымінальных колаў, прыносячы шкоду грамадству. «З гісторыі мы пераканаліся, што забароны нічога, акрамя шкоды, не даюць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму забараняць наогул, акрамя выключна шкодных для дзяржавы напрамкаў дзейнасці, не варта, трэба разумна кантраляваць і пры неабходнасці змагацца з негатыўнымі з'явамі таго або іншага напрамку дзейнасці».

«Гэта я гавару для тых, хто заўтра ўзніме гвалт аб тым, што мы ледзь ці не ўвесь крымінальны свет СНД збяром у Беларусі», — дадаў Прэзідэнт. «Усё ў нас будзе нармальна, калі тыя, хто прызначаны кантраляваць і адказваць за гэты від дзейнасці, — дзяржаўныя служачыя, — самі не ўлезуць туды па вушы і тым самым не разваляць гэты від дзейнасці і не крыміналізуюць яго, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Калі дзяржаўныя служачыя будуць займаць прыстойную пазіцыю, то ўсё будзе нармальна». Кіраўнік дзяржавы таксама заўважыў, што гэтага «не было ні ў Расіі, ні ва Украіне», дзе розныя групоўкі падзялілі гэты від дзейнасці.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што амаль паўгода таму даў даручэнне ўраду сумесна з іншымі зацікаўленымі ведамствамі распрацаваць напрамкі развіцця ігральнага бізнэсу ў Беларусі, прычым з улікам як эканамічных, так і сацыяльных фактараў. Вынікам гэтай работы стала Канцэпцыя развіцця ігральнага бізнэсу ў краіне. На думку ўрада, яна прадугледжвае ўзмацненне дзяржаўнага кантролю, выключае магчымасць удзелу ў гэтай сферы крымінальных структур. Акрамя таго, дасць магчымасць істотна павялічыць падатковыя паступленні ў бюджэт, а таксама абароніць народ ад пападання ў ігральную залежнасць ад «аднарукіх бандытаў».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў ходзе абмеркавання трэба будзе высветліць, наколькі ўнесеная канцэпцыя адпавядае такім намерам.

Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна прыняць максімальна ўзважанае рашэнне, каб дзейнасць у гэтай сферы была камфортнай як для камерцыйных структур, так і для дзяржавы і пры гэтым не стварала негатыўных сацыяльных наступстваў для грамадзян.

ЧАПЛІ ТАКСАМА ЗАЧАКАЛІСЯ ВЯСНЫ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НА ВЫХАДНЫЯ ЗНОЎ СНЕГ

паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

У сераду, чацвер і пятніцу ападкаў не будзе. Удзень у сераду ад мінус 4 да плюс 3 градусаў. Уначы ў чацвер і пятніцу мінус 2—9, пры праясненнях да 10—13 марозу, удзень — ад мінус 1 да плюс 6 градусаў.

А вось у суботу да нас завітае халодны цыклон. Паўсюдна пройдзе снег, мокры снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. У суботу ўначы мінус 2—9, па паўднёвым усходзе пры праясненнях да 12 марозу, удзень — ад мінус 2 да 3 цяпла. У нядзелю ўначы чакаецца мінус 4—11, пры праясненнях да 13—16 марозу, удзень — 1—8 ніжэй за нуль. Не вельмі актыўная вясна атрымліваецца і сур'ёзнага цяпла сіноптыкі пакуль не абяцаюць.

Сяргей КУРКАЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ІНКАСАТАР ВЫРУЧКУ НЕ АДДАЎ

У Полацкім раёне, у гарадскім пасёлку Ветрына, 8 сакавіка злодзей спрабаваў адабраць інкасатарскую сумку ў інкасатара. Той прымяніў зброю і затрымаў злачынцу: дзейнічаў вельмі прафесійна.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Галоўным упраўленні Нацыянальнага банка па Віцебскай вобласці, напад на інкасатара-зборшчыка адбыўся тады, калі ён працаваў на маршруце, выходзіў з грашыма з крамы. У сумцы інкасатара было каля 6,6 мільёна рублёў. Затрыманы ім зламыснік знаходзіцца пад аховай на лячэнні ў бальніцы: пры затрыманні ён быў паранены ў нагу.

Інкасатара, які затрымаў злачынцу, плануецца ўзнагародзіць за актыўную дапамогу міліцыі ў рамках акцыі «Грамадзянская мужнасць», што праводзіцца УУС Віцебскага аблвыканкама.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РАБАЎНІЦТВА, ЯКОГА НЕ БЫЛО

Каб «зацікавіць» міліцыю ў пошуках страчанага, малады мінчанін выдумаў злачынства

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр Кастрычніцкага РУУС Сяргей Чабатароў, па дапамогу да праваахоўнікаў звярнуўся пацярпелы, які расказаў, што стаў ахвярай нападу: маўляў, позна ўвечары вяртаўся дадому, і нехта ззаду ўдарыў яго па галаве, а калі апрытомнеў — выявіў, што знік мабільны тэлефон. Па гэтым факце была ўзбуджаная крымінальная справа, і супрацоўнікі міліцыі прыступілі да комплексу аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў, накіраваных на раскрыццё злачынства. Толькі падчас следства выявілася адна цікавая акалічнасць, якая з пацярпелага ператварыла заяўніка ў абвінавачанага. А справа ў наступным. Пошукі праваахоўнікаў далі плён — тэлефон аператыўнікі адшукалі. Аднак знік апарат зусім пры іншых абставінах, чым пра гэта «жывапісаў» нібыта пацярпелы. Як высветлілася, сотавік нецвярозы заяўнік забыў у таксі. Апарат каштаваў нятанна, а таму мінчук, каб знайсці яго, звярнуўся ў міліцыю, вось толькі нафантазіраваў пра тое, што адбылося, каб «палепшыць працэс пошуку». У выніку ў адносінах да хітруна ўзбуджаныя крымінальныя справы па артыкулах 400 («Заведама несапраўдны данос») і 401 (Заведама несапраўднае паказанне»), і цяпер яму пагражае абмежаванне волі да двух гадоў.

Ігар ГРЫШЫН.

НЕ САЦРАБОТНІКІ, А ЗЛАДЗЕЙКІ

Магілёўская міліцыя шукае дзвюх жанчын, якія пад выглядам сацыяльных работнікаў абакралі пенсіянерку. Яны завіталі да 79-гадовай жанчыны напярэдадні свята, і на наступны дзень гаспадыня зразумела, што з кватэры зніклі 4 мільёны рублёў і 100 долараў.

Алена КАЗЛОВА.

ПАГРУЗЧЫК ПЕРАКУЛІЎСЯ І...

У в. Прыборава (Брэсцкі раён) вядзецца будаўніцтва цэха ААТ «Камароўка». Падчас работы пад міні-пагрузчыкам абвалілася зямля і ён разам з вадзіцелем зваліўся ў меліярацыйны канал.

Пацярпелага даставілі ў бальніцу, але ён быў без памяці да самай смерці. Урачы паставілі дыягназ «пераахаладжэнне арганізма і ўтапленне».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАДЫХНУЎСЯ Ў РАПСЕ

5 сакавіка на Бабруйскім заводзе рапсавага алею загінуў рабочы, які зваліўся ў вагон з рапсам. Пра гэта паведаміў прэс-сакратар Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Юрый Мятліцкі.

Выратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, устанавілі, што пры разгрузцы рапсу, на даху чыгуначнага вагона спатыкнуўся і зваліўся ў раскрыты люк 21-гадовы рабочы, і далей патокам рапсу яго зацягнула ў воронку. Калі пацярпелага выцягнулі, медыкі канстатавалі яго смерць.

Ілона ІВАНОВА.

ЗАГІНУЎ АД УДАРУ ТОКАМ

У вёсцы Клятное Пінскага раёна механізатар мясцовага лясніцтва праводзіў зварачныя работы ў гаражы лясніцтва. 40-гадовы трактарыст быў смяротна траўмаваны электратокам. Праверку па факце няшчаснага выпадку праводзіць Пінская пракуратура.

Яна СВЕТАВА.

БУРАКІ ВЫРАСТУЦЬ І ГЕРБІЦЫДЫ НЕ ПРАПАДУЦЬ

Памежнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі каля в. Дубок (Брэсцкі раён) выявілі 40 пяцілітровых каністраў з гербіцыдам і кардонкі з насеннем цукровых буракоў.

У гэтым месцы мяжа праходзіць пасярэдзіне меліярацыйнага канала і кантрабанда трапіла на нашу тэрыторыю без парушэння мяжы. Тыя каністры і кардонкі былі перакінуты праз канал на наш бок.

Хімікаты і насенне пацягнулі на 18,5 мільёна рублёў. Іх канфіскавалі.

ПАГАРЭЎ НА ПРЭЗЕРВАТЫВАХ

Супрацоўнікі міліцыі і Брэсцкай мытні затрымалі каля в. Чарняны (Маларыцкі раён) аўтамашыну для праверкі.

Беспрацоўны жыхар Кобрына не меў дакументаў на каву, запальнічкі і 1092 упакоўкі прэзерватываў. Тавар коштам звыш 15 млн рублёў канфіскаваны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Надзённае

ЗАРОБАК ВЫЗНАЧАЕ ЭКАНОМІКА

ГАВОРАЦЬ, што прыярытэтнымі тэмамі для людзей ва ўсе часіны з'яўляюцца здароўе, надвор'е і грошы. Менавіта грошы цяпер вылучаюць на першую пазіцыю, і не толькі з-за наступстваў крызісу. У Беларусі абвешчаны вялікія планы: сярэдні заробак напрыканцы гэтага года павінен дасягнуць 500 долараў у рублёвым эквіваленце. Для Магілёўскай вобласці гэтая знакавая лічба складае 1,3 мільёна рублёў, ці 444 долары. Якім шляхамі будзе дасягнуты такі сярэдні заробак і якія ўмовы для гэтага неабходны? Пра гэта ў інтэрв'ю «Звяздзе» расказвае намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Віктар НЕКРАШЭВІЧ.

Магілёўшчына — 444

— Улады рэгіёна, падаецца, не маюць сумненняў, што лічба ў 444 долары — цалкам дасягальная.

— Пачнём з таго, што наша эканоміка мае сацыяльную скіраванасць. Канчатковая мэта — дабрабыт нашых людзей. Кожны чалавек ставіцца да ўлады і вызначае стаўленне ўлады да сябе паводле лічбаў у разліковым квітку заробку. Ці не так?

Мова лічбаў увасабляецца ў рэальнае жыццё, калі мы ідзём у краму. Там мы адразу адчуваем, многа ці мала мы зарабляем грошай.

— А 500 долараў, да якіх сёння імкнецца краіна, на ваш погляд, — гэта многа ці мала?

— Адназначнага адказу на гэтае пытанне няма. Калі такі заробак стварае ўмовы для таго, каб чалавек мог пракарміць сям'ю, заплаціць за камунальныя паслугі, даць добрую адукацыю дзецям, забяспечыць дастойную старасць сваім бацькам, дык гэтага дастаткова. 500 долараў — гэта значны крок у павелічэнні дабрабыту нашага насельніцтва.

Але трэба разумець, што ўсё адносна. У В'етнаме ці Манголіі сума ў 500 долараў з'яўляецца неймавернай. Іншым і гэтага мала. Увогуле, чалавеку заўсёды будзе мала, таму што ён імкнецца жыць лепей, спажываць больш якаснае, расці і ўдасканальвацца.

СТАР. 6

Падрабязнасці

СУДОВЫ ВЫКАНАЎЦА... ПРЫСВОЙВАЎ ГРОШЫ І МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

ГРУБЫЯ парушэнні заканадаўства, якія прычынілі шкоду дзяржаве, установленыя ў ходзе праверкі галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама ў частцы дзейнасці судоў, паведамляе Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці. Праверка праводзілася сумесна з супрацоўнікамі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй па Гродзенскай вобласці МУС Беларусі.

Увагу правяраючых прыцягнула дзейнасць старшага судовага выканаўцы суда Ленінскага раёна г. Гродна. Знаходзячыся пры выкананні сваіх службовых абавязкаў, ён атрымліваў ад грамадзян у якасці выплаты штрафаў грашовыя сродкі, якія... не паступалі ні на дэпазітны рахунак суда, ні на карысць спагнальнікаў. Больш за тое, гэтым прадстаўніком улады рабіліся актыўныя захады па спагнанні з даўжнікоў наяўных грашовых сродкаў, якія ён прысвойваў і траціў у асабістых мэтах.

Для ўтойвання фактаў сваёй злачыннай дзейнасці старшы судовы выканаўца спыняў выканаўчыя вытворчасці шляхам змяшчэння ў іх фіктыўных плацежных даручэнняў аб пералічэнні быццам спагнаных грошай у даход мясцовага бюджэту і на рахункі іншых арганізацый. Праверкай установлена, што на гэтых плацежных дакументах прастаўлены адбіткі арыгінальнага штампа і подпісы супрацоўніка банка, у якім абслугоўваўся суд Ленінскага раёна г. Гродна. Гэта сведчыць пра халатнае стаўленне работніка галоўнага філіяла ААТ «Белінвестбанк» да выканання сваіх службовых абавязкаў.

Замест перадачы ў рэалізацыю былі ўкрадзены больш за 500 адзінак матэрыяльных каштоўнасцяў, у тым ліку 45 залатых вырабаў, атрыманых судовым выканаўцам у лік кампенсавання іскаў. Тым самым прычынена шкода дзяржаве на суму больш за 130 мільёнаў рублёў. Паводле звестак Галоўнага ўпраўлення каштоўных металаў і камянёў Міністэрства фінансаў, каштоўныя металы і вырабы з іх апошні раз судом Ленінскага раёна адпраўляліся ў 2003 годзе.

Варта адзначыць, што шэраг грамадзян, аплаціўшы суму іску ў добраахвотным парадку і ў поўным аб'ёме, не могуць вярнуць сваю маёмасць. Яна была забрана ў якасці кампенсавання іску, аднак у вызначаных заканадаўствам месцах захоўвання адсутнічае.

Установлены выпадак, калі матэрыяльныя каштоўнасці судовы выканаўца атрымаў ва УУС Гродзенскага аблвыканкама без даверанасці суда на атрыманне рэчавых доказаў.

У выніку незаконнай дзейнасці судовага выканаўцы грашовыя сродкі не паступілі нават на лячэнне дзіцяці. Расходы па яго ўтрыманні ў суме 325 тысяч рублёў спагналі з маці, аднак на рахунак установы аховы здароўя так і не былі пералічаныя.

Пры гэтым, зазначае Камітэт дзяржкантролю, галоўным упраўленнем юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама, у абавязкі якога ўваходзіць ажыццяўленне кантрольна-наглядных функцый за дзейнасцю судоў, у ходзе неаднаразовых праверак суда Ленінскага раёна недахопаў не выяўлена, што дазваляе зрабіць выснову аб неналежным ведамасным кантролі.

Варта таксама адзначыць, што старшы судовы выканаўца ўзначальваў... Савет судовых выканаўцаў агульных судоў пры Міністэрстве юстыцыі Беларусі.

Матэрыялы праверкі накіраваныя ў пракуратуру Гродзенскай вобласці для прыняцця мераў пракурорскага рэагавання, вядзецца следства. У дачыненні да старшага судовага выканаўцы ўжо заведзена трынаццаць крымінальных спраў. Пяць службовых асобаў прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Акт праверкі разгледжаны на калегіі Міністэрства юстыцыі Беларусі, у адрас кваліфікацыйнай калегіі суддзяў Гродзенскага абласнога суда накіраваны матэрыялы для прыняцця рашэння аб вызваленні ад пасады асобных работнікаў суда.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ТУРАК НАПАЎ НА КОНСУЛЬСТВА УКРАІНЫ

Грамадзянін Турцыі, паранены пры нападзе на генеральнае консульства Украіны ў Стамбуле, пагражаў падарваць дыпламатычнае прадстаўніцтва з-за сваркі з жонкай-украінкай, паведамляе «Інтэрфакс».

Паводле слоў мэра Стамбула Муамара Гюлера, паводзіны 29-гадовага турка былі справакаваныя спрэчкамі з жонкай, якая нядаўна вярнулася з Украіны. Ён падкрэсліў, што напад не справакаваны ні палітычнымі, ні тэрарыстычнымі матывамі.

Паводле звестак РІА Навіны, мужчына, які напаў на консульства, меў пры сабе не толькі бомбу, якую ён пагражаў падарваць у тым выпадку, калі ахова не прапусціць яго ўсярэдзіну будынка, але і пісталет. З яго мужчына зрабіў некалькі стрэлаў у бок супрацоўнікаў дыпламатычнага прадстаўніцтва. Паводле папярэдніх звестак, ніхто з ахоўнікаў не пацярпеў. Раненне, якое атрымаў сам зламыснік, таксама не з'яўляецца небяспечным для жыцця.

Паводле інфармацыі турэцкага тэлеканала, на першым допыце высветлілася, што такім чынам зламыснік спрабаваў адпомсціць украінскім праваахоўным органам.

29-гадовы турак распавёў, што каля года жыў ва Украіне. Аднойчы, палічыўшы, што ў яго хату залез злодзей, ён выклікаў міліцыю. Выклік, аднак, быў ілжывым, і турка прыцягнулі да адказнасці, узяўшы пад варту. Па заканчэнні следчых дзеянняў яго экстрадзіравалі на радзіму. Турак заявіў, што ва ўкраінскай турме ён падвяргаўся гвалтоўным дзеянням, катаванням і збіццю.

У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ ЗАБАСТАВАЛІ 270 ТЫСЯЧ ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫХ

У Вялікабрытаніі ў панядзелак, 8 сакавіка, пачаўся двухдзённы страйк 270 тысяч дзяржслужачых. BBC News адзначае, што гэта найбуйнейшая забастоўка ў краіне за апошнія 20 гадоў.

Страйк абвясцілі члены прафсаюза працаўнікоў сферы паслуг (Public and Commercial Services Union, PCS), якія прадстаўляюць супраць намеру ўрада змяніць схему кампенсаванняў пры звальненні. Гэта можа на трэць зменшыць выплаты, якія атрымліваюць звольненыя работнікі.

Урад Вялікабрытаніі, наадварот, сцвярджае, што члены прафсаюза раней пагадзіліся з тым, што прапанаванае скарачэнне выплат будзе прымальным. Чыноўнікі падлічылі, што новая схема выплат дазволіць дзяржаве зэканоміць паўмільярда фунтаў стэрлінгаў.

З-за страйку ўтварыліся чэргі ў аэрапортах і портах, а слуханні ў судах могуць быць перанесеныя. Акрамя таго, да забастоўкі маюць намер далучыцца супрацоўнікі музеяў, а таксама супрацоўнікі цэнтраў, якія прымаюць іспыты па кіраванні аўтамабілем.

ЯНУКОВІЧ АДМОВІЎ РУСКАЙ МОВЕ Ў СТАТУСЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч 9 сакавіка выказаўся за захаванне ўкраінскай адзінай дзяржаўнай мовы, паведамляе агенцтва «Украінскія навіны». Гэту заяву ён зрабіў у горадзе Канеў Чаркаскай вобласці, каля магілы Тараса Шаўчэнкі, дзе праходзяць урачыстыя мерапрыемствы ў гонар 196-х угодак з дня нараджэння вялікага ўкраінскага песняра.

«Ва Украіне будзе развівацца ўкраінская мова як адзіная дзяржаўная мова», — сказаў прэзідэнт Украіны, прызнаўшы пры гэтым, што і іншыя мовы таксама павінны развівацца. Падчас перадвыбарнай кампаніі Януковіч заяўляў, што ў выпадку абрання на пасаду кіраўніка дзяржавы, ён будзе дамагацца надання рускай статусу дзяржаўнай.

НЯМЕЦКІХ СВЯТАРОЎ ВІНАВАЦЯЦЬ У ДАМАГАННЯХ

Больш за сотню былых выхаванцаў прыватнай школы-інтэрната ў Германіі заявілі пра тое, што ў гады вучобы падвяргаліся сэксуальным дамаганням з боку сваіх настаўнікаў.

Цяпер праверка абгрунтаванасці такога роду абвінавачанняў ідзе ў 18 з 27 епархій Рымска-каталіцкай царквы ў Германіі. Большасць абвінавачанняў у дамаганнях адносяцца да падзей 20-30-гадовай даўнасці, і ўлады Германіі разглядаюць пытанне пра змену тэрміну даўнасці па гэтых справах.

Каталіцкую царкву ў Германіі ў апошнія тыдні патрэсла некалькі скандалаў, звязаных з сэксуальнымі дамаганнямі. На пачатку года кіраўніцтва адной з берлінскіх езуіцкіх школ прызнала, што ў 1970—1980 гадах сапраўды мелі месца сістэматычныя дамаганні ў дачыненні да выхаванцаў навучальнай установы з боку двух святароў. Пазней з'явілася інфармацыя пра аналагічныя правапарушэнні ў іншых каталіцкіх школах.

Лявон ВОЛЬСКІ:

«ІДЭЯ ПРАЕКТА ЎЗНІКЛА, КАЛІ ЗАБІРАЎ ДАЧКУ АДЭЛЮ З САДОЧКА...»

Вядомы музыка прэзентуе дыск «Белая яблыня грому» — на вершы беларускіх класікаў ад XVIII да XXI стагоддзя

Унук Віталя Вольскага, сын Артура Вольскага — Лявон Вольскі падышоў да класікі не наскокам.

Класік сучаснай беларускай музыкі Лявон Вольскі выпускае класічны праект. «Белая яблыня грому» — дванаццаць песень на вершы беларускіх класікаў, ад Чачота да Барадуліна. 23 сакавіка на вялікай сцэне Купалаўскага тэатра адбудзецца прэзентацыя праекта і дыска. Першае аддзяленне — уласна песні са складанкі, другое аддзяленне — малавядомыя песні Вольскага, якія ён пісаў сам, а не са сваім гуртом NRM. Якраз гэтымі днямі ў інтэрнэце прэзентуецца першая песня са складанкі — «Немец» Багушэвіча. Сімвалічна, бо якраз гэтымі днямі мы адзначаем 170-годдзе паэта!.. Адметна, што Вольскі сам аздобіў дыск — прыдалася мастацкая адукацыя. Да дыска дадаюцца дзве кніжачкі — у адной біяграфіі і партрэты паэтаў (работы Вольскага), у другой — уласна тэксты песень і малюнкі Лявона «на тэму». Праект знакавы — праслухаўшы яго, разумееш, што беларуская літаратура — магутная і вечная, паэзія наша — непаўторная і светлая, а спевакі нашы — нават сучасныя — трымаюцца каранёў, любяць сваё. Лявон Вольскі — сённяшні госць «Звязды».

СТАР. 5



Так будзе выглядаць дыск: вершы, малюнкі, біяграфіі паэтаў.

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ» состоится 22 марта 2010 года в 12.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, актовый зал (3 этаж).

Повестка дня:

1. О заключении сделки, в совершении которой имеется заинтересованность аффилированных лиц ОАО «Белгорхимпром», одновременно являющейся крупной сделкой Общества.
2. Об утверждении регламента работы открытого акционерного общества «Белгорхимпром» с реестром владельцев ценных бумаг.

Регистрация акционеров — в день проведения собрания с 10.00 до 11.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНП 600024712.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ»

Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица)	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»**
Место жительства (местонахождение для юридического лица)	**220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Наименование и местонахождение эмитента	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций (штук)	**30 000**
Цена приобретения (белорусские рубли)	**25 000**
Сроки, форма и порядок расчета	**Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций в течение 30 календарных дней со дня заключения договоров купли-продажи акций**
Адрес, по которому будут представляться предложения акционеров и заключаться договоры купли-продажи акций	**220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций	**с 15 марта 2010 года до 23 апреля 2010 года с пометкой «Совет директоров. Предложение о покупке акций»**
Даты начала и окончания покупки акций	**с 26 апреля по 31 мая 2010 года**

УНП 100092167

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 10.03.2010 г. (для б/н разлікаў)

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

1 долар ЗША	2 945,00
1 еўра	4 010,80
1 латвійскі лат	5 649,34
1 літоўскі літ	1 159,38
1 чэшская крона	156,16
1 польскі злоты	1 030,93
1 расійскі рубель	98,99
1 украінская грыўня	369,12

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,7499
10 UAH	37,0715
1000 BYR	10,0984
EUR	40,4866

ISSN 1990 - 763X

Поспехі маладой беларускай дзяржавы ў многім дасягнуты дзякуючы жанчынам

Безумоўнымі нацыянальнымі прыярытэтамі і ў далейшым застануцца павышэнне сацыяльнага статусу жанчыны, умацаванне інстытута сям'і, абарона мацярынства і дзяцінства, заявіў 6 сакавіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстым прыёме ў Палацы Рэспублікі ў гонар свята Дня жанчын.

«Трэба сказаць, што ў многіх галінах жыцця нашы суайчыннікі сёння апярэджваюць мужчын, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Яны лідзіруюць па ўзроўні адукаванасці, дачыненні да дасягненняў навукі і культуры, больш уважліва сочаць за сваім здароўем, удзяляюць больш увагі фізічнай культуры і спорту. Сярод пастаянных наведвальнікаў бібліятэк яны таксама складаюць большасць». Аляксандр Лукашэнка назваў адной з тэндэнцый апошняга часу істотнае пашырэнне ўплыву жанчын на прыняцце палітычных, эканамічных і сацыяльных рашэнняў. Прыкметна расце колькасць прадстаўніц прыгожага полу на высокіх дзяржаўных пасадах, у складзе дэпутацкага корпуса і іншых дзяржаўных органаў. «Заслугі і поспехі нашай маладой дзяржавы шмат у чым дасягнуты дзякуючы жанчынам, — упэўнены Прэзідэнт. — Яны працуюць у самых розных сферах і прыкладаюць усю сваю энергію, талент і прафесіяналізм для працвітання роднай Беларусі».

Асаблівыя віншаванні напярэдадні 8 Сакавіка кіраўнік дзяржавы адрасаваў жанчынам-маці. «Спакон веку мацярынства лічыцца вышэйшым, ад Бога дадзеным, прызначэннем жанчыны. Бо маці дае жыццё, выхоўвае, прывівае маленькаму чалавечку паняцці дабра, справядлівасці, клопату аб блізкіх». Аляксандр Лукашэнка з радасцю адзначыў, што ў мінулым годзе ў Беларусі нарадзілася больш за 109 тыс. дзяцей, а гэта на 2 тыс. больш, чым на год раней, і на 6 тыс. больш, чым у 2007 годзе. Гэта значыць, праводзімая ў дзяржаве сацыяльная палітыка мае правільную накіраванасць і канкрэтны вынік.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў у Палацы Рэспублікі 8 ордэнаў і медалёў самым дастойным прадстаўніцам беларускага грамадства. Ордэн Маці атрымалі закройшчыца верхняга адзення ААТ «Элегант» (Гомель) Таццяна Белавусава, дазнавальнік аддзялення дазнання папярэдняга расследавання аддзела ўнутраных спраў Гродзенскага райвыканкама Кацярына Кумко і прадавец Гандлёвага дома «На Нямізе» Іна Макарэвіч.Ордэнам Пашаны ўзнагароджана старшыня суда Аршанскага раёна і горада Оршы Антаніна Карэтнікава. Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены дырэктар гімназіі № 2 Мінска Тамара Вечар, прарэктар БДПУ імя М. Танка Святлана Копцева. Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны артыстка Ада Ялінава і начальнік аддзела культуры Клімавіцкага райвыканкама Вольга Хаўранкова. Прэзідэнт Беларусі пажадаў прадстаўніцам прыгожага полу любві, здароўя, прыгажосці і сямейнага дабрабыту. «Спадзяюся, што ў вашым жыцці будзе яшчэ шмат значных дасягненняў, якія ўвойдуць у слаўны летапіс Беларусі», — сказаў ён.

ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 60-годдзем мастацкага кіраўніка дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Моладзевы тэатр эстрады», народнага артыста Беларусі Васіля РАІНЧЫКА.

«Бліскучым талентам і нястомнай плённай творчасцю Вы ўнеслі значны ўклад у развіццё нацыянальнай музычнай культуры. З Вашым імем звязаны лепшыя старонкі гісторыі легендарнага ансамбля «Верасы», дзякуючы якому беларуская эстрада атрымала міжнародную папулярнасць і прызнанне. Створаныя Вамі цудоўныя, меладычныя вакальныя творы ўпрыгожваюць рэпертуар спевакоў розных пакаленняў і па праве ўваходзяць у залаты фонд айчыннага мастацтва», — гаворыцца ў віншаванні.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ З АХВЯРАМІ ЗЕМЛЕТРАСЕННЯ Ў ТУРЦЫІ

У сувязі з разбуральным землетрасеннем у Турцыі, якое прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяраў, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Турэцкай Рэспублікі Абдулаху Гюлю, родным і блізкім загінулых.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ордэнам «За асабістую мужнасць» пасмяротна ўзнагароджаны палкоўнікі Аляксандр Жураўлевіч і Аляксандр Марфіцкі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, у адпаведнасці з якім ордэнам «За асабістую мужнасць» пасмяротна ўзнагароджаны намеснік камандзіра па лётнай падрыхтоўцы 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання Ваенна-паветраных сілаў і войскаў проціпаветранай абароны Узброеных Сілаў палкоўнік Аляксандр Жураўлевіч і намеснік камандуючага войскамі па авіяцыі Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання Ваенна-паветраных сілаў і войскаў ППА Узброеных Сілаў палкоўнік Аляксандр Марфіцкі. Загінулыя афіцэры ўдастоены гэтых узнагародаў за смелыя і рашучыя дзеянні пры абставінах, звязаных з рызыкай для жыцця, асабістую мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выкананні службовых абавязкаў, высокі прафесіяналізм.

Як паведамлялася, 30 жніўня на авіашоу ў горадзе Радам (Польшча) у час выканання фігуры вышэйшага пілатажу разбіўся беларускі ваенны самалёт Су-27. Абодва члены экіпажа — лётчыкі-снайперы Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч загінулі. Адразу пасля катастрофы прэс-служба Мінабароны Беларусі агучыла папярэднюю версію, згодна з якой прычынай крушэння стала пападанне птушкі ў рухавік. Лётчыкі адвялі самалёт ад населенага пункта не катапультуючыся і цаной свайго жыцця прадухілілі больш цяжкія наступствы.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР ЧАСОПІСА «ПОЛЫМЯ» М. МЯТЛІЦКІ ЎЗНАГАРОДЖАНЫ МЕДАЛЁМ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі, у адпаведнасці з якім 11 чалавек удастоены медаля «За працоўныя заслугі» і 5 чалавек — медаля Францыска Скарыны.

У ліку ўзнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» — электразваршчык ручной зваркі Мінскага вытворчага ўчастка № 1 ЗАТ «Белспецэнерга» Сяргей Пятроўскі, медалём Францыска Скарыны — артыст цырка вышэйшай катэгорыі Беларускага дзяржаўнага цырка Сяргей Бандарчук, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» і рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва» Мікалай Мятліцкі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота БЕЛТА.

Аганес Гааран з кубкам.

ФУТБАЛІСТЫ БАРЫСАЎСКАГА БАТЭ ВЫЙГРАЛІ СУПЕРКУБАК БЕЛАРУСІ

8 сакавіка матчам за Суперкубак Беларусі адкрыўся футбольны сезон. У мінскім футбольным манежы шасціразовыя чэмпіёны Беларусі, футбалісты барыскаўскага БАТЭ сустракаліся з уладальнікам Кубка краіны наваполацкім «Нафтанам». У асноўны час гульні супернікі не змаглі паразіць вароты адзін аднаго — нічыя — 0:0, а ў серыі пасляматчавых пенальці ўдача спадарожнічала барысаўчанам — 3:2.

Тэматычная сустрэча

ШЭФАМ — АД ШКОЛЬНІКАЎ

Аб легендарных аперацыях органаў дзяржбяспекі на тэрыторыі Міншчыны ў Вялікую Айчынную вайну і выніках леташняй аператыўнай дзейнасці расказалі выкладчыкам і навучэнцам падшэфнай Ганцавіцкай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы імя Героя Савецкага Саюза П. Лапаціна афіцэры ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар», кіраўніцтва Барысаўскага гарадскога ўпраўлення і раённага Савета ветэранаў.

Супрацоўнікі ўпраўлення прэзентавалі школе кнігі і фільмы аб дзейнасці камітэта, перадалі падшэфным садавіну і салодкія падарункі. Гаспадары ў сваю чаргу арганізавалі святочны канцэрт і спартыўны турнір. Старшакласнікі перадалі для Залы Гісторыі, Доблесці і Славы ўпраўлення знойдзеную імі падчас пошукавых работ у лясах Барысаўшчыны ваенную маёмасць і прадметы партызанскага побыту часоў Вялікай Айчыннай.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ДАЛЯ ГРЫБАЎСКАЙТЭ ЗАПРАСІЛА АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКУ НА СВЯТКАВАННЕ ДНЯ АДНАЎЛЕННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ЛІТВЫ

Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку перададзена запрашэнне Прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ прыняць удзел 11 сакавіка ў святкаванні 20-годдзя аднаўлення незалежнасці Літвы. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Літвы.

Згоду ўдзельнічаць на ўрачыстасцях з нагоды гэтай даты ўжо далі прэзідэнты Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Фінляндыі, Славеніі. На мерапрыемства таксама прыбудзе часова выконваючы абавязкі прэзідэнта Малдовы старшыня парламента Міхай Гімпу. Грузію прадставіць старшыня парламента Давід Бакрадзэ, Швецыю — кіраўнік рыксдага Пер Вестэрберг.

Вярхоўны Савет Літвы 11 сакавіка 1990 года прыняў рашэнне аб аднаўленні Літоўскай Рэспублікі.

Містар райцэнтра: кухарыць і не толькі

У Дуброўне ўпершыню вырашылі выбраць свайго містара

Як паведамілі «Звяздзе» ў раённым камітэце БРСМ, ідэя арганізаваць першы конкурс «Містар Дуброўна» зарадзілася пасля арганізацыі штогадовага вельмі папулярнага конкурсу па выбары міс. Шоу прыгажосці заўсёды праходзіла пры поўным аншлагу. Улічваючы, што, як і ў іншых рэгіёнах, жанчын сярод патэнцыйных гледачоў больш, няма сумненняў у тым, што шоу з удзелам мужчын пройдзе, як кажуць, на «ўра». Шоу запланавана на 19 сакавіка. Адбудзецца ў раённым Доме культуры. Удзельнікі ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў прэзентуюць сваю «візітную картку», а таксама любімую страву, возьмуць удзел у тэатралізаваным паказе, раскажуць пра сваё хобі...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ІМІГРАНТЫ, ЯКІЯ ПРЫВОЗЯЦЬ КАПІТАЛ У БЕЛАРУСЬ, ВЫЗВАЛЯЮЦЦА АД НЕКАТОРЫХ ПАДАТКАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 143 «Аб асобных пытаннях падаткаабкладання».

Гэтым нарматыўным актам унесены шэраг змяненняў ва ўказы, што рэгулююць падатковую сферу.

Так, базавыя стаўкі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асобаў устаноўлены ў беларускіх рублях замест дзеючых цяпер у еўра, што дасць магчымасць спрасціць разлікі плацельшчыкаў гэтага падатку з бюджэтам.

У мэтах забеспячэння ў 2010 годзе дадатковых паступленняў грашовых сродкаў у мясцовыя бюджэты ўказам прадастаўлена права мясцовым Саветам дэпутатаў павялічваць (змяншаць), але не больш як у два разы, стаўкі зямельнага падатку і падатку на нерухомую маёмасць асобным катэгорыям плацельшчыкаў.

Указам прадугледжана вызваленне на працягу пяці гадоў ад абкладання падаходным падаткам даходаў фізічных асобаў, якія пераехалі ў Беларусь на пастаяннае месца жыхарства, пры ўмове перамяшчэння імі грашовых сродкаў у Беларусь. Да такіх даходаў указам аднесены даходы, атрыманыя ад крыніц за межамі Беларусі ў выглядзе дывідэндаў, працэнтаў, роялці, даходаў па аперацыях з каштоўнымі паперамі, ад рэалізацыі нерухомай маёмасці.

Акрамя таго, указам прадугледжаны шэраг іншых палажэнняў, якія ў тым ліку забяспечваюць прывядзенне тэрміналогіі ўказаў Прэзідэнта Беларусі, што рэгулююць пытанні падаткаабкладання, у адпаведнасць з Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Гэты ўказ уступае ў сілу 1 студзеня 2010 года.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Вялікую Перамогу беларускія гісторыкі будуць абараняць першакрыніцамі і фактамі

Беларускія гісторыкі, архівісты, пісьменнікі і выкладчыкі ВНУ сабраліся на «круглы стол», прысвечаны 65-годдзю Вялікай Перамогі. І, як аказалася, нягледзячы на тое, што яны добра ведаюць адзін аднаго, пагаварыць і паспрачацца ім было пра што. А таксама высветлілася, што за 65 год актыўнай распрацоўкі тэмы Вялікай Айчыннай вайны ўсё роўна там застаецца яшчэ вельмі шмат «белых плям».

— Мы абавязаныя захоўваць памяць пра Вялікую Айчынную вайну, пра гераізм, пра мужнасць, пры тым вялікія ахвяры, якія прыйшлося заплаціць беларускаму і іншым народам СССР за свабоду і нацыянальную незалежнасць, — распачаў пасяджэнне **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, доктар гістарычных навук, прафесар, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі.**

Па яго словах, у Беларусі больш за 8,5 тысячы помнікаў і брацкіх магіл, з якіх 6,5 тысячы — якраз перыяду апошняй вайны. Аднак Аляксандр Каваленя лічыць, што трэба захоўваць і духоўную памяць:

— На сёння ў нас надрукавана звыш 10,5 тысячы публікацый і, тым не менш, з'яўляюцца новыя і новыя старонкі, якія да нядаўняга часу былі невядомыя. Напрыклад, мы мала кажам пра праведнікаў, а наш народ — гэта народ-праведнік, які захаваў шмат жыццяў чырвонаармейцаў, што патрапілі ў палон.

Таксама дырэктар Інстытута гісторыі лічыць, што славянскім народам трэба аб'яднацца для таго, каб супрацьстаяць спробам пасеяць варожасць паміж нашымі народамі. Пры гэтым трэба не апускаць спрэчныя моманты, а наадварот, узнімаць іх, гаварыць пра гэта, але ў рамках навуковага даследавання, а не палітычных дыскусій.

Якраз пра тое, чаму ўзнікла і працягваецца і па сёння ідэалагічнае супрацьстаянне паміж ваеннымі гісторыкамі Захаду і Усходу, расказаў **Уладзімір КУЗЬМЕНКА, доктар гістарычных навук, дацэнт, навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносінаў Інстытута гісторыі НАН:**

— Па заканчэнні Другой сусветнай вайны Савецкі Саюз стаў геапалітычнай сілай, роўнай усім краінам Захаду. Гэта выклікала ў лагеры былых саюзнікаў небяспеку, таму падчас «халоднай вайны» пачаў стварацца малапрывабны вобраз СССР у перыяд вайны, свядома прымяншацца яго ўнёсак у разгром фашызму.

Што датычыцца сённяшняй сітуацыі, то, на думку Уладзіміра Кузьменкі, асноўнымі прычынамі таго, што супрацьстаянне працягваецца, з'яўляюцца палітыка і камерцыйны інтарэс некаторых гісторыкаў, якія хочуць зарабіць на «смажаных» фактах.

— Праблема вольных адносінаў з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны, маніпуляванне ёю, разбурэнне сэнсаў Вялікай Перамогі не павінна ігнаравацца, — працягваў Уладзімір Кузьменка. — Перагляд вынікаў вайны, які нам навязваецца, — гэта, у першую чаргу, пазбаўленне сэнсу вялікіх ахвяр у 1941—1945 гадах.

Пасля таго як яшчэ некалькі гісторыкаў у сваіх выступленнях сказалі пра спробы перагледзець гісторыю, на гэтую тэму выказаўся галоўны **рэдактар часопіса «Беларуская думка», дацэнт Акадэміі кіравання, кандыдат гістарычных навук Вадзім ГІГІН:**

— Тут шмат казалі пра спробы перагледзець гісторыю. Якія спробы? Там, на Захадзе, усё ўжо даўно перагледжана. Гэта ў нас тут ёсць асобныя спробы нешта перапісаць, а на Захадзе наадварот, рэвізіяністамі называюць тых, хто спрабуе паказаць ролю падзей на савецка-нямецкім фронце. Так што там не спробы, а агульная тэндэнцыя...

Вельмі эмацыйным атрымаўся выступ **Барыса ДАЛГАТОВІЧА, кандыдата гістарычных навук, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносінаў Інстытута гісторыі НАН.** Ён лічыць, што айчыннай гістарыяграфіі не хапае канкрэтыкі:

— Трэба рабіць стаўку на першакрыніцы, звяртаць увагу на лічбы, даты, прозвішчы, біяграфіі... На жаль, у нашых публікацыях не стае фактуры.

Дарэчы, **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, кандыдат гістарычных навук, Уладзімір АДАМУШКА** адзначыў, што за пяць апошніх гадоў дзяржаўныя архівы выдалі 23 зборнікі розных дакументаў. На яго думку, пабудова гісторыі на першакрыніцах дазволіць зняць шмат якія пытанні фальсіфікацыі гісторыі Другой сусветнай вайны.

Вядома, выданне зборнікаў дакументаў — справа вельмі важная, але **Уладзімір ГУЛЕНКА, кандыдат гістарычных навук,** выказаў сваё незадавальненне малымі накладамі гэтых выданняў:

— Вось уявіце, што газета выдаецца накладам па колькасці журналістаў. Вы скажаце — нонсэнс, навошта патрэбна такая газета? А вось зборнікі выходзяць мізэрнымі тыражамі. Скажыце, што за апошнія пяць гадоў выйшла тыражом больш за 200 асобнікаў?.. Ёсць канкрэтная прапанова: каб тыраж такіх выданняў быў не ніжэй, чым колькасць школ у краіне, каб Міністэрства адукацыі выкупляла іх, і кожны настаўнік мог азнаёміцца з гэтай літаратурай.

Дарэчы, Уладзімір Гуленка адзначыў, што зараз маладому пакаленню патрэбны доказы, а не эмоцыі:

— Калі я размаўляю са студэнтамі — эмоцыі не праходзяць, яны патрабуюць доказаў, аналізу. Калі ты ім кажаш, што англічане і амерыканцы разам панеслі страт у 3,5 раза меней, чым адна Беларусь — вось гэта студэнты разумеюць і ўспрымаюць.

...«Круглы стол» расцягнуўся амаль на чатыры гадзіны. З чаго, дарэчы, можна зрабіць выснову — інтарэс у гісторыкаў да Вялікай Айчыннай вайны сапраўды ёсць, а вось з выступлення **акадэміка, доктара філалагічных навук, прафесара, галоўнага навуковага супрацоўніка Інстытута мовы і літаратуры НАН Уладзіміра ГНІЛАМЁДАВА** стала зразумела, што такі інтарэс ёсць і ў пісьменнікаў:

— Надзвычай цікава знаходзіцца сярод гісторыкаў і слухаць вас. Вы такі ж эмацыйныя, як і наш брат пісьменнік. Нам, гісторыкам і пісьменнікам, трэба сябраваць, бо мы як бы дапаўняем адзін аднаго.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЦІ БУДЗЕ Ў МЫТНЫМ САЮЗЕ СВАЯ ВАЛЮТА?

Погляд

ВЫСТУПАЮЧЫ на Міжнародным эканамічным форуме дзяржаў — удзельніц СНД у Маскве, першы віцэ-прэм'ер Расіі Ігар Шувалаў заявіў, спаслаўшыся на меркаванні экспертаў, што ўжо пасля 2012 года краіны, якія ўваходзяць у Мытны саюз, могуць перайсці на адзіную валюту. І гэта не будзе валюта якой-небудзь адной краіны, а зусім новыя грошы, як у Еўрапейскім саюзе.

Думка, якую выказаў высокапастаўлены чыноўнік, заслугоўвае ўвагі нават тым, што на прасторы Мытнага саюза стане панаваць не расійскі рубель, а новая валюта — наднацыянальная. Але каб прыйсці да адзінай валюты неабходна, каб паміж краінамі якія ўваходзяць у Мытны саюз, існаваў давер і паразуменне, каб грамадскасць усвядоміла важнасць гэтага кроку.

А спасылкі на Еўрасаюз — гэта імкненне падвесці базу пад задуманае. Маўляў, калі ўдалося там увесці еўра, то чаму б не ўкараніць гэтую ідэю і на прасторы Мытнага саюза? Укараніць можна, але калі гуляць па правілах, вызначаных у Еўрасаюзе. Вось там прымаецца нейкае рашэнне і калі адна маленькая краіна выступіць супраць, то рашэнне не праходзіць. Такія магутныя ў эканамічным плане краіны, як Германія і Францыя, не могуць нічога зрабіць, бо дзейнічае закон «VETO».

На прасторах СНД кожная краіна цягне коўдру на сябе і Мытны саюз, калі быць аб'ектыўным, не зусім раўнапраўным атрымліваецца, хоць на паперы, магчыма, усё выглядала інакш.

Некаторыя расійскія СМІ пішуць, што з павышэннем мытнай пошліны на ўвоз аўтамашын у накладзе акажуцца простыя беларусы, а ў выйгрышы будзе расійскі аўтапрам. І гэта пры тым, што з расійскага боку неаднаразова падкрэслівалася, што беларуская сельгастэхніка і аўтамашыны іх цікавяць пастолькі-паколькі, а падтрымліваць там будуць свае заводы.

У кожнай краіне ёсць стратэгічныя інтарэсы. Напэўна ж, ёсць яны і ў Беларусі? Праўда, у нас усе намаганні сёння канцэнтруюцца на энерганосьбітах. І гэта зразумела — прамысловасць павінна працаваць, а ў кватэрах быць свяло і цяпло. Але чаму мы яшчэ не навучыліся тую энергію берагчы? На якую перспектыву мы працуем?

Наша суседка па Мытным саюзе выбудоўвае планы, якія не стыкуюцца з нашымі — у Расіі свае інтарэсы. Вось газаправод пракладваецца ў абход Беларусі, а атамную станцыю задумана ўзводзіць у Калінінградскай вобласці, на нафту для перапрацоўкі — 100-працэнтная пошліна...

Расійскі капітал наступае і нам гэта неабходна ўсвядоміць.

Бачачы сюрпрызы Мытнага саюза, ужо і нашы міністры занепакоіліся і кажуць, што саюз запрацуе толькі тады, калі будуць выконвацца папярэднія дамоўленасці.

Відавочна, сюрпрызы прынясе і адзіная эканамічная прастора — калі справа да яе дойдзе.

Дык ці прыйдуць краіны Мытнага саюза да адзінай валюты?

Прыйдуць, калі ў гэтым утваранні не будзе краіны-даміната — краіны, якая не стане навязваць партнёрам свае ўмовы. Калі Масква, Мінск і Астана стануць раўнапраўнымі партнёрамі, калі...

А ці магчымы такія адносіны ўвогуле?

Кожны можа адказаць на гэтае пытанне сам.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

МАНЕТА ДА ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

Нацыянальны банк Беларусі ўвёў у абарачэнне памятныя манеты «65 год Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі галоўнага банка краіны Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 33,63 г; медна-нікелевая выпушчана наміналам 1 рубель. Манеты адчаканены на РДП «Казахстанскі манетны двор Нацыянальнага банка Рэспублікі Казахстан»: сярэбраная — якасцю «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк». Тыраж сярэбранай манеты складае 2000 штук, медна-нікелевай — 3000 штук.

Ігар ГРЫШЫН.

МАЛАКО — РАЗАМ, АЭС — АСОБНА?..

Літоўскі бок разлічвае на ўзаемаразуменне і ўзаемадзеянне з Беларуссю па пытаннях будаўніцтва ў Астраўцы

Да суседняй Літвы — літаральна рукой падаць. Пры жаданні можна проста сматацца на дзянёк пагуляць. Вільнюс надта папулярны і ў нашых аматараў шопінгу. Адзінае «але» — наяўнасць асаблівай адзнакі ў пашпарце... Штодзень літоўскае пасольства выдае каля 400 візаў. Прычым амаль палова (а калі быць дакладнымі, 45 адсоткаў) выдадзеных летась — шматразовыя, а каля чвэрці ўсіх візаў, якія выдаюцца (каля 27 адсоткаў), — бясплатныя. Сярод шчасліўчыкаў, чые пашпарты ўпрыгожвае шэнген, а кашалькі пры гэтым не палягчэлі на 60 еўра, — па традыцыі спартсмены, дзеячы культуры і навукі. А саму працэдуру літоўцы пастараліся зрабіць максімальна лёгкай і транспарэнтнай. Запоўніць анкету можна проста па інтэрнэце, як у прынцыпе і запісацца на чаргу. Пасля — пры станоўчым выніку справы — застаецца толькі прыйсці па візу.

— На сёння мы зрабілі ўсё магчымае, каб грамадзянін Беларусі, атрымліваючы шэнгенскую візу, адчуваў сябе годна, — запэўнівае журналістаў **пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас БАГДОНАС**.

І беларусы не ўпускаюць магчымасці пры выпадку завітаць «да суседа» ў госці. Па ініцыятыве літоўскага боку распрацаваныя цікавыя турыстычныя маршруты, якія дазволяць аматарам пазнавальных паездак атрымаць асалоду ад багатай культурнай спадчыны, што яднае абедзве краіны. Дыпламат мяркуе, што вандроўка праз Ліду, Навагрудак, Нясвіж, Мір, Мінска, Крэва можа быць цікавая не толькі літоўскім турыстам, якія наведваюць Беларусь, але і польскім, нямецкім ды скандынаўскім. Пасол згадаў таксама трохтомнае выданне «Вялікая Літва», дзе ёсць звесткі пра культурную спадчыну, што яднае Беларусь і Літву. У красавіку, дарэчы, плануецца яго прэзентацыя ў Нацыянальным мастацкім музеі. Грунвальдскую перамогу дыпламат назваў агульным гонарам, з якім мы павінны выходзіць на Еўропу:

— Ні вы, ні мы паасобку не будзем настолькі цікавыя свету, як маглі б быць разам.

БЕЛАРУСКАЕ МАЛАКО — НА ЕЎРАПЕЙСКІЯ ПРЫЛАЎКІ

Літоўскі бок зацікаўлены ў тым, каб вытворчасць беларускага малака адбывалася на еўрапейскім узроўні — у адпаведнасці з сертыфікатамі і якасцю, якая дазваляла б рэалізоўваць прадукцыю на тамтэйшых рынках. Дыпламат прыгадаў «непаразуменне» паміж Беларуссю і Расіяй па пастаўках малочных прадуктаў і паведаміў, што прадстаўнікі беларускіх і літоўскіх профільных ведамстваў абмяркоўваюць праекты пераабсталявання малочных заводаў нашай краіны на суму каля васьмі мільёнаў еўра. Гэта патэнцыйна адкрывае магчымасць атрымаць сертыфікат Е-4, што ў сваю чаргу робіць магчымым з'яўленне беларускага малака на прылаўках у краінах ЕС.

— У нас шмат магчымасцяў для супрацоўніцтва ў гэтай сферы, — мяркуе пасол. — Мы самі гэта праходзілі, у свой час перавялі савецкую сістэму на еўрапейскую і хочам падзяліцца сваім вопытам як удзельнікі еўрапейскай сеткі — і рэалізацыі, і вытворчасці. Тады вы не будзеце залежныя ад аднаго рынку: захацелі — паднялі цану. Менавіта, як у вас кажуць, шматвектарнасць — эканамічная — была б карысная і вам, і нам.

БОЛЬШ ПЫТАННЯЎ, ЧЫМ АДКАЗАЎ

Разважаючы пра ўплыў Мытнага саюза на двухбаковыя адносіны Літвы і Беларусі, дыпламат падкрэсліў, што рабіць высновы заўчасна, пакуль усё не будзе дакладна вядома:

— На сёння адказаў па Мытным саюзе, я так разумею, не толькі ў нас, але і ў вас няма. Як ён будзе дзейнічаць па канкрэтных таварах...

Кіраўнік дыпмісіі канстатаваў, што атрымлівае шмат запытаў ад літоўскіх бізнэс-колаў, аднак звароты па растлумачэнні на месцы застаюцца без канкрэтных адказаў, апроч «будзем глядзець, як будзе ўлетку». Ён адзначыў, што назірае складаную ўнутраную дыскусію ў самой Беларусі, у прыватнасці, па транспартным пытанні...

— На жаль, пакуль больш пытанняў, чым адказаў па Мытным саюзе, — рэзюмаваў дыпламат.

ХАДЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

Грамадскія слуханні па ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе будучай беларускай АЭС, якія днямі прайшлі ў літоўскай сталіцы, пасол ацэньвае як «не вельмі ўдалыя».

— У нашым грамадстве вельмі шмат пытанняў узнікае... Гэта ваша права — дзе хочаце, там і будуйце, за чые грошы хочаце, за тыя і будуйце. Але ў нас застаецца права на пытанні...

Дыпламат рэзюмаваў:

— Будзем шукаць хады ўзаемаразумення і ўзаемадзеяння. І вельмі спадзяюся, што гэта будзе ўдала.

Ала МАЧАЛАВА.

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ БУДУЦЬ АБАРАНЯЦЦА АД НЕСПРАВЯДЛІВАСЦІ

ЦЭНТР абароны правоў уласнасці, кіраўнікоў і прадпрымальнікаў быў створаны пры Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва для таго, каб прадстаўляць інтарэсы прадпрымальнікаў у судах і іншых дзяржорганах, забяспечваць абарону юрыдычных асобаў ад карупцыйнага ціску і рэйдарскіх захопаў, а таксама каб інфармаваць дзяржаўныя органы аб праблемах малога і сярэдняга бізнэсу.

— Мы стварылі структуру, якая будзе «хуткай дапамогай» для кіраўнікоў прадпрыемстваў, што трапяць у цяжкую сітуацыю, — сказаў на прэс-канферэнцыі **старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір КАРАГІН**, які і стаў дырэктарам новага цэнтра. — Гэта будзе канкрэтны інструмент барацьбы з несправядлівасцю, з карупцыйнымі злачынствамі, рэйдарскімі захопамі, адным словам — гэта будзе ўмацаванне беларускага бізнэсу, законнасці і парадку. Мы правялі кансультацыі з органамі Генеральнай пракуратуры, Міністэрствам юстыцыі, Вышэйшым Гаспадарчым Судом і паўсюль атрымалі разуменне і ўхваленне наконт стварэння гэтага цэнтра.

Відаць, Цэнтру абароны правоў уласнасці, кіраўнікоў і прадпрымальнікаў хопіць працы з самага яго стварэння — на прэс-канферэнцыі прадстаўнікі рэгіянальных прадпрымальніцкіх саюзаў падзяліліся сваімі праблемамі. Прынамсі, былі агучаны незразумелыя з пункту гледжання логікі рашэнні, калі прадпрымальнікаў прымушаюць даплачваць грошы за арэнду або выкупленую нерухомасць з-за таго, што некалькі гадоў таму дзяржаўныя органы пры ацэнцы дапусцілі памылкі.

— Калі ў памылцы вінаватыя дзяржорганы, дзяржаўныя служачыя, то навошта гэтую віну перакладваць на прадпрымальнікаў? Гэта несумленная гульня, — лічыць **юрыст Ларыса ЛІПЕНЬ, дырэктар выдавецтва «Дыкта»**. — Адна рэч, калі быў хабар, былі падроблены дакументы, ну а калі не, то трэба прыцягваць да адказнасці тых асобаў, якія прымалі рашэнні.

Дарэчы, Уладзімір Карагін запэўніў, што цэнтр і ён асабіста ніколі не будзе абараняць злачынцаў — дапамога будзе аказвацца толькі тым, хто пацярпеў ад несправядлівасці. Таксама Уладзімір Мікалаевіч лічыць, што без развіцця прававога поля цяжка казаць і пра прыцягненне інвестыцый у краіну:

— Без развіцця прававога поля інвестар можа патануць у кіслотным асяродку негатыўнага стаўлення да бізнэсу, заблытацца ў розных узгадненнях і залішніх адміністрацыйных працэдурах, частай несправядлівасці, калі дэталёва не разбіраюцца ў лёсе прадпрыемства, яго ўласнасці і кіраўніцтва... Як бы ні заклікалі Прэзідэнт і прэм'ер-міністр інвестараў, калі наша тэрыторыя не будзе тэрыторый закону, калі кіраўнік не будзе прымаць эканамічныя рашэнні без боязі, калі будуць квапіцца на створаную прадпрымальнікам уласнасць, то ніякі інвестар сюды не прыйдзе...

Як падкрэсліла **Яўгенія БАЧУРНАЯ, намеснік дырэктара Цэнтра абароны правоў уласнасці, кіраўнікоў і прадпрымальнікаў**, згодна з заканадаўствам, новы цэнтр можа аказваць паслугі толькі юрыдычным і фізічным асобам, якія з'яўляюцца членамі Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва або рэгіянальных бізнэс-саюзаў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

МАЦІ ПЯЦЯРЫХ ДЗЯЦЕЙ ПРЫГАВАРЫЛІ ДА ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

43-гадовая жыхарка горада Узда абвінавачваецца ў забойстве шостага нованароджанага дзіцяці.

Бездапаможнае малое жанчына адразу ж пасля родаў змясціла ў поліэтыленавы пакет і выкінула ў выграбную яму.

— Жанчына не знаходзілася ва ўмовах псіхатраўматычнай сітуацыі, выкліканай родамі, —паведаміла **старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна КАЛІНІНА**. — Пра гэта сведчыць заключэнне амбулаторнай судова-псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы. Менавіта таму яе дзеянні суд кваліфікаваў як наўмыснае забойства заведама малалетняга, які знаходзіўся ў бездапаможным стане.

Як высветлілася, жанчына ўжо раней рабіла замах на жыццё чацвёртага дзіцяці ў сям'і. Тады яна адкруцілася ўмоўным асуджэннем да трох гадоў пазбаўлення волі.

На гэты раз Мінскі абласны суд прыгаварыў маці-забойцу да 10 гадоў пазбаўлення волі. Прыгавор пакуль у сілу не ўвайшоў. Абвінавачаная мае права абскардзіць яго ў Вярхоўны

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

10 САКАВІКА 2010 г. СЕРАДА № 9 (15612)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Школа юнкараў

АЛІМПІЯДА: марная трата часу ці ПРЫСТУПКА ДА ПОСПЕХУ

(разважанні алімпіядніцы са стажам)

— Дзівачка, што ты сядзіш над гэтымі падручнікамі! Няўжо табе не надакучыла? Цяпер жа канікулы. Пайшлі лепш на дыскатэку! 17 гадоў бывае адзін раз у жыцці.

— Навошта табе гэтыя алімпіяды? Якая ад іх карысць? Столькі часу траціш, лічы, дарэмна! Каб добра здаць экзамены і атрымаць высокі бал за тэсціраванне, трэба рашаць тэсты, займацца з рэпетытарам.

— Наогул, алімпіяды — гэта перажытак, мінулы век. Дыпломы? Што з іх? Да атэстата іх не прыклеіш. Пры паступленні яны нічога не вартыя. Пустая паперка. На камп'ютары цяпер можна не такую намаляваць.

— А я лічу, трэба жыць дзеля свайго задавальнення, браць ад жыцця па максімуме, пакуль малады. Адукацыю ж можна атрымаць платна. Хай бацькі раскашэляцца. На тое яны і бацькі.

Не аднойчы даводзілася чуць такія ці падобныя выказванні ад аднакласнікаў, знаёмых выпускнікоў.

Я алімпіядніца «са стажам». З трэцяга класа ўдзельнічаю ў раённых спаборніцтвах па рускай і беларускай мовах. Маю 12 грамат і дыпломаў розных ступеняў. Апошнія два гады бяру ўдзел у абласной алімпіядзе па беларускай мове. Увесь час лічыла, што ўдзельнічаць у алімпіядах цікава і карысна, перамагаць — ганарова. У гэтым мяне запэўнівалі настаўнікі, якіх я вельмі паважаю, маці. А вось цяпер у душу запала зярнятка сумнення: можа, патраціла час дарэмна? Хацелася б даведацца, што думаюць пра алімпіяды чытачы ЧЗ. А я прапаную свае «за» ў абарону алімпіяды.

1. Ільготы пераможцам алімпіяд замацаваны заканадаўча.

Трэба сказаць, што гэтыя прывілеі вельмі істотныя. Так, пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд па прадмеце, які вызначаны як профільны, прымаюцца ў ВНУ без уступных экзаменаў. Пераможцам абласнога этапа залічваецца пры паступленні па адпаведным прадмеце вышэйшы бал. Уладальнікам дыпломаў II і III ступеняў выстаўляецца ў дакумент аб адукацыі 10 балаў без здачы экзаменаў. Так, я не здавала ў 9-м класе іспыт па беларускай мове. І цяпер, можна сказаць, ужо маю «дзясятку» ў атэстаце. Крыўдна толькі, што некаторыя знаёмыя лічаць яе «халяўнай».

2. Быць пераможцам алімпіяд ганарова.

Не магу згадзіцца з тымі, хто лічыць дыплом пераможцы алімпіяды пустой паперкай. Мець такую «паперку» пачэсна. Напрыклад, у нас на Браслаўшчыне штогод вучні, якія паспяхова выступалі за раён на абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах, алімпіядах, у творчых конкурсах, ушаноўваюцца на ўрачыстым сходзе, узнагароджваюцца каштоўнымі падарункамі. А дванаццаці лепшым прызначаецца стыпендыя старшыні райвыканкама. Па выніках 2008 года я стала адным з такіх стыпендыятаў у намінацыі «Вучобная, даследчая і інтэлектуальная дзейнасць».

3. Перамога на алімпіядзе — перамога на карысць роднай школы.

На мой погляд, той, хто мае добрыя веды і можа паспаборнічаць за гонар роднай школы, але не лічыць гэта патрэбным, паступае эгаістычна. Нельга ўвесь час думаць толькі пра сябе, кожны свой крок і ўчынак ацэньваць з пазіцыі: а што я буду з гэтага мець? Лічу больш правільным адваротны прынцып: «Калі я магу зрабіць штосьці лепш за іншых, я павінен гэта зрабіць, нават без відавочнай карысці для сябе».

4. Лішніх ведаў не бывае.

Параўнанне падрыхтоўкі да тэсціравання і падрыхтоўкі да алімпіяды на карысць апошняй. Працуючы над тэстамі, мы проста «дрэсіруем», вымуштроўваем сябе ў межах школьнай праграмы. Каб вылучыцца на алімпіядзе, акрамя спецыяльных ведаў, трэба мець шырокую эрудыцыю, нестандартнае мысленне, багатую мову. А гэтага дрэсіроўкай не дабіцца. Рыхтуючыся да алімпіяды, я даведалася шмат карыснага не толькі па беларускай мове, але і па культуры, літаратуры, гісторыі, этнаграфіі, краязнаўстве.

5. Алімпіяднік лягчэй адаптуецца да вучобы ў ВНУ.

Агульнаадукацыйная школа, на жаль, не заўсёды вучыць вучыцца. Тое, што сучасны вучань можа карыстацца інтэрнэтам, яшчэ нічога не значыць. «Капіруючы» патрэбную інфармацыю, ён усё адно застаецца пасіўным спажыўцом чужых ведаў. У алімпіядніка ж фарміруецца больш высокі тып мыслення. Параўноўваць, даказваць, абагульняць, сістэматызаваць, рабіць высновы — гэта навыкі самастойнай працы, такія неабходныя будучаму студэнту.

6. Пашыраем кругагляд, развіваем мысленне — развіваем мову.

Гэта асабліва датычыцца алімпіяд па мовах. У былыя часы ў большасці навучальных устаноў вывучаўся вельмі важны прадмет — рыторыка. Цяпер жа ў звычайнай школе ёсць магчымасць (і то не заўсёды) вучыцца майстэрству красамоўства толькі факультатыўна. Падрыхтоўка да алімпіяды, у прыватнасці да вуснага выказвання, дазваляе рабіць гэта сістэматычна, у індывідуальным парадку, атрымліваючы пры гэтым неабходную дапамогу настаўніка.

7. Алімпіяда загартоўвае псіхалагічна.

Памятаю, як хвалявалася, ніяк не магла сабрацца з думкамі, а потым, нібы запраграмаваны робат, чытала, баючыся адарвацца ад паперкі, сваё першае вуснае выказванне на раённай алімпіядзе. А потым неяк неўпрыкмет прыйшло ўменне сканцэнтравацца, прывесці думкі ў парадак, кантраляваць не толькі што гаворыш, але і як гаворыш, каб прадэманстраваць перад кампетэнтным журы свае вартасці.

8. Алімпіяднік — гэта стан душы.

Зразумець, якая бура эмоцый перапаўняе душу алімпіядніка, калі ён заслужыў дыплом і атрымаў пуцёўку на наступны этап, або пранікнуцца пачуццямі горычы і крыўды, калі «не дацягнуў» некалькі дзясятых бала да запаветнай лічбы, можа толькі алімпіяднік. У тыя некалькі дзён, што мы спаборнічалі паміж сабой на абласной алімпіядзе, як ні дзіўна, адчувалася нейкая еднасць, аднадумства. Колькі цікавых людзей, апантаных любоўю да роднай мовы, пашчасціла мне сустрэць! І хоць многія з іх жывуць у іншых раёнах нашай вобласці, я падтрымліваю з імі сувязь і цяпер.

9. Новыя мясціны — новыя ўражанні.

Я нарадзілася і жыву ў невялікай вёсачцы, дзе нават няма сярэдняй школы. Ад нас далёка да сталіцы, да культурных цэнтраў. Безумоўна, Браслаўшчына славіцца сваёй непаўторнай, унікальнай прыродай, багатай гісторыяй. Але заўсёды хацелася пабываць у іншых мясцінах, на свае вочы пабачыць помнікі гісторыі і культуры. І вось, стаўшы ўдзельніцай абласных алімпіяд, я атрымала магчымасць наведаць Полацк, Оршу, дзе нашай увазе былі прапанаваныя надзвычай насычаныя і цікавыя культурныя праграмы.

10. Мной можна ганарыцца.

Нарэшце, маральнае задавальненне і гонар ад усведамлення таго, што ты ў свае 17 гадоў чагосьці варты. Дыплом алімпіядніка — гэта ўзнагарода за тваю працу, за час, ахвяраваны падручнікам, гэта ўзнагарода настаўніку, плён яго працы, гэта падзяка родным, якія перажывалі за цябе, падтрымлівалі добрым словам.

Вы ведаеце, пакуль я пісала гэты артыкул, аналізавала ўсе «за» і «супраць» алімпіяд, адбылося дзіўнае: мае сумненні развеяліся. Цяпер я на ўсе сто працэнтаў упэўнена: алімпіяды — гэта цудоўна і карысна. Паспрабуйце даказаць адваротнае!

Марына КІРЧАНКА, вучаніца 11-га класа Ахрэмаўскай СШ Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.

Наш фармат

ПАДАРЫЛІ КАНЦЭРТ ІНВАЛІДАМ

Аршанскі гарадскі камітэт БРСМ падрыхтаваў канцэртную праграму для ветэранаў вайны, якія знаходзяцца на аздараўленні ў Рэспубліканскім шпіталі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Шпіталь дзейнічае ў вёсцы Юрцава Аршанскага раёна. Актывісты моладзевай арганізацыі таксама ўручылі паважаным ветэранам памятныя сувеніры. А для тых, хто жыве ў глыбінцы, арганізавана «гарачая лінія»: валанцёры па выкліку гатовыя адправіцца на дапамогу па хатняй гаспадарцы.

МОЙ ТАТА — САМЫ ЛЕПШЫ

У Браслаўскім раёне выбіраюць самага лепшага тату. Мужчынам прапанавана, напрыклад, адмовіцца ад шкодных звычак, заняцца хатнімі справамі, якія, часцей за ўсё, выконваюць жанчыны. Пераможцам гарантаваныя прызы. Конкурс праводзіцца сіламі клуба «Маладая сям'я» пры райкаме БРСМ у рамках доўгатэрміновага праекта за здаровы лад жыцця. У ліку іншага праект накіраваны і на прафілактыку злачынстваў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ФАРМАТНЫ НЕФАРМАТ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі — самая шматлікая і шматхарактарная моладзевая арганізацыя краіны. Пачатак 2010 года азнаменаваў не толькі новы віток часу, але і новую вяху ў гісторыі развіцця БРСМ. Менавіта ў гэты перыяд закончыўся працэс рэарганізацыі. Пра тое, як будзе развівацца арганізацыя далей, расказвае Ігар БУЗОЎСКІ, першы сакратар ЦК БРСМ.

— Работа з моладдзю — гэта сур'ёзны груз, які трэба несці годна, якасна, з задавальненнем, а адказнасць за паўмільёна членаў арганізацыі дае мне магчымасць прымаць новыя, крэатыўныя рашэнні. Сучасны моладзевы рух стваралі энтузіясты, якія гарэлі ідэяй, знаходзілі першыя памяшканні, рабілі рамонт, шукалі спонсарскія грошы на арганізацыю клубнай работы пры райкаме. Цяпер жа гэта магутны механізм моладзевай палітыкі краіны, які па-ранейшаму збірае тых, хто неабыякавы да свайго лёсу, лёсу сваёй краіны і рэалізуе сур'ёзныя праекты і сацыяльна важныя праграмы.

Мы плануем памяняць тактыку вылучэння лідараў. Напрыклад, цяпер аднаўляем моладзевую сацыяльную лабараторыю. Вельмі важна адсочваць і своечасова рэагаваць на змяненні ў моладзевай сферы, няхай гэта школьная або заводская. Дайсці да кожнага, не ўпусціць лідара і тых, хто за ім ідзе, — гэта якраз адна з нашых асноўных задач. У найбліжэйшы час сумесна з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце і Міністэрствам адукацыі мы плануем не толькі распрацаваць, але і ўкараніць у практыку праект па пошуку нефармальных лідараў. Несумненна, класныя кіраўнікі, куратары груп могуць запярэчыць: «Мы ўсіх сваіх лідараў ведаем», але гэта ў корані не так. Бо часта на рашэнне, якое прымае клас, уплывае не той, каго выбіраюць старастам, а зусім іншы чалавек.

У наш век, век інфарматызацыі, патрэбен творчы і нестандартны падыход у вырашэнні моладзевых праблем. У 2010-м будуць прыкладзены ўсе намаганні для ўцягнення ў сферу нашага ўплыву перспектыўнай моладзі. Такія выразы, як «сацыяльны маркетынг» або «валанцёрскі менеджмент», павінны быць зразумелымі і выкарыстоўвацца пры арганізацыі дзейнасці актыву саюза моладзі.

— У Беларусі 2010-ы абвешчаны Годам якасці. Што плануецца змяніць у сувязі з гэтым у рабоце арганізацыі? Мяркуеце пазбавіцца ад «балласту» ў выглядзе тых, хто не працуе, а проста лічыцца?

— Безумоўна ж, хочацца ўсю энергію маладых накіраваць у стваральнае рэчышча. У нашай арганізацыі ёсць праекты і праграмы, якія будуць не толькі рэалізаваныя, але і прынясуць карысць краіне. Вельмі хочацца таксама дапамагчы кожнаму юнаку або дзяўчыне самарэалізавацца, знайсці сябе ў грамадска карыснай справе. Пагоні за колькасцю, за сотнямі і тысячамі быць не павінна. Галоўнае — якасць, прычым не толькі ў выбары кандыдатаў на членства ў арганізацыі, але і пры выбары мерапрыемстваў і акцый, праектаў і праграм. А для гэтага трэба пазбавіцца ад састарэлых формаў работы, прааналізаваць, якія праекты больш паспяхова прымаліся і з іх пакінуць некалькі ключавых.

Кірункаў дзейнасці нашых тэрытарыяльных камітэтаў дзясяткі. Але гэта прыводзіць да зніжэння якаснага складніка работы. Неабходна вызначыць 3—4 кірункі і сканцэнтраваць на іх намаганні моладзевага саюза. Ацэньваючы якасць нашай работы, мы бачым, што трэба займацца не толькі буйнымі масавымі мерапрыемствамі, але і надаваць увагу рабоце з мэтавымі групамі моладзі. Значыць, нашы тэрытарыяльныя камітэты павінны пераўтварацца ў арганізатараў і кардынатараў дзейнасці моладзевых ініцыятыў.

Акрамя таго, дынаміка развіцця грамадска-палітычнага жыцця краіны патрабуе павышэння ініцыятывы і эфектыўнасці работы кожнага члена моладзевай арганізацыі. Цяпер галоўнае, каго не хапае нашаму саюзу, — гэта баявога актыву. А для гэтага трэба рабіць націск на індывідуальную работу з кожным членам арганізацыі, у асаблівасці з лідарамі пярвічак.

Фармальныя члены арганізацыі нам не патрэбныя. Але, з іншага боку, трэба прааналізаваць, а чаму гэты чалавек, стаўшы членам арганізацыі, не з'яўляецца ініцыятыўным? А можа ён скрыты лідар? Або ў яго ёсць ідэі, якія ён саромеецца прапанаваць? Да ўсяго трэба падыходзіць уважана і акуратна.

Перыядычна можна пачуць, што ў БРСМ «настойліва прапануюць» уступаць. Калі такія факты ёсць, тэлефануйце ў камітэт, будзем разбірацца. Гэта проста падрыў арганізацыі знутры, нам не патрэбныя «мёртвыя душы»!

Увогуле гэты год, магчыма, стане найважнейшым у дзейнасці нашай арганізацыі. Асаблівую ўвагу мы надаём узроўню падрыхтоўкі нашых кадраў. Плануецца стварыць сапраўдную базу аўтарытэтных лідараў, баявога актыву, банк звестак ініцыятыўнай і творчай моладзі. Вялікую ўвагу звернем на вучобу актывістаў пярвічных арганізацый.

— Важны аспект дзейнасці БРСМ — патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. Што новага ў гэтым кірунку?

— Напэўна, самае галоўнае падчас работы з юнымі грамадзянамі — заўсёды быць шчырымі, праводзіць мерапрыемствы не «для галачкі». Для гэтага мы выкарыстоўваем новыя формы работы, шукаем і апрабоўваем новыя праекты.

У гэтым напрамку праводзіцца сумесная работа з міністэрствамі абароны і ўнутраных спраў па развіцці моладзевых атрадаў аховы правапарадку (МААП). Мы нават не думалі, што гэты праект будзе такім цікавым для моладзі. Развіваецца цэлы рух дружыннікаў: у іх распрацоўваецца свая форма, яны ходзяць у трэнажорныя залы, сустракаюцца з людзьмі, якія прафесійна займаюцца аховай правапарадку, абаронай Радзімы. У нас нават ёсць своеасаблівая рэкамендацыя БРСМ для тых, хто хоча патрапіць у элітныя вайсковыя падраздзяленні.

Дарэчы, гэты рух таксама дапамагае знаходзіць у моладзевай сферы нефармальных лідараў, сістэмна рыхтаваць іх да дзейнасці, якая дапаможа раскрыць патэнцыял, паслужыць умацаванню аўтарытэту арганізацыі сярод моладзі. Удзельнікі гэтых атрадаў вядуць работу па прафілактыцы правапарушэнняў, асацыяльных паводзінаў, прапагандзе здаровага ладу жыцця, сумесна з супрацоўнікамі ДАІ праводзяць рэйды, выяўляюць парушальнікаў правілаў дарожнага руху, актыўна распаўсюджваюць сярод насельніцтва святлоадбівальныя элементы. Такая работа фарміруе моду і на здароўе, і на службу ў арміі.

— Перад БРСМ пастаўлена задача выйсці да 2015 года на самафінансаванне. Ці магчыма гэта для грамадскай арганізацыі?

— Калі задача стаіць, значыць, трэба яе вырашаць. Пры гэтым баяцца або панікаваць, я думаю, не варта, бо поўнае самафінансаванне — гэта ідэя, якая можа існаваць у самых разных плоскасцях. Мы плануем атрымліваць фінансаванне праз граны і пад рэалізацыю канкрэтных праектаў, прычым як унутры краіны, так і за мяжой. Акрамя таго, распрацоўваем праекты камерцыйнай накіраванасці. Хацелася б выглядаць больш паважна, а для гэтага патрэбен важкі іміджавы фактар у выглядзе фінансавай самадастатковасці.

Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.

МАРА — ЯШЧЭ НЕ ПРАФЕСІЯ

Пабытавыя праблемы, адзінота, цяжкасці з замацаваннем на працоўным месцы плюс традыцыйна вострае «жыллёвае пытанне» — не сакрэт, што з усім гэтым даводзіцца сутыкацца большасці выпускнікоў дзіцячых дамоў-інтэрнатаў. Прычым знайсці самастойнае выйсце тут атрымліваецца далёка не заўсёды. Так, паводле слоў намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Каралёвай, літаральна штогод па дапамогу ў тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва звяртаюцца тысячы ўжо дарослых сірот.

ВУЧЫЦЦА ГАТАВАЦЬ СНЯДАНКІ

Той факт, што абсалютная большасць дзяцей трапляе ў інтэрнаты пры жывых бацьках, вядомы даўно, узровень так званага сацыяльнага сіроцтва ў асобных рэгіёнах дасягае 90 працэнтаў. Праўда, апошнім часам тут усё ж адбываюцца пэўныя змены. Колькасць выхаванцаў інтэрнатаў працягвае скарачацца, прычым не толькі дзякуючы дзіцячым дамам сямейнага тыпу. Не меншую ролю адыгрываюць «жорсткія меры» — неабходнасць аплачваць выдаткі на дзяржаўнае ўтрыманне дзяцей. Як вынік, становяцца ўсё больш рэдкімі адмовы ад немаўлят адразу пасля нараджэння, скарачаюцца выпадкі пазбаўлення бацькоўскіх правоў. І адначасова ўзрастае паказчык вяртання дзяцей у родныя сем'і. Не так даўно гэтая з'ява лічылася амаль унікальнай, аднак ужо ў 2007 годзе было адзначана 324, а летась — 515 падобных прыкладаў.

Не менш цікавая статыстыка: за апошнія пяць гадоў колькасць дзяцей, што пражываюць у інтэрнатах, зменшылася ці не напалову, у Беларусі «за непатрэбнасцю» зачынілася 14 падобных устаноў... І разам з тым, казаць, што праблема знікае, не выпадае таксама. У інтэрнатах застаецца пражываць амаль 9 тысяч няпоўнагадовых грамадзян нашай краіны, прычым кожны год у цалкам самастойнае жыццё адсюль выходзіць прыкладна паўтары тысячы чалавек.

— Апошнім часам падрыхтоўцы да дарослага жыцця надаецца ўсё больш увагі ўжо непасрэдна ў інтэрнацкіх установах, такая падрыхтоўка становіцца індывідуальнай, умовы набліжаюцца да сямейных, — адзначае галоўны інспектар упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Алена Галаўнёва. — Юнакоў і дзяўчат вучаць гатаваць ежу, знаёмяць з бытавой тэхнікай, дзейнасцю розных устаноў, ад банка да жыллёва-камунальных службаў, апроч таго, маладыя людзі маюць магчымасць засвоіць некаторыя прафесіі — сталяра, цырульніка, швачкі. А некаторыя ўстановы адчыняюць у сябе аддзяленні адаптацыі, дзе можна атрымаць неабходныя кансультацыі, напрыклад, па планаванні свайго бюджэту або па доглядзе за дзецьмі.

Не менш важны момант — зместкі аб правах і гарантыях. Выпускнікі інтэрнатаў маюць права на замацаванне за ранейшымі жылымі памяшканнямі ці на сацыяльнае жыллё, тут прадугледжваюцца перавагі пры паступленні ў навучальныя ўстановы, дзяржаўную падтрымку падчас навучання, варыянты ўладкавання за кошт спецыяльнай броні працоўных месцаў.

— Словам, пэўныя магчымасці ў кожнага ёсць, галоўнае — гэтымі магчымасцямі скарыстацца, — заўважае Алена Галаўнёва. — Але бянтэжыць адно: далёка не ўсе выпускнікі дзіцячых дамоў-інтэрнатаў жадаюць вырашаць свае праблемы самі.

ХТО ГЭТА ЗРОБІЦЬ?

Эксперыментальнае сацыялагічнае даследаванне, што было праведзена сярод выхаванцаў і былых выхаванцаў дзіцячых інтэрнатных устаноў у шэрагу рэгіёнаў Беларусі, аказалася даволі паказальным. Так, высветлілася: большасць юнакоў і дзяўчат сапраўды ведаюць, як сябе даглядаць, знаёмыя з прафесіямі, арыентуюцца ў правах і гарантыях (ці не адзіным «прагалам» тут можна назваць тэарэтычныя цяжкасці са складаннем уласнага бюджэту). Аднак сітуацыя атрымліваецца неадназначнай.

Толькі каля 13 працэнтаў рэспандэнтаў робяць галоўную стаўку на матэрыяльную незалежнасць і гатовыя прыкладаць для яе дасягнення ўсе намаганні, тады як пераважная большасць пакідае працу нібыта на другім плане і спадзяецца, што матэрыяльныя пытанні дапаможа вырашыць «хтосьці». Нягледзячы на жаданне мець высокааплатную работу, яшчэ за 3-4 месяцы да выхаду ў самастойнае жыццё 22,5 працэнта апытаных так і не вызначыліся, кім яны хочуць стаць. Аналагічная сітуацыя і з адукацыяй — прыкладна кожны пяты выпускнік інтэрната не лічыць навучанне патрэбным.

Асобная гаворка пра сям'ю. З улікам уласнага горкага вопыту, абсалютная большасць хоча стварыць сям'ю, адначасова 68 працэнтаў выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў нібыта імкнуцца стаць добрымі бацькамі. Аднак зноў-такі: мэты не пацвярджаюцца дакладным планам дзеянняў. Больш таго, уяўленні пра будучых мужа або жонку аказваюцца вельмі цьмянымі. Высветлілася, што многія не надаюць увагі ні знешнасці, ні матэрыяльнай забяспечанасці абраннікаў, больш за тое: 42 працэнты рэспандэнтаў заўважылі, што не супраць, каб будучая «другая палавіна» курыла, а 25 працэнтаў гатовая заплюшчыць вочы на ўжыванне алкаголю.

Такім чынам, «багаж» да 23-гадовага ўзросту становіцца адпаведным. 40 працэнтаў выхаванак і 25 працэнтаў выхаванцаў інтэрнатаў па-ранейшаму застаюцца толькі са школьнай адукацыяй, пры гэтым 15 працэнтаў маладых жанчын і 27 працэнтаў мужчын увогуле нідзе не працуюць і не вучацца. Што да сямейных стасункаў, то даследаванне паказала: да 23-гадовага ўзросту ўзялі шлюб 31 працэнт юнакоў і палова дзяўчат. Аднак пры гэтым ці не кожная трэцяя былая выхаванка інтэрната з'яўляецца... адзінокай маці.

— У гэтым узросце кожны задумваецца аб перспектывах і разумее розніцу паміж рэаліямі і ўласнымі марамі, — кажа выкладчык кафедры сацыяльнай работы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Алена Алтынцава. — А адсюль узнікаюць нервовыя зрывы, што цягнуць за сабой разрывы адносінаў, звальненні з працы, зайздрасць да аднагодкаў са спрыяльных сем'яў, злачынствы. Але ці не самае сумнае: 46 працэнтаў былых выпускнікоў глядзяць на свае жыццёвыя перспектывы з песімізмам.

«МЕТРЫ» ЁСЦЬ. А ЖЫЦЬ МАГЧЫМА НЕ ЗАЎСЁДЫ

Зрэшты, праблемы з законам усё ж варта разглядаць як выключэнне. А вось цяжкасці з працай — сапраўды як сумную практыку. Паводле слоў начальніка ўпраўлення адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама Веры Карэлавай, сёння толькі ў гэтым рэгіёне 34 выпускнікі дзіцячых дамоў-інтэрнатаў прынцыпова не жадаюць мець сталы занятак, прычым з іх 29 чалавек уладкоўваліся, але затым неаднаразова звальняліся. Некаторыя за непрацяглы тэрмін паспелі напісаць заявы нават па пяць і больш разоў.

Не менш востры праблемай застаецца матэрыяльная падтрымка. Пасля выхаду з дома-інтэрната трэба купіць «усё і адразу», а грошай катастрафічна не стае. Пры гэтым выпускнікі інтэрнатаў звяртаюцца па тую ж адрасную дапамогу далёка не заўсёды.

І ўсё ж найбольш балючым пунктам застаецца жыллё. Прыкладна за 60-цю працэнтамі выпускнікоў у вобласці нібыта замацаваныя памяшканні, але вярнуцца ў іх магчыма не заўсёды, бо дамы ці кватэры знаходзяцца ў нездавальняючым стане — шмат гадоў гаспадарамі тут заставаліся бацькі, якія вялі асацыяльны лад жыцця. Адсюль і цяжкавырашальная праблема з пошукам грошай на рамонт, і рызыка... апынуцца ў «сумніўнай» сваяцкай кампаніі.

Што да выпускнікоў, якія замацаванага жылля не маюць, то тут сітуацыя не менш простая — тэмпы будаўніцтва сацыяльных кватэр пакідаюць жадаць лепшага. Тым часам узнікае пытанне наконт таго, чаму былыя выхаванцы інтэрнатаў засталіся без «квадратных метраў»? Бо выпадкі, калі падчас знаходжання дзіцяці ў дзяржаўнай установе бацькі прадаюць кватэры ці дамы, таксама ёсць.

Зразумела, што ў рэшце рэшт жыллёвая праблема вырашальная. Аднак у многіх выпадках далёка не адразу. Між тым, лічаць спецыялісты, больш хуткія варыянты існуюць. У прыватнасці, гаворка пра стварэнне спецыяльных інтэрнатаў для самастойнага пражывання або спецыяльных сацыяльных гасцініц. Прычым «вынаходзіць веласіпед» тут нам не давядзецца — падобны вопыт ужо ёсць у суседняй Расіі.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск — Салігорск.

ЗАМЕСТ ДЗЕЛАВОГА СТЫЛЮ АДЗЕННЯ — ШКОЛЬНАЯ ФОРМА?

«Ідэю вяртання да адзінай школьнай формы Міністэрства адукацыі не падтрымае, паколькі такі кардынальны крок можа справакаваць сацыяльны выбух у грамадстве», — пра гэта заявіў на першым у гэтым годзе пасяджэнні Каардынацыйнага савета па пытаннях увядзення адзення дзелавога стылю намеснік міністра адукацыі нашай краіны і старшыня Каардынацыйнага савета Казімір ФАРЫНО.

Трэба патлумачыць, што ў вяртанні ў школу школьнай формы зацікаўленыя ў першую чаргу зусім не педагогі і не бацькі, а вытворцы і гандаль. Згодна з праведзенымі падлікамі, вяртанне школьнай формы дазволіла б павялічыць аб'ёмы продажу адзення для школьнікаў больш чым у пяць разоў. Для прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці вяртанне да школьнай формы азначала б загрузку магутнасцяў, гарантаваную рэалізацыю прадукцыі і адсутнасць канкурэнцыі з боку рэчавых рынкаў, куды, не сакрэт, нярэдка накіроўваюцца ў пошуках адзення беларускія сем'і. З аднаго боку, кіраўніцтва канцэрна «Беллегпрам» можна зразумець: рыхтаваць штогод да навучальнага года больш чым паўтары сотні новых мадэляў — звышскладаная задача, прычым мадэльерам трэба дагадзіць адначасова густам і малодшых школьнікаў, і прыдзірлівых падлеткаў, якія імкнуцца да індывідуальнасці, і ўлісацца пры гэтым у рамкі паняцця «дзелавы стыль». А вось адда ча не заўсёды апраўдвае ўкладзеныя намаганні. Штогод на складах ці ў прадпрыемствах гандлю застаюцца рэшткі калекцый. Пакупнікі крытыкуюць змрочныя колеры і занадта колкія тканіны, нездавальняючыя эксплуатацыйныя характарыстыкі адзення і захапленне нашых швейнікаў «сінтэтыкай». Праўда, летась такіх крытычных водгукаў гучала значна менш. Тым не менш, вяртанне да ўніфікаванага адзення — вельмі прывабная перспектыва для вытворцаў: апрануць 960 тысяч беларускіх школьнікаў — больш чым салідны заказ.

— Мы можам падтрымаць ідэю звужэння мадэльнага рада адзення дзелавога стылю для школьнікаў, але толькі не школьную форму, — дадаў Казімір Фарыно. — Нават уводзячы ў школе дзелавы стыль адзення, мы дзейнічалі паэтапна — пачыналі рэалізоўваць новую палітыку з пачатковай школы. Была праведзена каласальная работа і з вытворцамі, і з педагогамі, і з бацькамі. Для папулярызацыі дзелавога стылю і выхавання густу ў падрастаючага пакалення ва ўсіх рэгіёнах ладзіліся дэманстрацыі калекцый прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам», праводзіліся агульнашкольныя канферэнцыі і інтэрнэт-заняткі «Дзелавы стыль адзення беларускага школьніка». Адным словам, мы дзейнічалі не метадам прымусу, які б даў адваротны эфект, а метадам пераканання. У наступным годзе ў школах з'явіцца новы факультатыў «Кароткі курс сучаснага этыкету для вучняў 8—11-х класаў», дзе шмат увагі будзе надавацца знешняму выгляду навучэнцаў. Школьнікам будуць расказваць пра вельмі цікавыя рэчы: пра стыль у адзенні, манеру весці размову, правілы паводзінаў і іншыя рэчы, без якіх немагчыма падтрымліваць рэпутацыю дзелавога чалавека.

На думку Казіміра Фарыно, ёсць сэнс пачаць звужаць мадэльны рад зноў-такі з малодшага школьнага ўзросту. Спачатку трэба вывучыць попыт і ўжо на падставе атрыманай інфармацыі запускаць самыя папулярныя мадэлі ў вытворчасць. Фатаграфіі мадэляў можна размясціць на сайце Міністэрства адукацыі, Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, канцэрна «Беллегпрам», Міністэрства гандлю, і няхай бацькі і школьнікі галасуюць, выказваюць свае меркаванні. «У пераліку мадэляў для школьнікаў павінны застацца толькі лепшыя ўзоры, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — З хлопчыкамі нам будзе прасцей, а вось з дзяўчынкамі, прадбачу, будуць праблемы...»

Дарэчы, не падтрымалі ідэю вяртання да школьнай формы адзінага ўзору і іншыя члены Каардынацыйнага савета: ні Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама, ні сталічны гандаль, ні медыкі. У сталіцы рэалізуецца пятая частка ад агульных аб'ёмаў адзення, што шыецца для школьнікаў, і калі, скажам, у Доме гандлю «На Нямізе» павесіць на вешалцы тры-чатыры мадэлі хлапчуковых касцюмаў, то на прадаўцоў тут жа абрынецца хваля абурэння з боку пакупнікоў. У гэтым ніхто не сумняваецца.

— Мне не аднойчы даводзілася тлумачыць бацькам, чаму іх дзецям нельга хадзіць у школу ў джынсах, — паведаміла **начальнік упраўлення адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Зоя ХАХЛОВА**. — А імкненне пераапрануць іх у форму падлеткі і ўвогуле могуць успрыняць як замах на сваю асобу. У любым выпадку выхаваўчую работу трэба пачынаць не са школьнікаў, а з іх бацькоў, а тыя — супраць школьнай формы. І нам трэба гэта ўлічваць.

— На маю думку, ні ў якім разе нельга вяртацца да адзінай школьнай формы, — агучыла пазіцыю медыкаў **урач-гігіеніст аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена ХМАРА**. — Увядзенне дзелавога стылю адзення ў школе стымулявала і вытворцаў, і гандаль. Нашы швейнікі навучыліся шыць разнастайнае і вельмі якаснае адзенне, здольнае задаволіць нават самага прыдзірлівага пакупніка. Айчынныя тканіны значна палепшыліся. Адзіная заўвага з боку медыкаў — мы назіраем пэўнае захапленне выпускам святочнага адзення. У мадэлях, якія трапляюць у катэгорыю «святочнае адзенне», дапускаецца стопрацэнтнае ўтрыманне сінтэтычных валокнаў, такое адзенне не адпавядае нормам па паветрапранікальнасці і гіграскапічнасці і не падыходзіць для пастаяннага нашэння, хоць і выглядае вельмі прывабна. У асобных рэгіёнах доля «святочнага адзення» вагалася ў агульным асартыменце ад 20 да 60 працэнтаў. Гэта зашмат.

Ёсць сур'ёзныя прэтэнзіі і да беларускага абутку. Усім вядома, што бацькам сёння даводзіцца набываць для дзяцей дарагі імпартны абутак, таму што яны разумеюць, што якасны абутак — гэта прафілактыка і плоскаступнёвасці, і праблем з фарміраваннем постаці, і многіх іншых праблем. А на здароўі дзяцей не зэканоміш, тым больш што беларускі абутак танным таксама не назавеш, а насіць яго без слёз немагчыма. Ёсць пытанні па заплечніках для школьнікаў і спартыўным адзенні. У нашай краіне для малодшых школьнікаў шыюцца аблегчаныя заплечнікі, чаго не робяць, напрыклад, у Расіі — там вага ранца аднолькавая і для пяцікласніка, і для выпускніка. І беларускія медыкі небеспадстаўна ганарацца такім дасягненнем (абмежаванне па вазе было ўведзена па іх прапанове), асабліва калі ўлічыць, колькі падручнікаў і іншых школьных прыналежнасцяў будзе пакладзена ў той заплечнік. Аднак фурнітура і знешні выгляд ранцаў далёкія ад ідэала. «А беларускія школьнікі вартыя самых якасных і лепшых тавараў», — упэўнены Казімір Фарыно.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СЁННЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРА РАЗМЕРКАВАННЕ

Спрэчкі наконт размеркавання выпускнікоў ВНУ і ССНУ ідуць не першы год. Нехта сцвярджае, што гэта абсалютна непатрэбна, хтосьці лічыць размеркаванне неабходным. Аднак пакуль ідуць дыскусіі, пакрысе настае чарговая вясна. І выпускнікі-бюджэтнікі зноў пачынаюць нервавацца. Якім чынам пазбегнуць непажаданых сюрпрызаў пра размеркаванні, расказаў на семінары ў БДУ намеснік старшыні Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Непажаданыя сюрпрызы на размеркаванні — гэта калі вы хацелі ехаць на сваю малую радзіму, а вас размяркоўваюць у іншую вёску, калі пасля заканчэння магістратуры вам трэба не толькі адпрацаваць два гады, а яшчэ і заплаціць грошы за ўніверсітэцкую адукацыю... Якія сітуацыі могуць узнікнуць і як іх вырашыць, чытайце ніжэй.

Хочаш застацца ў сталіцы, а дэкан адпраўляе ў Хойнікі...

У студэнцкім асяроддзі ходзіць анекдот пра злоснага дэкана, які на размеркаванні наўздагад тыкае пальцам у карту Беларусі. Смех смехам, аднак у студэнцкім жыцці бываюць розныя канфліктныя сітуацыі. Бывае, аргументуеш свой выбар шэрагам прычын, а камісія не ўспрымае твае аргументы. Маўляў, нічога не ведаем, паедзеш і будзеш працаваць.

— Мы раім у такім выпадку напісаць пісьмовую заяву ў камісію па размеркаванні, назваць свае прычыны і пажаданні, — раіць Раман Дапіра. — Як паставіцца да гэтага камісія, ужо іншае пытанне. Аднак пісьмовы зварот — гарант таго, што ваша меркаванне будзе ўлічана. Падчас працэдуры размеркавання вы зможаце паказаць на факт звароту. Не забудзьце зарэгістраваць свой ліст у канцылярыі. А копію абавязкова захавайце ў сябе.

Для размеркавання ў Мінск рэгістрацыя не важная

Як засведчыў Раман Дапіра, пры размеркаванні ў Мінск адсутнасць рэгістрацыі ў сталіцы не з'яўляецца падставай для адмовы.

— Аднак ёсць тайнае пажаданне размяркоўваць у Мінск пераважна карэнных мінчан, — тлумачыць спадар Дапіра, — Мінск не гумавы. Цяпер вызначана, так скажам, колькасныя межы горада: 2 мільёны насельніцтва — больш за гэта сталіца не вытрымае.

Каму працаваць у кампаніі «Арыфлэйм»?

Якая верагоднасць размеркавацца ў прыватную кампанію? Першапачаткова факультэты задавольваюць заяўкі дзяржаўных арганізацый, але можа быць варыянт, калі заявак будзе менш, прыватную арганізацыю вы таксама будзеце мець статус маладога спецыяліста з усімі льготамі.

Заяўку можна прынесці і ў дзень размеркавання

Апошні тэрмін падачы заяў ад прадпрыемстваў і ўстаноў — не пазней за два месяцы да размеркавання.

— Але нават калі вы прыйдзеце непасрэдна ў сам дзень размеркавання з нейкай заяўкай, то камісія можа пайсці на ўступкі. Таму што не заўжды за месяц-два заяўку можна знайсці, — кажа спадар Дапіра. — І калі вы на папярэднім размеркаванні ні да чаго не прыйшлі, ідзіце шукаць сабе іншае месца размеркавання.

Прычым, нават калі вы на папярэднім размеркаванні пагадзіліся на нешта, то да выдачы накіравання спакойна можаце мяняць сваё рашэнне. Гэта вас ні да чаго не абавязвае.

Размеркавалі, а на працу браць не хочуць

На сёння заканадаўства дазваляе адмовіць у прыёме на працу маладому спецыялісту. З якой прычыны, яно не паведамляе.

— Наймальніку не хочацца мець «ката ў мяшку», — апавядае Раман Дапіра. — Я думаю, сістэма размеркавання ў нас будзе трансфармавана наступным чынам: наймальнік будзе спачатку «выпрабоўваць» выпускніка; г. зн. афармляць па тэрміновай дамове і толькі пасля браць на размеркаванне. Аднак у адмове ўзяць на працу маладога спецыяліста ёсць і суб'ектыўны фактар. Бывае так, што выпускнік проста не спадабаўся наймальніку. І апошні кажа, маўляў, няма месцаў для вас. А праверыць, праўда гэта ці не, магчымасці няма. І досыць цяжка разабрацца, чаму месца спачатку было ў заяўцы, а затым кудысьці дзелася. Асабліва гэта складана высветліць у арганізацыях, дзе штатны расклад пастаянна змяняецца, напрыклад, на вытворчасці.

Першае, што трэба зрабіць у выпадку адмовы, — папрасіць пісьмовае паведамленне ад наймальніка з называннем прычыны, чаму вас не прынялі на працу. З гэтай паперай вы прыходзіце ў ВНУ ў камісію па размеркаванні. Калі заявак на вас не будзе, то вам выдадуць даведку аб свабодным працаўладкаванні (так званы «свабодны дыплом»).

Неабходна пачытаць:

- *Закон Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі» ў рэдакцыі ад 07.05.2007 г.*
- *Закон Рэспублікі Беларусь «Аб вышэйшай адукацыі» ад 11.07.2007 г.*
- *Палажэнне аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.12.2007 г.*
- *Палажэнне аб кампенсацыі сродкаў у рэспубліканскі і (ці) мясцовыя бюджэты, выдаткаваных дзяржавай на падрыхтоўку працоўнага (службоўца), спецыяліста ў рэдакцыі ад 24.12.2007 г.*

Заўжды можна пераразмеркавацца

Да таго моманту, пакуль вы не атрымалі на рукі паперкі, вы маеце права на змену свайго выбару. Гэта не будзе пераразмеркаваннем.

Пераразмеркавацца можна, калі вам па нейкіх прычынах адмовілі ў працы. Напрыклад, калі вам не даюць поўную працоўную стаўку, вы ажаніліся ці выйшлі замуж пасля размеркавання і хочаце пераехаць да мужа ці жонкі, або захацелі перайсці на іншае месца працы і ваш працадаўца не супраць і г.д.

Вы пішаце заяву ў камісію па размеркаванні з просьбай аб пераразмеркаванні. І калі на вас не будзе заявак, можаце атрымаць даведку аб свабодным працаўладкаванні («свабодны дыплом»).

Працягваць адукацыю без адпрацоўкі і грашовых выплат

У Законе «Аб вышэйшай адукацыі» ёсць паняцце «больш высокая ступень адукацыі». У дачыненні да прафтэхадукацыі гэта сярэднеспецыяльная, у дачыненні да сярэднеспецыяльнай — вышэйшая адукацыя, а ў дачыненні да апошняй — магістратура. І вас не размяркуюць і не прымусяць выплачваць грошы за навучанне, калі вы адразу ў год выпуску паступаеце атрымоўваць адукацыю больш высокай ступені.

— Лепш за ўсё паступаць у магістратуру ў год выпуску з універсітэта. Паступаеце, напрыклад, на платную форму — вас не размяркоўваюць і не выплачваеце грошы, затрачаныя на навучанне ў ВНУ, — раіць Раман Дапіра. — Важна толькі пасля заканчэння магістратуры напісаць заяву з просьбай аб вызваленні вас ад грашовых выплат.

На сёння вы можаце паступаць у любую магістратуру, важна толькі здаць экзамены. Прычым нават пасля навучання ў замежнай магістратуры можна таксама падаваць заяву аб вызваленні вас ад грашовых выплат за навучанне. Для гэтага трэба мець перакладзеныя на беларускую ці рускую мовы дакументы, што пацвярджаюць сапраўднасць магістратуры і дакументы аб яе заканчэнні. Але ў вас застаецца права адпрацаваць па тым накіраванні, якое вам выдалі. І ў прынцыпе, наймальнік можа, але не абавязаны, прыняць вас на працу.

Калі ж вы навучаліся на бюджэтнай магістратуры, заяву аб вызваленні вам таксама неабходна напісаць.

— Часам вам прасцей вярнуць грошы за навучанне ў магістратуры, чым працаваць па размеркаванні пасля яе, — кажа Раман Дапіра.

Бюджэтнік заплаціць больш грошай, чым платнік

Калі вы ўсё ж адмаўляецеся ад размеркавання, будзьце гатовыя да таго, што вам давядзецца выплаціць усю суму за навучанне на бюджэце. І не здзіўляйцеся, што яна будзе большай за тую, якую заплацілі вашы сябры-платнікі. У суму выплат уключаецца не толькі кошт адукацыі, але і стыпендыя, якую вы атрымоўвалі, а таксама розныя дапамогі за кошт бюджэту.

Магчымы варыянт, што адпрацавалі некаторы час, а пасля кінулі, тады разлік выплат будзе прапарцыйны неадпрацаванаму часу па размеркаванні.

Настасся ЗАНЬКО.

ПАСАДЗІ ЛЕС

Сёлетняя эстафета «Тыдзень лесу-2010», якая па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі будзе ладзіцца ўжо ў чацвёрты раз, пройдзе ў краіне з 10 па 24 красавіка. Па традыцыі гэтая акцыя пачнецца з паўднёвых рэгіёнаў — Брэсцкай і Гомельскай абласцей, потым яе падхопяць Мінская, Магілёўская і Гродзенская вобласці, а завершыць эстафету паўночны рэгіён — Віцебшчына.

Летась акцыя сабрала каля 60 тысяч удзельнікаў. Самы актыўны ўдзел у ёй брала моладзь. З дапамогай добраахвотных памочнікаў новыя лясы былі створаны на плошчы больш за 10 тысяч гектараў. Было ўладкавана некалькі соцень месцаў адпачынку на землях лясніцтва фонду і ўздоўж аўтамабільных дарог, ліквідавана больш за дзве тысячы несанкцыянаваных звалак смецця ў лясах.

Цяпер арганізацыі лясной гаспадаркі рыхтуюцца прыняць удзельнікаў сёлетняй акцыі: свае рукі яны змогуць прыласці прыкладна на дзвюх тысячах аб'ектаў ва ўсіх рэгіёнах краіны. Поўны пералік іх будзе размешчаны на сайце Міністэрства лясной гаспадаркі пасля 17 сакавіка.

З таго ж дня і пачнецца афіцыйная рэгістрацыя ўдзельнікаў акцыі «Тыдзень лесу-2010»: ахвотных пакінуць новыя лясы нашчадкам у спадчыну.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СТУДЭНТУ МЯСА ЗАХАЦЕЛАСЯ?

У Віцебскую аблінспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету паведамілі пра незаконную здабычу ў паляўнічых угоддзях Гарадоцкай ваеннай паляўнічай гаспадаркі дзіка.

Быў затрыманы студэнт трэцяга курса Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Канфіскаваны паляўнічая стрэльба і мяса дзічыны. Разглядаецца пытанне аб завядзенні крымінальнай справы. Такая вось магчымая расплата за спробу зрабіць студэнцкі стол больш разнастайным.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Люстэрка

БЕЛАРУСКАЯ ПРЫНЦЭСА ДЛЯ ТУРЭЦКАГА ЖАНІХА

Жыццё — складаная і разам з тым даволі цікавая рэч. Цяжкі наш шлях у гэты свет і такі ж складаны, калі нарэшце душа вырашае пакінуць цела. Дзеці спяшаюцца вырасці, а дарослыя часам не хочуць усведамляць той факт, што дзяцінства засталося недзе ззаду. Мы заўсёды некуды спяшаемся, але ў выніку ўсё адно спазняемся, хоць і, як нам падаецца, выціскаем усю магутнасць са свайго ўнутранага рухавіка.

Кожны з нас спрабуе сам для сябе адкрыць сваю філасофію жыцця, спасцігнуўшы пры гэтым калі не ўсю, то хоць бы частку ісціны, якая так проста ў рукі не даецца. Усе мы розныя і пры гэтым такія аднолькавыя. Толькі зразумець, у чым наша рознасць і наша адзінства атрымліваецца не адразу і не кожнаму...

Можа, некаму падасца, што мой уступ ніякім чынам не звязаны з асноўнай часткай матэрыялу. Але меркаванне гэта будзе памылковым. На такія філасафічныя думкі мяне накіравала размова з чалавекам, які спрабуе знайсці сябе ў гэтым жыцці. Прычым па-за межамі сваёй радзімы. Тут, у нашай краіне, ён вучыцца жыць і разам з тым змагацца за сваё жыццё кожны дзень. Уменне пастаяць за сябе яму неабходна, можа, больш, чым іншым. Сутнасць у тым, што ён — студэнт, які прыехаў да нас з іншай краіны атрымліваць веды і навучацца прафесіі, навыкі якой ужо некалькі пакаленняў у яго сям'і перадаюцца ў спадчыну. На яго радзіме лічыцца, што мець вышэйшую адукацыю — прэстыжна. Гэта прыкмета не проста адукаванасці ці выхаванасці. Гэта яшчэ і паказчык самаўдасканалення, высокага майстэрства самаразвіцця, дасягнуць якога ўдаецца не кожнаму. Таму толькі самыя-самыя могуць знайсці ў сабе жаданне і магчымасці на вучобу ў ВНУ. Абмен студэнтамі — рэч даволі распаўсюджаная ў наш час. Тым больш, што ёсць краіны, дзе вышэйшая адукацыя — задавальненне даволі дарагое. Вось і вырашаюць маладыя людзі адарвацца ад бацькоў, ад роднай хаты і накіраваць свой шлях туды, дзе можна будзе спакойна навучацца, не абцяжарваючыся думкай аб матэрыяльным забеспячэнні сваёй адукацыі. Вучоба ў нашай краіне абыходзіцца ім у два-тры разы танней, чым на радзіме.

Мой герой — **Мурат** (так яго называюць тут, у нас, і менавіта гэта імя ён абраў для публікацыі) прыехаў **з Турцыі**, каб атрымаць дыплом **хірурга**. Так павялося ў сям'і, што ўсе мужчыны працавалі і працуюць у сферы медыцыны. Сям'я Мурата, калі яму было яшчэ толькі 5 гадоў, пераехала з Туркменістана ў Турцыю і цяпер, пусціўшы тут карані, пераязджаць ужо больш не збіраецца. Адукацыя там — справа прэстыжу і забяспечанай будучыні. Тым больш, калі ты малады спецыяліст, якому трэба падымацца самому і падтрымліваць сваю сям'ю. Там адносіны да чалавека з вышэйшай адукацыяй значна адрозніваюцца ад нашых. Паколькі не кожны мае магчымасць навучацца і атрымліваць веды. Можа, таму і стаўленне замежных студэнтаў да вучобы трохі іншае. Напрыклад, калі я яму сказала, што часам даводзіцца «прагульваць» заняткі, ён не адразу зразумеў, як гэта ўвогуле магчыма. Давялося тлумачыць, так бы мовіць дзялліцца досведам. Па словах Мурата, заставацца ў Беларусі ён не збіраецца, хоць і падпадае пад размеркаванне, адпрацоўку, як і ўсе звычайныя студэнты ў нашай краіне. Але гэта яго не асабліва пужае. Два гады — не такі доўгі тэрмін. Пасля ён вернецца дадому і будзе працаваць разам з бацькам, які карыстаецца вялікай павагай сярод сваіх пацыентаў.

Мурат ужо шмат чаго паспеў паглядзець і пакаштаваць. Амаль што ўсе начныя клубы нашай сталіцы аказаліся ў спісе тых месцаў, якія ён адразу наведаў. Праўда, не ўсюды яго і яго сяброў, таксама замежнікаў, сустракалі ветліва. Наш народ працягвае касіцца ў бок людзей, якія адрозніваюцца колерам скуры і, вядома ж, мовай.

— Паміж сабой мы амаль што заўсёды размаўляем на сваёй нацыянальнай мове, — кажа Мурат. — Тым больш, што беларускай мы не разумеем наогул, а руская даецца нам з вялікімі цяжкасцямі. Нас навучалі мове на падрыхтоўчых курсах, якія мы абавязкова праходзілі перад паступленнем ва ўніверсітэт. Мы навучыліся размець рускую, але пісаць і чытаць нам на ёй складана. Хоць з беларускай культуры і літаратуры я асабіста ведаю шмат. І мне многае падабаецца.

Пакуль Мурату складана разбірацца ў нашых людзях. Паколькі, па яго словах, не заўсёды можна зразумець, што менавіта ад цябе хочуць і наогул, ці шчыра з табой размаўляюць. Шмат разоў бывала такое, што ў вочы кажуць адно, а за спінай толькі самае горшае. Асабліва складаная сітуацыя складваецца з дзяўчатамі.

Беларускія дзяўчаты прыгожыя, разумныя, але вельмі хітрыя. Яны не адразу прызнаюцца ў тым, чаго хочуць, а таксама не адразу раскрываюць свае думкі. Я ўжо не кажу аб пачуццях. Шмат разоў бывала такое, што мяне падманвалі. Дзяўчаты, чамусьці, лічаць, што ў мяне шмат грошай, калі я прыехаў з-за мяжы. І я абавязкова павінен іх затраціць на задавальненне іх жаданняў. Калі ж я гэтага не раблю, то нібыта я скупы. Ім проста не прыходзіць у галаву, што ў мяне, магчыма, і няма такой сумы, што я — такі ж студэнт і гэтак сама перабіваюся ад стыпендыі да стыпендыі. Так, наша дзяржава выплачвае нам энную колькасць грошай, але гэта зусім не азначае, што ў мяне там мільёны.

Асабліва Мурата здзіўляе, што дзяўчаты даволі павярхоўна ставяцца да адносінаў, да хлопцаў.

Часам дзяўчатам дастаткова адной ночы. А пасля яны робяць выгляд, што і блізка мяне не ведаюць. У мяне на радзіме так не прынята. Калі я знаёмлюся з дзяўчынай, значыць разлічваю на сур'ёзную будучыню. Калі б мой тата даведаўся, што я проста, як у вас кажуць, «патусаваўся» з дзяўчынай і больш ніколі з ёй не размаўляў, то выгнаў бы мяне з дому. Безумоўна, у нас таксама не ўсё так ідэальна. Грамадства развіваецца і адчуваецца ўплыў Амерыкі і Еўропы. Без гэтага нікуды. Але мы спрабуем захаваць свае традыцыі, сярод якіх перш за ўсё павага да жанчыны.

Нават падчас нашай гутаркі Мурат папрасіў мяне не хлусіць яму, асабліва, калі пытанне будзе надта асабістым, шчырым. Лепш праўда, няхай жорсткая, бязлітасная, але самая натуральная. Ён баіцца хлусні, якой напоўнена наша асяроддзе. Можа, таму, што выхаваны быў у іншых абставінах і традыцыях. А можа, таму, што баіцца апынуцца «ў дурнях».

Мне асабіста падалося, што я падчас гутаркі з Муратам на імгненне апынулася ў Турцыі. Ад яго ішла нейкая такая своеасаблівая энергетыка, якую ў нашых хлопцах уловіш не адразу. Плюс да ўсяго — яго шчырасць. Па ўсім яго знешнім выглядзе было зразумела, што чалавек не мае намеру хлусіць, гэта яму проста нецікава. Яму хочацца абмяняцца інфармацыяй, і падчас гэтага абмену атрымаць як мага больш карыснага для сябе. Я ўжо не кажу аб павазе, якую ён праяўляў у дачыненні да мяне, дзяўчыны. Выхаванне адчуваецца адразу. Па ім бачна, што ён разумее нешта ў модзе, таму ўмее апранацца, правільна падбіраць парфуму і аксесуары. Глядзіш на такога хлопца і разумееш: не сваё, але такое блізкае і жаданае. Вось толькі шкада, што не ўсе мы ўмеем цаніць шчырасць і карыстацца ёю ў патрэбных сітуацыях.

Мурат па-дзіцячы верыць у казкі і працягвае спадзявацца, што дзесьці тут, на нашых землях, знойдзе сваю прынцэсу, якую забярэ з сабою. Туды, дзе зможа будаваць разам з ёй цудоўны палац шчасця, шчырасці і кахання.

Студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Іван МІЦІН:

«БЕЛАРУСЬ — ЦУДОЎНАЕ МЕСЦА ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ»

Знакаміты расійскі пісьменнік прыехаў у Мінск з мэтай распачынання аўтарскай акцыі «Вершы ў кішэні»

...і паабяцаў прыехаць у нашу краіну ўлетку, каб напісаць некалькі твораў.

Малады, але ўжо вядомы расійскі пісьменнік Іван МІЦІН атрымаў шырокую вядомасць не толькі за сваю прафесійную дзейнасць, але, найперш, за крэатыўны падыход у адраджэнні адукаванасці шырокіх масаў людзей. Ягоная акцыя «Вершы ў кішэні» стала праводзіцца ў гарадах Расіі, ЗША, Ізраіля ды Украіны. Цяпер чарга дайшла і да Беларусі... Як адбываюцца акцыі і ў чым іхні сэнс, «Звязда» даведалася ад самога пісьменніка...

На мінскую сустрэчу, якая праходзіла ў мінскай кавярні «Абрыкос», мы прыйшлі таксама не з пустымі рукамі: у нас былі падрыхтаваныя карткі з вершам Максіма Багдановіча «Вось і ноч», напісаным роўна 100 гадоў таму. Гэтыя беларускамоўныя карткі, як нам падалося, выдатна дапоўняць калекцыю Івана, якую ў хуткім часе ён збіраўся раскідваць па горадзе.

На сустрэчы прысутнічала 7 чалавек — не так і шмат, але калі ўлічыць, што на маскоўскія збіраюцца дзесьці чалавек з трыццаць, то беларуская сталіца, меншая насельніцтвам у 6 разоў, сабрала досыць удзельнікаў будучай акцыі. Змагаючыся з жабай, якая ўжо ўчапілася за маё горла, аплачваю чатыры тысячы за стакан вінаграднага соку і пачынаю цікавіцца ў Івана, якім чынам праходзіць акцыя «Вершы ў кішэні»:

— Мы кладзём карткі ў тых месцах, дзе людзі рэальна будуць гэтым цікавіцца: нейкія культурныя ўстановы, — распавядае Іван Міцін, *— альбо ў розных кавярнях у сурвэтках, ці можна пакласці афіцыянтцы ў разлік. Можам улетку і ў парку на лаўках пакласці. Потым многія дзяўчаты (я не рашаюся, напрыклад) прапануюць мінакам проста на вуліцы — людзі бачаць, што гэта не рэклама, і з падзякай бяруць у 80 адсотках выпадкаў.*

— А ўвогуле адкуль ідэя такая ўзялася?

— Ведаеш, вельмі проста: ты едзеш у метро і бачыш, што ў большасці людзей твары відавочна не абцяжараныя інтэлектам — таму трэба з гэтай «культурнасцю» неяк змагацца. І пачынаеш думаць, як гэта зрабіць... Зразумела, што людзі становяцца разумнымі, у прыватнасці, калі шмат чытаюць. І вось менавіта, каб іх да гэтай справы неяк прывучыць хоць бы на ўзроўні аднаго верша, трэба ім нешта «падсунуць», груба кажучы. Але не ў дакучлівай форме, бо, калі пачаць «уціраць», які Пушкін вялікі паэт, яны цябе проста пашлюць як мага далей... Таму, вось, я і падумаў, што не блага было б ужываць такія маленькія паперкі, каб людзі маглі забраць іх з сабою і пачытаць у пэўны момант самоты.

Яшчэ адно пытанне, якое стаяла перад ажыццяўленнем гэтай задумы, заключалася ў тым, што звычайныя паперкі вельмі хутка рвуцца, а таму трэба было іх заламінаваць. І гэтае пытанне было вырашана паспяхова: Іван набыў сабе ўласны ламінатар, на якім былі пушчаныя ў жыццё ажно шэсць тысяч невялічкіх картак... Калі ж першая акцыя была праведзеная, Іван выклаў інфармацыю пра яе ў сваім ЖЧ (**vanmeetin.livejournal.com**) — усім спадабалася, і пацягнуліся людзі, якія хацелі б прычыніцца да гэтай справы адукавання насельніцтва.

— Я падумаў, што не кожны можа сабе дазволіць набыць ламінатар, каб уласнаручна праводзіць такія акцыі, а таму я вырашыў збіраць людзей на сустрэчы, каб яны бралі з сабою выразаныя паперкі з вершамі, дзе мы маглі б іх ламінаваць і пераўтвараць у карткі «Вершы ў кішэні».

— Увогуле, у Мінск я прыехаў у госці да свайго сябры, які нядаўна пераехаў сюды з Масквы. Ну, і думаю: «Чаму б не зрабіць тут такую акцыю?!» І вырашылі сабрацца ў адной мінскай кавярні... Была яшчэ адна праблема: у вашай сталіцы яўны недахоп гэтых самых кавярняў. Хоць яны і ёсць, але ўсе маленькія, утульныя, а такія, дзе можна было б сабрацца хоць бы пятнаццаці чалавекам задужа дарагія .

У планах Івана — распаўсюджанне акцыі «Вершы ў кішэні» не толькі на сваю Расію, але і на ўвесь свет: Амерыку, Еўропу. Адпаведна, будзе гэта пераклад з арыгінала на розныя мовы свету або непасрэдна арыгінальныя вершы — яшчэ адно пытанне... Пакуль жа Іван настолькі натхніўся Беларуссю, што збіраецца прыехаць сюды ўлетку, бо, як кажа сам пісьменнік, тут добра творыцца і... маленькія кошты... Верыцца, што падобныя акцыі яшчэ пройдуць у Беларусі, прынамсі адзін беларускі паэт «паехаў» у Маскву для ўдзелу ў адукаванні суседняй краіны — чарга за сваёй!..

Мікола ТАМАШЭВІЧ.

Пукст, нам цябе недастаткова!

Лікуйце, аматары-«нефарматары»! Самы эпатажны музычны выканаўца Беларусі Сяргей Пукст прэзентаваў паэтычны зборнік «Чужой воздух». Імпрэза адбылася ў галерэі сучаснага мастацтва «Ў». Пазнаёміцца з паэзіяй таленавітага музыкі сабраліся яго прыхільнікі. Сяргей Пукст застаўся адданым сабе: вечарына была прасякнутая... глупствамі і драйвам. Госці не скупіліся на пытанні, але Сяргей больш радаваўся цыдулкам. Прыемна, як-ніяк!

«Мае самыя значныя разважанні сканцэнтраваныя ў кнізе, — кажа Сяргей. — Я напісаў гэтыя вершы ў часы, калі яшчэ думаў над тым, як наогул ствараюцца вершы. Пазнаёміўся з прынцыпам шырокай метафары Марынэці: чым шырэй метафара, тым яна дакладней. У маёй паэтычнай творчасці дзейнічае прынцып «арэляў». Гэта значыць, я параўноўваю два станы, дзве сітуацыі. У зборніку вы не знойдзеце ні знакаў прыпынку, ні вялікай літары. Пунктуацыя — гэта непатрэбная рэч для паэзіі...

«Пукстаманы»: *Сяргей, ці ёсць у вас нейкія адхіленні ў псіхіцы?*

Сяргей Пукст: Кожны чалавек, які піша, мае нейкія адхіленні. Здаровыя людзі не пішуць.

П: *Вашы любімыя пісьменнікі?*

С.П.: Велімір Хлебнікаў і Андрэй Платонаў. Кожны радок з Платонава прымушае задумацца, а ўвогуле я паважаю футурыстаў.

П.: *У тузіне хітоў з'явілася беларускамоўная версія вашай песні «Триумф воли». Ці збіраецеся вы і далей у сваёй творчасці выкарыстоўваць беларускія тэксты?*

С.П.: Па-першае, я хачу падзякаваць Андрэю Хадановічу. Ён так удала падабраў словы, што пераклад атрымаўся больш ёмістым за арыгінал. Гэта ўнікальны выпадак. Тут рэверанс у бок перакладчыка.

П.: *Не хацелі б вы самарэалізавацца ў кінематографе?*

С.П.: Цяпер я ствараю музыку для фільма Андрэя Кудзіненкі «Масакра».

П.: *Ці праводзіце вы цяпер кватэрнікі?*

С.П.: Так. Сачыце за навінамі ў маім блогу.

П.: *Сёння колькасць музычнай прадукцыі, якая выпускаецца, вялікая, а вось якасць — нізкая. Як вы гэта пракаментуеце?*

С.П.: Гэта вельмі доўгая размова. Але калі ў двух словах, то тэндэнцыя такая: гук важнейшы за наватарства. Сустракаецца шмат банальнасці, якая назаляе.

П.: *Каго вы лічыце лепшым за сябе ў музыцы?*

С.П.: Шмат каго. Але з беларускіх выканаўцаў — нікога... Хіба Іван Кірчук з «Троіцы». У мяне няма культуры, але ёсць драйв!

Канцэрт, як і абяцаў сам Пукст, быў нядоўгім, але, як заўсёды з запалам, драйвам. Хіба кожны выканаўца прычэпіць сабе заечы хвосцік і апране кажух? Сяргей выходзіў на біс ажно чатыры разы. І з кожным разам публіка крычала ўсё гучней: «Пукст, нам цябе недастаткова!»

Пасля выступлення музыка раздаваў усім ахвотным аўтографы. Адзін з «пукстаманаў», якому не хапіла грошай на кнігу, папрасіў распісацца на дваццацірублёвай купюры. Што скажаш — які выканаўца, такія і фанаты! Чакаем новых «некультурнасцяў» і глупстваў ад фенаменальнага і непаўторнага Сяргея Пукста.

«Пукстаманы» Каця РАДЗЮК і Аксана МАНЧУК.

Хочаце — верце...

ЦЯЛЬЦА — МУЗЫКАЙ, РАКА — КАМПЛІМЕНТАМІ

Вясной абуджаецца прага кахання. Амуры натачылі свае стрэлы, але, як вядома, далёка не заўсёды гэтыя маленькія гарэзы трапляюць дакладна ў цэль. Дзяўчаты, не будзем спадзявацца нашармака. Падправім амурчыкам прыцэл, скарыстаўшыся парадамі астролагаў.

АВЕН — знак агню, таму запальчывыя вечарыны — яго стыхія. Хлопцы-Авены любяць, калі імі захапляюцца, але яны вельмі непастаянныя, ім неабходныя новыя вострыя ўражанні. Дзяўчына такога хлопца павінна мець моцны характар. Каб «зачапіць» Авена, трэба паказаць сябе з лепшага боку ці скарыстацца метадам «утаймаванне свавольнікі». Авен любіць пераадольваць перашкоды, таму перад ім можна паўстаць у вобразе непрыступнай асобы. Чым складаней яму будзе цябе заваяваць, тым больш ён праявіць настойлівасці і ўпартасці. Толькі не перагні палку!

Хлопцы-**ЦЯЛЬЦЫ** — «правільныя» прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва. Ніколі не пакрыўдзяць, калі што — даруюць. А яшчэ яны гасцінныя, ласкавыя, добрыя. Прычараваць такое «золата» можна, сыграўшы на яго асноўнай схільнасці — любові да прыгажосці. Цяльцы вельмі цэняць жывапіс і музыку. Валодаеш музычным інструментам? Сыграй для свайго Цяльца, намалюй яго партрэт — ён будзе ў захапленні. Апранацца на спатканне лепш у нешта «паветранае», пяшчотнае, рамантычнае, і тады, нягледзячы на сваю правільнасць, Цялец з радасцю акунецца з галавой у каханне.

БЛІЗНЯТЫ лёгка заводзяць сяброў і так жа лёгка з імі развітваюцца. Каб прывабіць такога хлопца, трэба заўсёды быць на ўздыме і кожны дзень выдумляць нешта новае. Блізняты вельмі хутка прывыкаюць да таго, што маюць, і пачынаюць сумаваць. А ад суму яны пачынаюць акідаць вачыма наваколле ў пошуках новых уражанняў і — дзяўчат. Не будзем сцвярджаць, што Блізняты зусім непастаянныя, але адназначна вельмі няўседлівыя. Табе трэба быць вынаходлівай, каб хлопец проста не паспяваў думаць ні аб чым, акрамя цябе.

Асноўная якасць **РАКАЎ** — чуллівасць. Гэта вельмі ранімыя людзі, аднойчы пакрыўдзіўшы Рака, можна страціць яго давер назаўсёды. Ракі вельмі любяць прыцягваць увагу і атрымліваць кампліменты, таму хваліце вашага каханага за ўсё, што можа стаць падставай для гэтага. Для хлопца-Рака важна, каб ты падзяляла яго інтарэсы. Ён — рыбак? Значыць, і ты ўсё жыццё толькі і марыла навучыцца адрозніваць вуду ад спінінга. Ён — аматар футбола? А можа, вы ўдваіх сходзіце на чарговы матч яго (і тваёй, безумоўна!) любімай каманды? Галоўнае, не забывацца хваліць Рака і яго захапленні.

ЛЕЎ — арыстакрат, мужны і велікадушны. Львы ўмеюць быць каралямі (ім проста неабходна быць першымі!). А, значыць, табе пры ім трэба быць першай лэдзі. Львы вельмі самаўпэўненыя, таму такога хлопца вельмі лёгка пакрыўдзіць, калі намякнуць, што ён, па вялікім рахунку, самы звычайны сяроднестатыстычны чалавек. А вось калі ты будзеш весці сябе як каранаваная асоба — па-царску, але пры гэтым яшчэ і з жаночым шармам, то адназначна абудзіш у Льва цікавасць. Ільву спадабаецца дзяўчына, якая паважае сябе, але ставіцца да іншых дружалюбна.

Хлопцы-**ДЗЕВЫ** скрытныя, сарамлівыя. Яны дасягаюць усяго плённай працай і настойлівасцю. І калі ўжо гэты хлопец узяўся за нешта — нізашто не адпусціць. Каб аказацца з ім побач і надалей разам крочыць па жыцці, трэба пераняць яго ж якасці — сціпласць, працавітасць і дабрыню. Хлопцы-Дзевы вельмі любяць прыдзірацца па дробязях і не церпяць беспарадку. Таму, калі ідзеш на першае спатканне, будзь акуратнай. І калі ў хаце — бардак, лепш яго дамоў не запрашаць.

Хлопец-**ШАЛІ** — сама элегантнасць і вытанчанасць. Ён такі абаяльны, стыльны, што ўстаяць немагчыма. Яго мяккі характар і неканфліктнасць цэняць усе. Ідэальная дзяўчына ў яго ўяўленні — гарманічныя, справядлівая, з моцным характарам. Самі Шалі ўсімі сіламі імкнуцца пазбягаць сварак, з-за чаго ім часам даводзіцца ахвяраваць сваімі інтарэсамі і перакананнямі. Табе давядзецца перыядычна абараняць свайго далікатнага каханага. Яму абавязкова спадабаюцца твой розум, эрудыцыя, знаходлівасць. Праяві гэтыя якасці і не пашкадуеш.

СКАРПІЁНЫ — загадкавыя, тэмпераментныя натуры. Хлопец-Скарпіён — высакародны, мужны, ён выключна рэдка ідзе на кампрамісы. Заваяваць яго сэрца нялёгка — прыроджаны баец, ён пры любым намёку на ўціск адразу ўступае ў бойку. Лепш за ўсё прадэманстраваць неабароненасць. Скарпіёны вельмі клапатлівыя, дай яму шанц праявіць гэта: «падвярні» нагу, «падхапі» прастуду. Скарпіёну можна паплакацца, але перагінаць палку не варта — ныцікаў ён не любіць.

СТРАЛЕЦ — гэта гармонія пачуццяў і думак, любоў да прыгажосці і лёгкасць у кантактаванні. Стральцы аптымістычныя і даверлівыя. Хоць яны і бываюць часам неўтаймаванымі свавольнікамі, але ў душы мараць аб сапраўдным каханні і сямейным гняздзе. Стральцы апантаныя рамантыкай і вандроўкамі. Звярнуць на сябе ўвагу Стральца лягчэй за ўсё падчас падарожжа — варта спалучыць прагу да прыгод і ўменне быць пяшчотнай. Цяжка, зразумела, але менавіта гэта вабіць Стральца.

КАЗЯРОГ — спакойны, абаяльны, працалюбівы і катастрафічна заняты хлопец. Ён пралічвае ўсё да дробязяў, таму непрыемныя нечаканасці здараюцца з ім выключна рэдка. Разам з тым, гэты куленепрабівальны чалавек вельмі безабаронны перад кампліментамі і пяшчотай. Паспяховую стратэгію варта будаваць на пяшчоце, усмешцы, дабрыні. Казярогу падабаюцца падарункі, зробленыя сваімі рукамі, цёплыя шчырыя словы. Ідзіце да яго з адкрытай душой — і ён растане.

ВАДАЛЕІ — мяккія, летуценныя, светлыя людзі. І яны любяць выратоўваць каго-небудзь, некага абараняць. А мы, дзяўчаты, істоты слабыя, ранімыя, ды і небяспечнасцяў вакол хапае. Станьце для пачатку з разгублена-безабаронным выглядам перад глыбокай лужынай — і чакайце. Вадалей з'явіцца.

РЫБЫ — міралюбівыя істоты, якія валодаюць невычэрпнай

Яшчэ некалькі дзён таму мы не спалі начамі і назіралі за іх выступленнямі на другім канцы свету, а цяпер яны расказваюць пра свае адчуванні, поспехі і змаганні. Нядаўна прайшла сустрэча з журналістамі алімпійскага чэмпіёна па фрыстайле Аляксея ГРЫШЫНА, сярэбранага прызёра ў біятлоннай індывідуальнай гонцы на 20 кіламетраў Сяргея НОВІКАВА, бронзавай медалісткі гульняў на дыстанцыі 15 кіламетраў біятланісткі Дар'і ДОМРАЧАВАЙ, фіналістаў спаборніцтваў фрыстайлістаў Дзмітрыя ДАШЧЫНСКАГА, Асоль і Цімафея СЛІЎЦОЎ.

МАРЫ ПРА МАЛЕНЬКІ АДПАЧЫНАК ПАСЛЯ БЯСКОНЦАЙ ПРАЦЫ

АЛЯКСЕЙ ГРЫШЫН: ВАЙНА З РУЧНІКАМІ

— У пачатку спартыўнай кар'еры ці думалі вы, што калісьці станеце алімпійскім чэмпіёнам?

— З самага ранняга дзяцінства мяне аддалі ў спорт і я хацеў займацца толькі гэтым. Ужо ў пачатку кар'еры планаваў дабівацца вялікіх поспехаў, а калі пачаў заваёўваць першыя медалі, канчаткова зразумеў, што гэта маё і я зраблю ўсё, каб узысці на вяршыню алімпійскага п'едэстала. Для фрыстайліста важна жаданне, імкненне да перамог. Ну і, безумоўна, храбрасць. Трэба перамагчы сябе ў момант старту і паехаць. Я заўсёды баюся перад скачком, і гэта нармальна — кожны з нас трошкі баіцца, але мы змагаемся са страхам. Ды і ў кожным відзе спорту трэба баяцца, калі такога пачуцця няма — у чалавека нейкія парушэнні ў псіхіцы.

— Ці ёсць жаданне зараз закінуць усё і проста адпачыць?

— Шчыра прызнацца, адразу пасля стартаў, калі вярнуўся ў алімпійскую вёску, на душы была пустата. Не верылася, што ўсё скончылася, здавалася, наперадзе яшчэ старты, старты.. Толькі калі мы прыляцелі ў Мінск, зразумеў, што можна адпачыць і расслабіцца. А што далей? Трэба праверыць яшчэ раз сваю спіну, зрабіць МРТ, паглядзець, ці няма пагоршанняў. Потым невялікі адпачынак — і новая праца, падрыхтоўка да новых выступленняў, да Алімпіяды ў Сочы. А пакуль вельмі цяжка прызвычаіцца, усё ж розніца з Ванкуверам 10 гадзін, днём хочацца спаць, уначы — наадварот. Сёння я прачнуўся з думкамі, што зараз скачкі, лыжы, і толькі потым зразумеў, што ўжо ўсё, я дома. Добра быць алімпійскім чэмпіёнам, але яшчэ лепш двухразовым ці трохразовым пераможцам. Але пакуль хочацца проста сямейнай утульнасці і спакою. Зараз мы ўдваіх з жонкай, але, спадзяюся, неўзабаве нас стане больш.

— Перад турнірам вы казалі, што прыехалі перамагаць. Не баяліся так самаўпэўнена выказвацца? І як вы ставіцеся да рознага кшталту забабонаў?

— Думаю, што кожны спартсмен ставіць перад сабою максімальную задачу. Я сам максімаліст па жыцці і ў Ванкувер ехаў з упэўненасцю, што буду ў прызёрах. Мы правялі вялікую працу з Мікалаем Іванавічам Казекам, і ўсё гэта проста павінна было прынесці пэўны плён. Вельмі ўдзячны СМІ, што перад гульнямі асноўная ўвага надавалася не мне і можна было спакойна рыхтавацца. Мяне не чапалі, далі магчымасць схавацца ад усіх. А наконт забабонаў — не, нічога такога няма.

— Ці задавальнялі бытавыя ўмовы?

— Адзінае, што не задавальняла мяне, з чым я змагаўся на працягу ўсіх гульняў — гэта ручнікі. Яны былі новыя і зусім нічога не выціралі, прычым сам ручнік увесь заставаўся на табе. Бярэш фен і пачынаеш з сябе здзімаць. Я хадзіў мыў гэтыя ручнікі, але нічога не дапамагала. Выціраеш твар — ручнік прыліпае да шчаціння, як Дзед Мароз выглядаеш! Праўда, потым ужо больш-менш стала нармальна, напэўна, іх добра прамылі. А наогул, у Ванкуверы была вельмі прыемная атмасфера, самыя добрыя валанцёры, якіх я бачыў. Хочацца туды вярнуцца: спадзяюся, яшчэ прыедзем на этап Кубка свету. А ўсім чытачам пажадаю любові. І абавязкова падтрымлівайце адзін аднаго — тады ўсё атрымаецца!

АСОЛЬ СЛІВЕЦ: НЕ ПАДДАВАЛІСЯ НА ПРАПАНОВЫ ЭСТОНЦАЎ

— Якія ў вас былі ўзаемаадносіны з братам у дзяцінстве?

— У нас з Цімафеем розніца ў паўтара года — я старэйшая. Дзяцінства ў нас было такое ж, як і ва ўсіх: мы заўсёды сварыліся, не маглі нічога падзяліць, біліся падушкамі. І так год да 10-12. Але з тых часоў мы сябруем. Наогул, брат — мой самы блізкі сябар.

— Вашыя бліжэйшыя планы?

— Трэба адпачыць: мы вярнуліся на радзіму як на другую планету. У вас тут дзень, у нас яшчэ ноч, і наадварот. Яшчэ не можам гэтага зразумець. Уночы снедаем, падымаемся ў чатыры раніцы, тут звоніць тэлефон, усе пытаюцца аб планах. Ды няма зараз ніякіх планаў, проста хочацца адпачыць. Проста перастаць у галаве скакаць, прызямляцца, дакручваць.

— Як наогул спартсменаў прымалі ў Ванкуверы?

— Вельмі пазітыўныя валанцёры, заўсёды сустракаюць, гатовыя дапамагчы. Ды і простыя людзі на вуліцы вельмі ветлівыя. Пасля Лёшынага медаля мы паехалі гуляць па горадзе і на нас кідаліся абдымацца ў метро. Крычалі «О, беларусы, віншуем вас з золатам!» Гэта вельмі здзіўляла — нашу маленькую краіну так успрымаюць.

— Утульна сябе адчувалі ў форме, якая была спецыяльна пашытая да гэтых гульняў?

— Так! Усё проста цудоўна! Да нас падыходзілі прадстаўнікі іншых краін — аўстралійцы, амерыканцы — і прапаноўвалі абмяняцца формай, але форма шмат для нас значыць. Так што мы не паддаліся на прапановы, хоць латышы з эстонцамі нават прапаноўвалі па $500 за яе.

— Ці кантактавалі падчас гульняў з расійскімі спартсменамі і як можаце ацаніць іх выступленне?

— З Расіі прыехала вельмі шмат чыноўнікаў, і яны не заўсёды паводзілі сябе належным чынам: некаторыя дэпутаты былі заўважаны ў непрыстойным выглядзе. «Рускі дом» знаходзіўся акурат на выхадзе з Алімпійскай вёскі, і ўсё было бачна. Магу сказаць, чыноўнікаў, напэўна, было нават больш, чым спартсменаў з нашай усходняй суседкі. А ацэнкі складана даваць, хай гэтым лепш займаюцца ў самой Расіі.

СЯРГЕЙ НОВІКАЎ: ПРОСТЫ ХЛОПЕЦ

— Вам ужо сказалі, якія ўзнагароды вас чакаюць за медаль?

— Пакуль яшчэ нічога не казалі. Ды і не думаю пра тое, як размеркаваць грошы, якія належаць за медаль. Дарэчы, сам медаль падаў ужо два разы, добра што не лопнуў. Але ўсе вырашылі, што на шчасце.

— Застануцца сілы на старты гэтага сезона?

— Толькі што прыехаў з Магілёва, там сёння а палове восьмай раніцы была сустрэча з губернатарам. Да гэтага таксама шмат карэспандэнтаў вакол, а ў цябе акліматызацыя, не разумееш, дзе ты знаходзішся, спаць хочацца. Хацелася б цяпер пару дзён адпачыць, патрэніравацца і яшчэ тры этапы Кубка свету правесці на высокім узроўні.

— Некаторыя спартсмены кажуць, што харчаванне было не вельмі добрым...

— Мне падабалася толькі першы тыдзень, а потым неяк усё прыелася, занадта салёнае ўсё, своеасаблівае. Напрыканцы хадзіў у сталовую ўжо на аўтамаце з устаноўкай, што «трэба штосьці з'есці».

— Не крыўдна, што ваш поспех могуць успрымаць як выпадковы?

— Выпадковасцяў не бывае. Мы рыхтаваліся, і я ведаў, што калі на 20 кіламетрах адстраляю на «нуль», то буду даволі высока. А наконт увагі прэсы... Ды мне неяк не да гэтага, я просты хлопец, мая задача трэніравацца і выступаць.

ДАР'Я ДОМРАЧАВА: ТРОШКІ ПАЧАКАЙЦЕ



— У вас наперадзе яшчэ некалькі стартаў у гэтым годзе, ці хопіць эмацыйнага настрою пасля такога поспеху?

— Мы стараемся захаваць азарт, спартыўны баявы настрой. На жаль, тут, у Мінску, не ўсе людзі (тыя самыя журналісты) разумеюць, што сезон працягваецца. Алімпійскія медалі завараныя, і ўсім хочацца пачуць нашыя каментары, але вялікая просьба да журналістаў: трошкі пачакайце. У нас павінен застацца нейкі час на адпачынак, трэніроўкі таксама працягваюцца. А пасля стартаў Кубка свету мы адкажам на ўсе пытанні.

— Верылі ў свой поспех?

— Упэўнена, што ў кожнага спартсмена, які едзе на Алімпіяду, адна мэта — перамога, проста хтосьці гаворыць пра гэта, а хтосьці трымае ў сабе і проста ідзе да яе.

— Ці былі праблемы з харчаваннем, пра якія часам узнікалі чуткі ў розных СМІ?

— Акрамя Макдональдса, там было яшчэ шмат іншых месцаў, з рознымі стравамі, кухнямі. Магчыма камусьці і не падабалася, але асабіста мне спадабалася, нічога не перашкаджала завяваць алімпійскую ўзнагароду.

ДЗМІТРЫЙ ДАШЧЫНСКІ: У АЛІМПІЙСКУЮ ВЁСКУ, ЯК ДАХАТЫ

— Што можа паўплываць на вашае рашэнне працягваць ці не кар'еру? Магчыма, смс-кі ад шматлікіх заўзятараў з просьбай застацца?

— Цяпер цяжка казаць канкрэтна. Хадзілі чуткі, што ў Ванкуверы я наогул выступаў апошні раз, але я такога ніколі не казаў. Час пакажа, ці будзе жаданне працягваць. У некаторы момант разумееш, што пасля доўгай кар'еры цяжка знаходзіць матывацыю, таму што Алімпійскія гульні толькі раз у чатыры гады, а ў астатні час таксама трэба трэніравацца, выступаць, падтрымліваць сябе ў добрай форме. Так што пакуль не ведаю, трэба пачакаць, а потым будзе бачна.

— Для вас гэта была ўжо чацвёртая Алімпіяда, можаце параўнаць яе з папярэднімі?

— Мне здаецца, арганізатары зрабілі вельмі шмат, каб спартсмены адчувалі сябе як дома. Калі вярталіся ў вёску, шмат людзей падыходзіла, віталіся. Праз тыдзень ужо вярталіся туды як дахаты. Для мясцовых жыхароў гэта было сапраўднае свята. Вялікая колькасць людзей была заўсёды і паўсюль. Ды і да харчавання ніякіх прэтэнзій. Я так разумею, незадаволеныя былі толькі хакеісты, а мы простыя людзі. Пры жаданні можна было без праблем паесці.

Яўген ВАРАКСА.

Фота БЕЛТА.

«СНЕЖНЫ СНАЙПЕР»

Юныя біятланісты Гродзенскай і Магілёўскай абласцей сталі пераможцамі «Снежнага снайпера»

Пераможцамі фіналу рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне, лыжных гонках і стральбе з пнеўматычнай зброі «Снежны снайпер» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў камандным заліку сталі дружыны Магілёўскай (малодшая ўзроставая група) і Гродзенскай (старшая ўзроставая група) абласцей. Трэба адзначыць, што кожны са 196 удзельнікаў фіналу незалежна ад занятага месца стаў уладальнікам камплектаў лыжнай экіпіроўкі, сувеніраў і памятных прызоў ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, а таксама іншых арганізатараў спаборніцтваў. У іх ліку Міністэрства спорту і турызму, Міністэрства адукацыі, Мінгарвыканкам, БФСТ «Дынама», Нацыянальны алімпійскі камітэт, а таксама Беларускія федэрацыі біятлона, лыжных гонак і стралковага спорту.

Хакей. КХЛ

БЕЗ СУМУ АБ ПРАЙШОЎШЫМ

На мінулых выхадных мінскае «Дынама» скончыла свой другі сезон у Кантынентальнай хакейнай лізе. Гульні супраць «Салавата Юлаева» і «Авангарда» прынеслі беларусам пяцідзесяціпрацэнтны вынік і агульнае 17-е месца ў турнірнай табліцы.

Фота khl.ru

Напэўна, не варта доўга прыпыняцца на апошніх паядынках, усё даволі банальна. «Салават», які імкнуўся да лідарства ў чэмпіянаце, не пакінуў «зубрам» ніводнага шанцу — лік 4:1 кажа ўсё сам за сябе. А вось омскаму «Авангарду», наадварот, нічога ўжо не было патрэбна, хіба што невялічкі адпачынак перад плэй-оф, таму «ястрабы» і не надта ўпіраліся ў супрацьстаянні з «бела-блакітнымі» — 3:2 на карысць беларусаў (трэба адзначыць «2+1» Антоненкі).

Звычайна напрыканцы чагосьці (зусім не важна чаго) з'яўляецца пачуццё жалю і шкадаванне аб тым, што ўсё так хутка праляцела: ці то прыезд у родныя мясціны, ці то сустрэчы з блізкімі людзьмі. І ведаеш жа, што гэта будзе яшчэ і не раз, што цяпер цябе чакае, магчыма, штосьці яшчэ больш цікавае, але ўсё адно шкадуеш. Напэўна, галоўнай ацэнкай выступленню «Дынама» ў гэтым сезоне можна лічыць адсутнасць жалю. Ну было, ну прайшло. І не холадна, і не горача ад гэтага. «Дынамаўцы» не падарылі краіне КАМАНДУ, яны не прымусілі ўсю Беларусь (ці хоць Мінск) у адзіным парыве радавацца сваім перамогам і абмяркоўваць прычыны паражэння. Цяпер гэта не каманда для заўзятараў, хаця, хутчэй, проста каманда для каманды. Самі для сябе. Нават перапоўнены Палац спорту (пасля «Мінск-Арэны») часам нагадваў тэатр, і невялічкая купка заезджых фанатаў, здзіўлена ўсміхаючыся, лёгка перакрыквала **2500, 3000, 8000, 12 000** мінскіх гледачоў.

А ўспомніце, як усё распачыналася. Запрашэнне Хэнлана, Мезіна, Антоненкі, Пелтанена, новы кантракт з Хювененам дазвалялі аптымістычна спадзявацца як мінімум на выхад у плэй-оф. Але ўсё адразу пайшло не так, як марылася. Магчыма, Глен сапраўды не клубны трэнер, у «Вашынгтоне» з Авечкіным у яго таксама атрымоўвалася не вельмі, але адстаўка канадца, якую ініцыяваў асабіста спадар Навумаў (праз некаторы час сам сышоўшы з хакейнай прасторы), выглядала вельмі радыкальнай і зусім не прадуманай. Аляксандру Андрыеўскаму, вырванаму з беларускага чэмпіянату, дасталіся тыя самыя гульцы з функцыянальнай базай, закладзенай яго папярэднікам. Змяніць штосьці пасярэдзіне сезона было проста немагчыма. У выніку маем тое, што маем — апошняе месца ў дывізіёне Баброва і пралёт міма плэй-оф. Другі сезон запар.

Што далей? Безумоўна, можна зноў пераскідацца грашыма (бюджэтнымі, дарэчы) і запрасіць старэючых зорак з замежным трэнерам на чале. Але ці не лепш захаваць тое, што маем, даўшы Андрыеўскаму другі шанц? Наша краіна не настолькі багатая, каб ва ўмовах нестабільнай эканамічнай сітуацыі ва ўсім свеце раздаваць направа-налева мільёны долараў. Каб яшчэ карысць якая была ад гэтага. Перспектывы ў трэнерскага штаба, складзена з беларускіх спецыялістаў, можа грунтоўна дапоўніць новы генеральны дырэктар, на пасаду якога быў запрошаны Сяргей Каткоў (менавіта гэты спецыяліст у сярэдзіне 90-х ператварыў тальяцінскую «Ладу» з сераднячка ў лідара еўрапейскага хакея). Трэба толькі пачакаць і даць спакойна працаваць людзям.

Сезон для нас скончаны. Заслона.

Яўген ВАРАКСА.

Панчоха і нож

6 сакавіка сярод белага дня ў незачыненую хату 88-гадовай пенсіянеркі ў вёсцы Алешкавічы Бялыніцкага раёна зайшоў мужчына, на галаве якога была панчоха. Пад пагрозай нажа невядомы забраў у спужанай бабулі прыхаваныя 500 тысяч рублёў. Аднак зламысніка міліцыя знайшла хутка: ім аказаўся 26-гадовы жыхар раённага цэнтра, які нідзе не працуе.

Алена КАЗЛОВА.

Дапамог выбіць дарожку...

Пенсіянерка з Баранавічаў вырашыла навесці ў кватэры парадак і папрасіла знаёмага яе сына, каб той дапамог вынесці і выбіць дывановыя дарожкі. Калі хлопец справіўся з пастаўленай задачай, гаспадыня ўспомніла, што пад дарожкай хавала канверт з грашыма. Пенсіянерка пачала шукаць, але нічога не знайшла і запатрабавала, каб памагаты вярнуў 1,5 млн. рублёў. Мужчына сказаў, што ніякага канверта ён не бачыў, і пакінуў кватэру. Тады гаспадыня пайшла ў міліцыю і памагатага затрымалі. У крадзяжы ён прызнаўся і вярнуў грошы, хоць невялікую частку паспеў патраціць. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Ну і ну!

Лось... з дакументамі

Работнікі Навагрудскай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры правядзенні прыродаахоўнага рэйду на палігоне цвёрдых бытавых адходаў паблізу вёскі Алёхнавічы Дзятлаўскага раёна сярод бытавога смецця знайшлі рэшткі лася — галаву, частку шкуры, пярэднія ногі. І тут жа побач... дакументы на імя жыхара нашай краіны.

— Гэта былі медыцынская даведка і нейкія рахункі, — распавёў намеснік начальніка інспекцыі Дзяніс МАСКАЛЬ, які браў удзел у тым рэйдзе. — Дзятлаўскім РАУС па гэтым факце заведзена крымінальная справа, а пракуратура санкцыянавала вобыск у доме ўладальніка дакументаў. Было ўстаноўлена, што гэты грамадзянін мае ўскоснае дачыненне да справы. Згодна з устаноўленай інфармацыяй лось быў траўмаваны аўтамашынай. Пэўныя асобы, якія ўжо ўстаноўлены, знайшлі яго, прывезлі ў вёску, дзе тушу разабралі і падзялілі паміж сабой мяса. Цяпер высвятляюцца ўсе акалічнасці справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УНП 101081643.

Годовой баланс ОАО «Торговый центр «Уручье» за 2009 год

Минск, ул. Руссиянова, 36, тел. 260 81 51

№ Актив	Млн. руб	Пассив	Млн. руб.
1. Основные средства	477	Уставной фонд	82
2. Запасы	970	Резервный фонд	35
3. Дебиторы		Фонды	200
4. Денежные	213	Кредиты банка	–
5. Прочие активы	158	Кредиторская задолж.	1501
Баланс	**1818**	**Баланс**	**1818**

Отчет о прибылях и убытках ОАО «Торговый центр «Уручье»

Наименование показателей (млн. руб.)	За 2009 год
Выручка от реализации товаров и услуг	23221
Себестоимость реализованных товаров и услуг	16927
Расходы на реализацию	2981
Внереализационные доходы	- 261
Прибыль за отчетный период	129
Налоги и платежи из прибыли	160

Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Торговый центр «Уручье»

№	Наименование показателей	Ед. изм.	За 2009 г.
1.	Выручка от реализации товаров, услуг (за минусом налогов)	Млн. руб.	23221
2.	Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг;	Млн. руб.	16927
	Управленческие расходы, расходы на реализацию: из них на оплату труда.	Млн. руб.	–
	Расходы на реализацию	Млн. руб.	2981
3.	Прибыль за отчетный период, всего	Млн. руб.	128
	В том числе:		
	Прибыль от реализации товаров	Млн. руб.	549
	Прибыль от внереализационных расходов	Млн. руб.	-261
4.	Налоги и другие платежи из прибыли	Млн. руб.	160
5.	Просроченная дебиторская задолженность	Млн. руб.	–
6.	Просроченная кредиторская задолженность	Млн. руб.	–
7.	Нераспределенная прибыль	Млн. руб.	160
8.	Начислено на выплату дивидендов	Млн. руб.	–
9.	Дивиденды на одну акцию	Млн. руб.	–
10.	Количество акционеров, всего	лиц	11
	В том числе:		
	Юридических лиц	лиц	2
	Физических	лиц	9
11.	Среднесписочная численность	человек	139
12.	Обеспеченность акции имуществом Общества.	тыс. руб.	490

Директор И.Г. Ермолаева

Главный бухгалтер А.С. Стрелковская

ІДЭЯ ПРАЕКТА ЎЗНІКЛА, КАЛІ ЗАБІРАЎ ДАЧКУ АДЭЛЮ З САДОЧКА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА — ГЭТА НЕ ЗБОРЫШЧА ЗАКАМЯНЕЛЫХ АЎТАРАЎ!»

— Спадар Лявон, гэты праект незвычайны для вас: калі пра мінулыя праекты некаторыя казалі, што «Вольскі крыўляецца», то гэты — цалкам сур'ёзны. Мне здаецца, што ён для вас стаў пунктам замацавання — як для альпіністаў...

— Дакладна!.. Якраз гэта і ёсць такая адзнака: залез на новую прыступку гары — замацаваўся. Бо я люблю пакрыўляцца насамрэч. А тут не пакрыўляешся, бо досыць сур'ёзныя тэксты розных беларускіх паэтаў падабраліся для гэтай праграмы. Я хацеў, каб была нейкая такая нотка з крыўляннем, перагартаў увесь зборнік Крапівы — нічога не атрымалася. Атрымаліся рознастылёвыя песні, з розным настроем — бо іх пісалі розныя людзі, у розны час, пад уплывам розных пачуццяў, эмоцый. Таму давялося кожны перажываць па-свойму. Гэта значыць, перажытае гэтымі паэтамі і мне давялося перажыць... У нас, насамрэч, так выкладанне вялося ў школе, што я і ўявіць не мог, што ў Куляшова могуць быць такія вершы, як «Парушыўшы законы прыцягнення». Вучылі «Сцяг брыгады», «Цвёрда трымаўся юнак на дапросе...» — здавалася, у такім кірунку і ўся творчасць. Мне не хацелася б займацца «ліквідацыяй непісьменства», бо гэта нудна. Думаю, што шмат людзей папросту зразумее, што беларуская літаратура — гэта не зборышча закамянелых і кананізаваных аўтараў, без хібаў і заганаў. Такіх нейкіх стэрыльных і стэрылізаваных істотаў.

— Пасля гэтай праграмы — будзеце далей крыўляцца?

— Я крыўляцца буду, пакуль мне дазваляе сітуацыя і гады!.. Я думаю, што беларускую публіку трэба лекаваць не толькі сур'ёзнымі праектамі, але і крыўляннем таксама. Трэба ўмець паіранізаваць і з сябе, і з сітуацыі, і з жыцця. Гэта абсалютна здаровы працэс. А ўсе, хто мяне абвінавачвае ў блазенстве, мне здаецца, занадта сур'ёзна ставяцца да гэтага жыцця беларускага нашага. І гэта іхні мінус!

«ПАЧЫТАЎ БАГУШЭВІЧА І ЗРАЗУМЕЎ — ДЫК ГЭТА Ж САПРАЎДНЫ РЭП!..»

— Паводле якога прынцыпу вы выбіралі гэтых паэтаў?

— А неяк само склалася... Зразумела, многія не патрапілі — з былых, з сучасных... Ёсць цэлая плойма рэпрэсаваных паэтаў, якім трэба было б прысвяціць асобны альбом!..

— Спадар Лявон, а чаму гэты праект атрымаўся сольны — а не, скажам, пад брэндам вашага гурта NRM?

— Сольны — бо NRM працуе ў сваёй галіне. Да таго ж, у гэты час кожны музыка з NRM працаваў над аўтарскім праектам, не было як адрываць. Ведаеце, ад мяне многія чакалі сольнай работы, а выйшлі «Куплеты і прыпевы» — усе падумалі: «о-о-о-о, ну капец, усё зразумела...» (Альбом атрымаўся дужа несур'ёзны, сцёбны, з масай «крыўлянняў». — **Г.Л.**) Там большасць музыкі рабілася пад старадаўні сінтэзатар... А «Белая яблыня грому» — напраўду першы сольны праект, хоць словы напісаў не я. Тут іграліся музыкі, тут улічваліся мае патрабаванні да песень...

— Дарэчы, якія музыкі ўдзельнічалі ў запісе праекта?

— У запісе ўдзельнічалі адны музыкі, на канцэрце будуць іграць іншыя... У запісе трэкі бубновыя запісаў Саша Старажук, які цяпер іграе ў «Ляпісах», адзін з лепшых бубначоў Беларусі. Басавыя партыі запісаў Саша Мышкевіч, які іграе ў «Без білета», вельмі добры басіст. Гітарныя трэкі пісаў Павел Траццяк, з якім мы ўжо неаднаразова супрацоўнічалі — ён іграе цяпер у J_mors. Клавішныя я прапісаў, некаторыя гітары таксама я. На скрыпцы граў Аляксандр Хаўкін, які раней граў у «Крамбамбулі», а цяпер працуе гукарэжысёрам.

— Усе песні альбома атрымаліся дужа рознастылёвыя. Была такая мэта — зрабіць усе колеры вясёлкі?

— Зусім не. Проста пасля прачытання кожнага верша адразу была нейкая асацыяцыя музычная. Пачалося гэта досыць даўно — гадоў сем таму. Мая дачка Адэлька хадзіла ў садок. Мы з жонкай Ганнай прыйшлі неяк зарана яе забіраць — і зайшлі ў кнігарню ля садка. І набылі там зборнічак Багушэвіча. Увечары, калі гарталі ўважліва, то зразумелі, што рэп на гэта напісаць — самае яно! Бо гэтыя радкі рваныя, няма памеру, такія дзіўныя «рэперскія» акцэнтацыі... З гэтага пачалося. Пасля я ўзгадаў гэты Броўкаў «Чабор» яшчэ са школы — і зразумеў, што чыста такая «бітлаўская» стылістыка падыходзіць. Потым мне Саша Старажук сказаў, што сапраўды ў альтанках у 70-х так спявалася... Потым пачаў чытаць, гартаць зборнікі — і ў кожным нейкая такая «перліна» знаходзілася, кожны верш асацыяваўся з нейкай музыкай, са стылем.

«НА ЎРОКАХ БЕЛЛІТУ НАСТАЎНІЦА ЧЫТАЛА НАМ ДЭТЭКТЫВЫ, КАБ НЕ ДУРЭЛІ...»

— Мне здаецца, што ў гэтай праграме, апроч музычнага, моцны адукацыйны складнік: мы бачым, што беларуская класічная літаратура — гэта сучасна, прыгожа і стылёва!

— Напраўду, цягам апошніх гадоў дваццаці існуе такая няўвага да беларускай літаратуры. Некаторыя гавораць: а, нахалеру нам трэба гэтыя савецкія пісьменнікі? Аднак атрымліваецца, што мы ўвесь час выракаемся сваёй спадчыны. Што сто гадоў таму, што пяцьдзясят. «Ай, не трэба нам княства літоўскае — у нас ёсць партызаны, рэвалюцыя і вайна». Альбо «нам не трэба гэтыя камуністычныя пісьменнікі, мы новага панапішаем». І ўсё пачынаецца наноў, без аніякага падмурка. Мне падаецца, гэта памылка. Менавіта савецкія пісьменнікі — Танк, Куляшоў і Панчанка — зусім па-іншаму для мяне загучалі...

— Але вы, па сутнасці, узялі ў іх вершы, адарваныя ад часу, а не прасякнутыя савецкай ідэалогіяй... А вы, дарэчы, у школе ўсю каламуць вучылі?

— У школе ў мяне былі заніжаныя веды па беларускай літаратуры — была настаўніца не вельмі добрая. Потым яна пайшла ў дэкрэт, а прыйшла такая маладая. Скончылася выкладанне беларускай літаратуры тым, што яна чытала нам дэтэктывы на ўроках — каб не стаялі на вушах, а ўважліва слухалі. Потым паставіла ўсім «пяць» і «чатыры» — і гэта пасляхова скончылася вакацыямі.

— Ваш бацька Артур Вольскі — вы, напэўна, многіх пісьменнікаў запомнілі асабіста?..

— На вялікі жаль, я быў малы, калі былі ўсе гэтыя пасядзелкі. Але ў гасцях, пэўна, усе ў нас бывалі... Да Танка, мабыць, бацькі хадзілі кватэру выбіваць — ён жа быў старшынёй Саюза пісьменнікаў. У дзеда майго лецішча было на Нарачы — побач з Танкавым. Быў такі перыяд, калі мой бацька быў дырэктарам Дома літаратараў — дык я, малы, там усіх перабачыў... Але добра з дзяцінства памятаю толькі Барадуліна — з тых, хто ўвайшоў на гэтую складанку. Памятаю, як мы з бацькам гулялі па вуліцы (бацька ў той час быў дырэктарам Тэатра юнага гледача) — і сустрэлі Барадуліна. Бацька з Барадуліным пайшлі «па пяцьдзясят». Мне, малому, узялі марозіва. А самі — па пяцьдзясят ды па пяцьдзясят... Я з'еў, тузаю бацьку за штаніну — вазьмі яшчэ! Не ведаю, колькі яны там бралі «па пяцьдзясят», але назаўтра я прачнуўся з ка-а-анкрэтнай ангінай!..

— Спадар Лявон, а ў вашай дачкі-шасіклясніцы Адэлі белліт як выкладаецца?

— Ну, лепш, чым у нас. Але гэта беларуская гімназія — трэба ўлічваць. Нехта пры ёй нядаўна сказаў нешта кшталту «ай, што той Колас». Яна абурылася: «Як гэта?! Ды гэта зорка!..» Колас для яе — рэальная зорка, як Курт Кобэйн які... Мне толькі абсалютна не зразумела, чаму ў праграме па беларускай літаратуры засталіся ўсе гэтыя савецкія вобразы... Няма ўжо таго часу, пара пераглядаць праграмы.

— У часе падрыхтоўкі альбома вы, напэўна, вывучалі біяграфіі пісьменнікаў, іх творчы шлях... Што запомнілася?

— Збольшага я гэта ўсё ведаў — усё-ткі бацька беларускі пісьменнік. Іншая рэч, што я — таксама частка беларускага народа. А ў нас гэта зрабілася такім непапулярным, забылася! Я забыўся, як Танк хадзіў пехам у Вільню па навуку са сваёй Пількаўшчыны... Забыўся ягонае «На гасцінцах бярозы зусім пасівелі ад ветру...» Гэта ж магутна гучыць!.. Я забыўся таксама, што Панчанка — пры ўсёй сваёй апантанай грамадзянскай лірыцы — даволі мяккі, культурны, інтэлігентны чалавек. Сярод гэтых людзей, можа, за рэдкім выключэннем — няма такіх, пра якіх Панчанка пісаў: «Нехта і подлы, і хіжы клятву паўторыць тваю...» Яны ўсе добрыя людзі. Я памятаю, як аднойчы прыехаў з Варшавы — і выпадкова сустрэўся з паэтам Уладзімірам Някляевым. І сталі мы размаўляць пра беларускіх савецкіх паэтаў. Я задуменна сказаў, што там ёсць магутная лірыка... Някляеў адказаў: «Гэтае пакаленне яшчэ ніхто не перапісаў...» І пачаў мне на памяць цытаваць цэлую паэму Куляшова...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

ТРЭК-ЛІСТ ДЫСКА «БЕЛАЯ ЯБЛЫНЯ ГРОМУ»

1. Гэй, наперад! (Янка Купала)
2. Пахне чабор (Пятрусь Броўка)
3. Сон (Адам Міцкевіч)
4. Вецер Радзімы (Максім Танк)
5. Скандынаўская песня (Максім Багдановіч)
6. «Парушыўшы законы прыцягнення...» (Аркадзь Куляшоў)
7. Немец (Францішак Багушэвіч)
8. Машыны (Ларыса Геніюш)
9. «Мала сказаць: ненавіджу...» (Пімен Панчанка)
10. У турме (Якуб Колас)
11. Белая яблыня грому (Рыгор Барадулін)
12. Заснаванне Вільні. 1322 г. (Ян Чачот)

НЕ ПРАПУСЦІ!

Калі: 23 сакавіка
Дзе: Купалаўскі тэатр
У колькі: 19.00

ВЕРШ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА, ЯКІ ТАК УРАЗІЎ ЛЯВОНА ВОЛЬСКАГА

* * *

Парушыўшы законы прыцягнення,
Планетамі сярод другіх планет
Існуем мы з табой як выключэнне,
Мая любоў, — як свет і антысвет.

Ніколі мы адной не ходзім сцежкай,
Не дзелім хлеб і дзелім толькі соль,
Ты сустракаеш смутак мой усмешкай
І смуцішся, калі міне мой боль.

Адказваеш на мой сардэчны захад
Нязгодай, самай крыўднаю з нязгод.
Здаецца, павярнося я на захад,
Як тут жа ты павернешся на ўсход.

Аднак зямля б мая асірацела
І ўвесь сусвет ахутала б імгла,
Каб, выбухнуўшы раптам, адляцела
Ты ў невядомасць з хуткасцю святла.

1962 год

ЧЭХАЎ НА ЭКРАНЕ

Рэтрапраграма «Па чэхаўскіх матывах», прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння класіка рускай літаратуры Антона Паўлавіча Чэхава, пачалася 2 сакавіка ў Музеі гісторыі беларускага кіно.

У рамках рэтрапраграмы будуць паказаныя 11 лепшых экранізацый твораў Чэхава, знятых у савецкі час. Так, гледачы змогуць убачыць кінастужкі «Дама з сабачкам» і «Дрэнны добры чалавек» Іосіфа Хейфіца, «Сямейнае шчасце» Сяргея Салаўёва, «Дзядзька Ваня» Андрэя Міхалкова-Канчалоўскага.

— Юбілей класіка — добрая падстава нагадаць пра тое лепшае, што было створана ў нашай культуры, — гаворыць **Ігар АЎДЗЕЕЎ, загадчык Музея гісторыі беларускага кіно**. — Калі пракат знаёміць гледачоў з навінкамі кінематографа, то мы вяртаем іх да мінулага, да фільмаў, якія сталі шэдэўрамі. Напрыклад, унікальны паказ кінастужак рэжысёра Інакенція Ананенскага «Мядзведзь», «Вяселле», «Маска», «Чалавек у футляры», знятых у 1930—1940 гадах яшчэ ў чорна-белым варыянце. Сапраўдны падарунак знаўцам мастацтва.

Экранная экспазіцыя завершыцца 30 сакавіка фільмам Мікіты Міхалкова «Няскончаная п'еса для механічнага піяніна».

Таццяна ДАНІЛУШКІНА.

ЗАРОБАК ВЫЗНАЧАЕ ЭКАНОМІКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Інвестыцыі і эканомія

— Заробак нельга проста штучна павялічыць, яго трэба зарабіць. Якім чынам ён павялічыцца ад студзеньскага заробку ў 871,2 тысячы рублёў да 1,3 мільёна ў снежні ў сярэднім па Магілёўскай вобласці?

— Усе лічбы дыктуе эканоміка. Галоўнае ў тым, што вядзе да напаўнення кашалька прадпрыемстваў і выканання імі заданняў па заробку.

Гэта, найперш, рытмічная праца прадпрыемстваў. Сёння важна забяспечыць не толькі павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці, але і, безумоўна, рэалізацыю прадукцыі.

Другі рэзерв — гэта стварэнне новых прадпрыемстваў, асабліва з прыцягненнем замежных інвестараў. Заснавальнікі новых прадпрыемстваў, акрамя стварэння працоўных месцаў, прымаюць на сябе і абавязацельствы па дастойнай аплаце працы.

Інвестыцыі ствараюць перадумовы для прагрэсіўнага развіцця эканомікі. Сёння Беларусь і, у прыватнасці, Магілёўская вобласць прыцягальныя для інвестараў.

— Аднак ад інвестыцый да заробку шлях усё ж такі доўгі. А ўжо ў сёлетнім снежні заробак павінен павялічыцца ў параўнанні з леташнім снежаньскім на 38,5 %.

— Шлях, можа, і доўгі, але ён аб'ектыўны і неабходны. Па-іншаму проста не атрымаецца. Асабліва калі глядзець не толькі на год, але і на перспектыву. Каб праз тры гады атрымаць сярэдні заробак у тысячу долараў, умоўна кажучы. Інвестыцыі, інавацыйны шлях развіцця дадуць нам прыгожы заробак не сёння, але заўтра.

Аднак Магілёўская вобласць і сёлета выканае даведзены паказчык па сярэднім заробку. Мы не можам гэтага не зрабіць — за намі больш за мільён жыхароў вобласці.

І гэта не проста заклікі, ёсць усе перадумовы.

Эканоміка патроху выходзіць са стану няпэўнасці. Трэба толькі кожнаму бачыць свае магчымасці. Прамысловасці — у зніжэнні ставак па крэдытах, сельскай гаспадарцы — у тэндэнцыі павышэння попыту на прадукты харчавання, будаўніцтву — у павелічэнні долі ільготнага крэдытавання жылля і гэтак далей.

Улада ж бачыць сваю задачу ў прыцягненні інвестараў, стварэнні ўмоў для іх камфортнай працы. Вось гэтая папка на маім стале — інвестыцыйныя прапановы. Ужо сёння мы маем інвестыцыйных прапаноў на суму звыш 168 мільёнаў долараў. Так што, я ўпэўнены, што дасягнем. Хацелася б, каб маю ўпэўненасць раздзялілі і тыя, пра каго я сказаў вышэй.

— Ці праўда, што адной з дзейсных мераў павелічэння заробку з'яўляецца эканомія матэрыяльных рэсурсаў?

— Абсалютная праўда. Не сакрэт, што заработная плата складае ў сабекошце прадукцыі, калі казаць прыблізна, 25 %. Больш ці менш — залежыць ад галіны. Калі знізіць матэрыяльныя выдаткі — павялічыцца доля заробку.

Мы прызнаём, што нашы вытворчасці матэрыяла- і энергаёмістыя. Падлічана, што зніжэнне матэрыялаёмістасці на 2,5 % дае магчымасць бязбольна для сабекошту павялічыць заробак на 10 %.

Сабекошт прадукцыі можна паніжаць спакойна: за кошт аптымізацыі вытворчых працэсаў, эканоміі энергіі, вынішчэння непатрэбных выдаткаў. Не, не скарачаць людзей — на гэта вялікага розуму не трэба, але мадэрнізаваць і зрабіць эканамічным працэс вытворчасці. Мяркую, што на любым прадпрыемстве можна скараціць выдаткі як мінімум на 3-5 %.

200 долараў — мінімум

— Сярэдні заробак — гэта праўды нібыта сярэдняя тэмпература па бальніцы.

— Так, у аднаго за 40 градусаў, у другога 35, а ў сярэднім — норма. Безумоўна, для вядучых галін эканомікі (энергетыкі, нафтахіміі, газавай гаспадаркі, банкаўскага сектара і іншых) нашы цяперашнія арыенціры — зусім не праблема. Мінск і абласныя цэнтры таксама маюць прыстойны сярэдні заробак.

Складаней зарабіць у Краснаполлі, Хоцімску і Глуску, дзе няма вялікіх прадпрыемстваў. Аднак сёлета аблвыканкам паставіў мэту, каб у кожным раённым цэнтры з'явілася 5-10 новых прадпрыемстваў, і некалькі з іх — прамысловыя. Гэта ланцуг: новыя працоўныя месцы — занятасць — заробак.

Заснавальнік новага прадпрыемства, як правіла, плануе строга неабходную колькасць работнікаў. У адрозненне ад дзейных прадпрыемстваў, дзе часта могуць захоўвацца лішнія працоўныя месцы. Таму ў новаствораных суб'ектах гаспадарання фонд заробкаў дзеліцца сярод меншай колькасці работнікаў. Гэта, як вы разумееце, забяспечвае больш высокі ўзровень аплаты працы.

— Пакуль жа ў вобласці некалькі соцень арганізацый, дзе сярэдні заробак ніжэй за 200 долараў.

— Калі казаць дакладна, то іх 305 на канец мінулага года. Гэта сельгаспрадпрыемствы, бюджэтныя арганізацыі, таксама гандлёвыя, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання.

Заўважу, што 444 долары — гэта не адзіны арыенцір. Яшчэ адзін, і не менш важны — мінімальны ўзровень заробку ў 200 долараў. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік паставіў задачу напрыканцы гэтага паўгоддзя ўсім арганізацыям без выключэнняў мець сярэдні заробак не ніжэй за 200 долараў. Аблвыканкам мае канкрэтныя ідэі, як гэтага дасягнуць.

— Цяпер на інтэрнэт-форумах прых абмеркаванні заробкаў і сёлетніх планаў па іх павелічэнні абавязкова ўзгадваюць пра нізкааплатныя слаі насельніцтва. Вы з такімі людзьмі сустракалісяся? Глядзелі ім у вочы?

— Не аднойчы, на прыёмах грамадзян у сельскай мясцовасці. Аднак зразумейце, што людзі ў вёсках усё ж больш адаптаваныя да розных жыццёвых праблем, бо прасцей да іх ставяцца, таму што ў іх ёсць падсобная гаспадарка, якая заўсёды дасць магчымасць мець свае харчы. Калі дзяржава будзе выконваць свой абавязак па своечасовай аплаце сялянам іх прадукцыі, яны ніколі не прападуць.

Вядома, у зоне рызыкі знаходзяцца, напрыклад, маці-адзіночкі, якія засталіся без падтрымкі мужчыны. Састарэлыя з сур'ёзнымі хваробамі і людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Вось ім цяжка глядзець у вочы. Але і для многіх з іх, пры ўмове частковай занятасці, магчыма зарабіць тыя 200 долараў.

Я хачу папрасіць усіх людзей, перадусім здаровых і здольных працаваць: калі вы адчуваеце свой патэнцыял, не сядзіце і скардзіцеся на жыццё, а ідзіце ў цэнтры занятасці, перавучвайцеся і дамагайцеся дастойнага заробку. Усё залежыць ад нас самых.

Працуй і зарабляй

— Ці не турбуе ўладу сацыяльнае расслаенне ў выніку вялікай розніцы заробкаў, напрыклад, у банкаўскім сектары і настаўнікамі?

— Давайце паглядзім лічбы: у студзені сярэдні заробак у банках — 1 мільён 593 тысячы, у бюджэтнай сферы — 753 тысячы рублёў. Паводле прагнозаў, супрацоўнікі бюджэтных арганізацый напрыканцы года будуць зарабляць у сярэднім 1, 077 тысячы рублёў, альбо 368 долараў.

Гэта не расслаенне, усё знаходзіцца ў дапушчальных межах. У 85% насельніцтва розніца паміж мінімальным і максімальным значэннем заробку не перавышае 2-разовай. На цяперашнім этапе развіцця нашай дзяржавы, лічу, гэта нядрэнна. Горш, калі б разрыў быў у 3,5—4 разы.

Увогуле, я мяркую, што трэба жыць па сродках, менавіта па зароблены сродках. Сёння банкаўская сфера запатрабаваная, таму яна і высокаплатная. Ёсць прапанова, попыт і магчымасць зарабіць. Праўда, на Захадзе па-іншаму. Там банкаўскія работнікі — не самыя высокаплатныя, іх апярэджваюць адвакаты і настаўнікі.

А што датычыцца расслаення, то я не гляджу ў чужыя кішэні. Ну што ж, у чалавека ёсць высокі IQ, энергія і магчымасці, таму ён і зарабляе шмат. Маё меркаванне такое: нікому з нас не позна вучыцца. Так сказаў мне адзін вельмі разумны чалавек, які ў свае 46 гадоў пайшоў вучыцца ў ВНУ.

— І што з ім адбылося далей?

— Атрымаў вышэйшую адукацыю, але ён — нібыта Ляўша, усё ж вярнуўся да свайго рамяства, якое не толькі давала даход, але і прыносіла задавальненне.

— Добра, калі чалавек займаецца сваёй любімай справай, ды яшчэ можа на ёй зарабіць.

— Мая галоўная думка ў тым, што ў кожнага чалавека ёсць магчымасць зарабіць. Калі не 500, дык 200 долараў дакладна. Трэба імкнуцца зарабіць, хацець.

— Можа, усё ж такі імкнення мала?

— Я ў студэнцтве працаваў у будатрадах, часта ўначы разгружаў вагоны. Знаёмы сродак заробку для мужчын, ці не так? Сёння ёсць іншыя ідэі: ад прыбірання кватэр да ўтрымання гасцініцы для хатніх жывёл. Можна навучыцца асновам вядзення бізнэсу, адкрыць сваю справу альбо пашырыць яе. Дзяржава гатовая даць на гэта беспрацэнтныя пазыкі.

Цяпер упершыню створаны беспрэцэдэнтныя ўмовы для прадпрымальнікаў і малога бізнэсу, калі практычна без падаткаў яны могуць займацца рэалізацыяй на экспарт беларускай прадукцыі. Сёння можна без доўгага афармлення дакументаў узяць неліквідную прадукцыю на прадпрыемстве і прадаць яе. Ну чаму не? Было б жаданне!

Арыенцір на дабрабыт

— Чаму цяпер Магілёўская вобласць пляцецца ў хвасце таблiцы заробкаў у Беларусі і ці зменіцца такое становішча?

— Тут прычыны ад прыродна-кліматычных да адміністрацыйна-тэрытарыяльных, і атрымліваецца, што ў нас сярэдні заробак сапраўды меней за іншыя рэгіёны. Але гэта розніца ўсяго ў некалькі тысяч рублёў.

Прычына апошняга месца — у структуры эканомікі рэгіёна. У нас няма, як у іншых абласцях, нафтаперапрацоўкі, і энергетыка, і банкаўская сфера маюць меншую ўдзельную вагу. Прамысловыя прадпрыемствы рэспубліканскага маштабу — напрыклад, Белшына і металургічны завод — сур'ёзна адсталі летась ад сярэднеабласных паказчыкаў. Ад крызісу дала збой каперацыя: можа таму што многае было надумана і неэфектыўна. Патэнцыял у нас ёсць, усё будзе залежаць ад працы прадпрыемстваў.

Узорам тут могуць стаць нашы моцныя сельскія гаспадаркі, дзе працуюць добрыя кіраўнікі, а даяркі атрымліваюць не 200, а 500 долараў. Яны выстаялі ў крызіс, хоць былі ў такіх жа ўмовах, як і іншыя.

Так што многае залежыць і ад цябе канкрэтна. Калі ты не на вуліцу бегаеш, каб патрабаваць большыя заробкі, а добра выконваеш сваю работу, то абавязкова будзе плён. Гэта датычыцца ўсіх здаровых і ініцыятыўных людзей.

— Як вам падаецца, ці добра, што заробак не рэгулюецца самастойна, а менавіта дзяржава ставіць перад суб'ектамі гаспадарання арыенцір?

— Добра. Калі мы кажам пра нейкую планку, то мы не проста дэкларуем. Гэта як у гадзінніку, дзе адзін механізм прымушае круціцца ўсе іншыя. Канчатковы вынік — дастойнае жыццё. Нездарма Прэзідэнт і ўрад абвясцілі сёлета Год якасці. Калі размова ідзе пра якасць жыцця, то заробку лагічна надаецца вялікая ўвага. Таму 500 долараў — арыенцір для ўсіх, і гэта правільна.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

РОЖКІ ДЫ НОЖКІ

Толькі шкура і галава быка, напярэдадні выкрадзенага невядомым злодзеем з малочнатварнай фермы КСУП «Людзяневічы», былі знойдзены ў лесе недалёка ад вёскі Вялікія Сцяблевічы Жыткавіцкага раёна.

А вось у Хойніцкім быццам бы з мэтай продажу каня трое невядомых зайшлі да гаспадароў у вёсцы Карчавое. Але ж у доме яны збілі 70-гадовую жанчыну і ніяк не чакалі, што яе 45-гадовы сын не толькі акажа супраціўленне, але і затрымае аднаго са злачынцаў. Астатнія знікні на аўтамашыне «Жыгулі». Як паведамляюць у прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, у ходзе ўведзенага спецплана па перахопе, арганізаванага ў Рэчыцкім, Калінкавіцкім, Брагінскім, Лоеўскім і Хойніцкім раёнах, злымыснікі былі затрыманы ля вёскі Бязуеў супрацоўнікамі ДАІ Рэчыцкага раёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Я ЗНАЙШЛА СВАЙГО ПРАДЗЕДА

— Ён быў застрэлены, калі спрабаваў уцячы з канцэнтрацыйнага лагера, — гаворыць праўнучка ваеннапалоннага Паўла Алампіева Лілія Завадская.

Разам з бацькам і бабуляй Ганнай Базылевай яны прыехалі ў Гомель з вёскі Карма Добрушскага раёна. І вось яна ў руках — тонкая зялёная папка. У ёй — лёс іх бацькі, дзеда, прадзеда: «Трапіў у палон 6 красавіка 1941 года ў раёне Ашмянаў. 6 мая 1942 года расстраляны за нападзенне на вартавога. Пахаваны ў польскім горадзе Стандарт-Шчэцінскі». Цяпер гэтыя чатыры аркушы паперы стануць сямейнай рэліквіяй. Шкадуюць вось толькі, што жонка Паўла Алампіева не дажыла да гэтага моманту. А вось дзеці збіраюцца наведаць магілу свайго продка.

Здаецца, лёсы ваеннапалонных падобныя, як кроплі вады. І рэакцыя аднолькавая... Вось і сталая Вера Цубатава з Веткі плача, калі расказвае, як шукалі звесткі па бацьку.

— У канцы вайны прыйшла пахаванка, што прапаў ён без вестак. Аказваецца, гэта не так. Мы ведалі, што ён загінуў, але думалі, што на радзіме. Аказалася — у Польшчы, у канцэнтрацыйным лагеры.

— З нашай вёскі адзін мужык вярнуўся, — гаворыць Ніна Шумак з Мазыра. — Ён расказваў, што разам з маім бацькам Мікітам Мажанавым трапіў у палон. Той прапанаваў уцячы з цягніка, а бацька адмовіўся, адказаў: «І так заб'юць, і так заб'юць».

— Плакала, калі даведалася, — і зараз скрозь слёзы расказвае Кацярына Раманенка. — Вось фотаздымак бацькі — я яго ніколі не бачыла... Ён пайшоў на вайну, калі я была вельмі маленькай.

— Ведаеце, чалавек жывы, пакуль пра яго памятаюць, — разважае Аляксандр Гудкоў, унук былога вязня Асвенціма Ілыі Бондарава. — Мы атрымалі дзве пахаванкі — пра тое, што прапаў без вестак, і пра тое, што загінуў у палоне. Звярталіся ў цэнтральны архіў Міністэрства абароны ў 80-я гады, але канкрэтна не было вядома, дзе ён загінуў. Соф'я Ульянаўна, яго жонка, не паспела даведацца пра лёс свайго мужа, шкада...

Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублкі Беларусь перадае сем'ям загінулых у нямецкім палоне салдат копіі архіўных дакументаў. Цяпер іх атрымалі сваякі амаль 200 жыхароў Гомельскай вобласці, што без вестак прапалі ў нямецкім палоне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Нарэшце стала магчымым даведацца пра даты смерці і месцы пахаванняў некаторых з былых вайскоўцаў Савецкай Арміі. Гэтая інфармацыя не страціла сваёй актуальнасці і праз 65 гадоў, хоць весткі радаснымі назваць ніяк нельга.

Колькі яшчэ ў Беларусі сем'яў, якія дагэтуль жывуць чаканнямі і надзеямі — невядома. Пошукавыя работы ў нацысцкіх архівах на працягу 8 гадоў вядуцца КДБ Беларусі і нямецкай арганізацыяй «Саксонскія мемарыялы». За гэты час даследчыкі апрацавалі больш за 20 тысяч трафейных нямецкіх картак і пралілі святло на лёсы 12 тысяч ваеннапалонных — ураджэнцаў нашай краіны.

— У нас у базе звестак, якая знаходзіцца ў інтэрнэце на сайце www.dokst.ru, каля 800 тысяч чалавек, — гаворыць доктар Клаус-Дзітэр Мюлер — кіраўнік праекта і цэнтра дакументацыі аб'яднання «Саксонскія мемарыялы» з германскага горада Дрэздэн. — Можна правадзіць пошук па нацыянальнасці «беларус» або па месцы нараджэння «тэрыторыя Беларусі». Мы можам упэўнена сцвярджаць, што знойдзена не больш за палову. Большую частку архіваў трэба яшчэ апрацоўваць. Мы думаем, што яшчэ неабходна як мінімум 10 гадоў, каб апрацаваць дакументы, якія захоўваюцца ў архівах Расіі, Беларусі і Украіны, іншых дзяржаў былога СССР і Заходняй Еўропы, і стварыць адзіную базу звестак. Мы выходзім з таго, што на тэрыторыі рэйха і часткова акупаваній тэрыторыі ў палон трапіла каля 5 мільёнаў чалавек і 3 мільёны загінула. Сённяшняя база ўтрымлівае звесткі пра 800 тысяч чалавек, значыць, яшчэ больш паловы шляху не пройдзена.

Пошукавая работа вядзецца па сустрэчных напрамках, бо вайскоўцы траплялі ў палон як з савецкага, так і з нямецкага боку. Намеснік начальніка ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці Аляксандр Цітоў падкрэслівае, што гэта ўнікальны праект.

— У ім атрымалася аб'яднаць звесткі з архіваў Германіі, Расіі, Украіны і Беларусі. На сённяшні дзень у выніку гэтага праекта вызначаны лёс каля 12 тысяч ваеннапалонных, з іх 2300 — ураджэнцы Гомельшчыны. Доўга не падыходзілі да гэтай катэгорыі — ваеннапалонных: яны лічыліся без весткі зніклыя. Цяпер мы павінны аддаць доўг памяці і ім. Многія з іх праяўлялі ў баях гераізм і мужнасць, многія працягвалі супраціўленне і ў лагерах. Некаторыя спрабавалі ўцячы з палону.

Прозвішчы сваіх загінулых сваякоў многія з тых, хто прыехаў на сустрэчу, знайшлі ў рэгіянальных газетах. Начальнік аддзела Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь Ігар Валаханоўіч расказвае, што людзі тэлефанавалі пастаянна.

— Многія ў гэтых спісах знайшлі сваіх. Цяпер людзі на рукі атрымалі копіі дакументаў — гэта нямецкія трафейныя карткі ваеннапалонных, дзе ёсць інфармацыя пра тое, дзе чалавек трапіў у палон і што з ім стала, дзе загінуў, дзе пахаваны. Карткі такія захоўваліся ў архівах органаў дзяржаўнай бяспекі, цэнтральным ці па рэгіёнах. Работа працягваецца, яе можна адсачыць на афіцыйным сайце камітэта.

Праект па ўстанаўленні лёсаў вайскоўцаў, якія трапілі ў палон у гады вайны, не закрыты. Напярэдзе сустрэчы з сотнямі жыхароў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, якія так доўга чакалі весткі з мінулага. А тыя, хто яе ўжо знайшоў, магчыма, змогуць наведаць у юбілейны год Перамогі магілы сваіх бацькоў — у Бухенвальдзе, Дахау, Асвенціме... Тым больш што для сваякоў ваеннапалонных гэта можна зрабіць па бясплатнай візе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.

ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ МАЛАДЫМ ДЭПУТАТАМ?

Маладыя дэпутаты з глыбінкі і тыя, хто сёлета вырашыў пазмагацца за дэпутацкія мандаты, стануць удзельнікамі шоу ў Глыбоцкім гарадскім цэнтры культуры.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Глыбоцкім раённым камітэце БРСМ, на ток-шоу «Ці лёгка быць маладым дэпутатам?»запрошаны і адказныя работнікі раённай вертыкалі ўлады. Падчас цікавай нефармальнай акцыі маладыя дэпутаты падзеляцца вопытам работы па вырашэнні праблем людзей, змогуць узняць састарэлыя праблемы. А маладым кандыдатам у прадстаўнікі ўлады, безумоўна, будзе цікава пачуць карысныя парады і наогул уявіць, што іх чакае, калі выберуць. Шоу запланавана правесці 24 сакавіка.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Бацькі і дзеці

ВЫПРАВІЛІСЯ, А ЛЮБОЎ ДЗЯЦЕЙ НЕ ВЯРНУЛІ

Бацькі чатырох маленькіх дзетак у глыбінцы некалькі гадоў таму былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Малыя дзеці — сын і тры дачкі — пасля гэтага выхоўваліся ў трох розных прыёмных бацькоў. Прайшло чатыры гады. Бацькі — Мікалай і Наталля Мікалаевы (прозвішча змененае), якіх пазбавілі права гадаваць дзяцей, вылечыліся ад алкагалізму, уладкаваліся на працу. Праз суд захацелі зноў стаць законнымі бацькамі. Ды не атрымалася.

Гэта сумная гісторыя, бадай, тыповая. Праўда, не ўсе выпівохі здольныя «завязаць» і кардынальна змяніць свой лад жыцця. А пачынялася ўсё прыкладна так. Сям'я пражывала ў трохпакаёвай добраўпарадкаванай кватэры. У сувязі з пастаянным п'янствам Мікалаевы доўгі час нідзе не працавалі. Уся сям'я жыла на пенсію бацькі Мікалая. У кватэры збіраліся кампаніі выпівох. Да глыбокай ночы пілі. Выхаваннем дзяцей бацькі не займаліся. За няплату камунальных плацяжоў у кватэры адключылі электрычнасць і водазабеспячэнне. Дзеці суткамі хадзілі нямытымі і галоднымі. У 2005 годзе Мікалая і Наталлю пазбавілі бацькоўскіх правоў. І абавязалі кампенсаваць дзяржаве выдаткі на гадаванне іх дзяцей.

Пасля ўваходжання рашэння суда ў законную сілу сын Мікалай, якому было пяць гадоў, і дачка, 4-гадовая Вера, былі перададзены на выхаванне ў прыёмную сям'ю. Дачка Алена ў двухгадовым узросце стала гатавацца ў прыёмнай маці. Самая малодшая дзяўчынка Галя таксама атрымала новую сям'ю.

Праз чатыры гады Мікалаевы звярнуліся ў суд з іскам аб аднаўленні бацькоўскіх правоў. Пры абследаванні ўмоў іх жыцця ўстанавілі, што ў кватэры зроблены рамонт, пакоі абсталёваны ўсёй неабходнай мэблю, халадзільнік поўны прадуктаў. Мікалаевы працуюць. Прайшлі курс лячэння ад алкагалізму. З месца працы характарызуюцца станоўча. Муж і жонка поўнасцю разлічыліся за камунальныя даўгі. Адным словам усе ўмовы для жыцця дзяцей створаныя.

Але на працягу чатырох гадоў выхавання дзеці шчыра палюбілі новых маму і тату. І, безумоўна, гэта было б немагчыма без любові з іх боку.

Прыёмная маці Алены на судзе ўспомніла, што, калі забірала дзяўчынку з бальніцы, ёй тады было ўсяго паўтара года, Лена не размаўляла, баялася людзей. У першыя некалькі гадоў хавала ежу. Цяпер ужо гэта зусім іншая дзяўчынка. Прыёмную маму называе «мамай». Ведае, што ёсць родная мама, але вяртацца да яе жыць не хоча. За час знаходжання Лены на выхаванні ў прыёмнай сям'і Мікалаевы не звярталіся ў органы апекі і апякунства з просьбай дазволіць ім сустракацца з дачкой, не цікавіліся яе лёсам, нічога не ведаюць пра яе характар, звычкі.

У перыяд разгляду справы ў судзе педагогі арганізавалі сустрэчу біялагічных бацькоў з дзецьмі. Сустрэча была напружанай. Дзеці стараліся не глядзець у вочы родным бацькам. І хоць апошнія былі вельмі дабрадушнымі, дзеці баяліся браць прывезеныя ім цукеркі. Па настрої дзетак, з іх размоў адразу было зразумела, што яны не хочуць вяртацца да родных бацькоў.

Суд прыйшоў да высновы, што, хоць Мікалаевы і змянілі свае паводзіны, лад жыцця, але іх просьба вярнуць дзяцей не адпавядае інтарэсам апошніх, можа адмоўна паўплываць на маральны стан дзяцей, прывесці да негатыўных наступстваў.

Як расказала «Звяздзе» **Вера УЛАСЕНКА, пракурор аддзела па наглядзе за адпаведнасцю закону судовых пастаноў па грамадзянскіх справах пракуратуры Віцебскай вобласці**, рашэннем суда Першамайскага раёна Віцебска Мікалаевым было адмоўлена ў задавальненні заявы аб аднаўленні ў бацькоўскіх правах. Між іншым, у касацыйным парадку рашэнне суда не абскардзілі. Значыць, і не вельмі хацелі змагацца за сваіх дзяцей, выкарыстоўваючы ўсе магчымасці? Або зразумелі, што сталі сваім родным дзецям чужымі бацькамі?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

На шчупака — пастка, а на дзіка — пятля

У сакавіку пачынаецца нераставанне шчупака, і лавіць гэтую рыбу на працягу месяца забаронена, але сёлета нераст можа расцягнуцца на больш працяглы тэрмін.

ЗАБАРОНА існуе, але калі берагі рэк пад снегам, а мароз у межах мінус 5-10, то пра нераставанне шчупака гаварыць рана. А вось калі рэкі выйдуць з берагоў і лугі апынуцца пад вадой, то рыба выйдзе на больш плыткія месцы для нерасту.

У гэты перыяд шчупакі збіраюцца групамі і кладуць ікру ды малакі. На працягу нерасту шчупакі даволі безабаронныя перад чалавекам, і браканьеры выкарыстоўваюць гэты момант. На лодках ціха падплываюць да нерасцілішча і б'юць шчупака восцямі ці падкрадаюцца да рыбы ў высокіх рыбалоўных гумоўцах.

І справа не толькі ў асобным шчупаку, якога здабыў браканьер. Калі падчас адкладвання ікры і яе апладнення рыбу патрывожыць, то нераставанне спыняецца і прыродзе наносяцца вялікія страты.

Цяпер акрамя восцяў браканьеры выкарыстоўваюць і пасткі. Як падзеі будуць развівацца сёлета, неўзабаве будзем ведаць, а ў сакавіку мінулага года на Брэстчыне са шчупакамі асабліва не цырымоніліся, толькі на вадасховішчы Лактышы было канфіскавана 50 пастак, а двое браканьераў атрымалі па 50 базавых велічыняў штрафу.

Дарэчы, за кожнага злоўленага шчупака ў час нерасту давядзецца заплаціць па 3 базавыя.

Тым не менеў у Баранавічах на цэнтральным рынку шчупакоў прадавалі. Не скажу, што адкрыта, але на прылаўку сярод сушанай рыбы ляжалі вялікія з адвіслымі жыватамі — можа, з ікрой ці малаком.

Калі ў аматараў рыбы браканьерскі сезон яшчэ напярадзе, то жадаючых ухапіць незаконна дзічыны хапае.

Сезон паляванне ўжо закончыўся і браканьеры (не ўсе), адклаўшы стрэльбы, узяліся за петлі. Гэты від браканьерства ціхі і не прыцягвае ўвагі, як стрэл з дубальтоўкі.

Паводле інфармацыі Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету, у гэтым плане асабліва вызначыўся жыхар в. Целякова. Супрацоўнікі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі сумесна з дырэктарам Уздзенскага таварыства паляўнічых і рыбаловаў знайшлі ў лесе 82 пятлі з дроту. Некаторымі петлямі карысталіся даўно, яны нават ураслі ў ствалы дрэў. Па слядах інспектары і супрацоўнікі міліцыі пайшлі ў вёску і знайшлі ў браканьера мяса і шкуры казулі ды зайца.

А работнікі Быхаўскай міжрайінспекцыі сумесна з міліцыянерамі ў лесе каля в. Шаламы-2 выйшлі на месца, дзе з дапамогай петляў былі здабытыя два дзікі. Браканьерам аказаўся мясцовы жыхар. У яго знайшлі разабраныя тушы і самаробныя петлі.

Страты, нанесеныя прыродзе, ацэнены ў 120 базавых велічынь.

Але не толькі петлі ставяць браканьеры на лясных сцежках. Бывае, звяры падаюць у лоўчыя ямы ці гінуць ад розных самапалаў.

Здаралася, што з пятлі даставалі паросных самак дзікоў. А затрымаць браканьера, які правярае петлі ў лесе, няпроста. Доказаў ніякіх пры ім няма — выйшаў чалавек прагуляцца.

Калі грамадскасць не лічыць браканьерства вялікім злом і на шчупакоў, здабытых падчас нерасту, ёсць пакупнік, то навесці парадак складана.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пра «слоўныя выказванні» і звычайныя чалавечыя стасункі

Адказ з каментарам

У нумары «Звязды» за 9 лютага пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў змешчаны матэрыял «Дзе гэта вуліца, дзе гэты дом?» з падзагалоўкам «У Калюжках вяскоўцы мусілі аплаціць расчыстку дарог са сваёй кішэні». Нагадаем коратка, што прысвечаны ён быў скарзе Тамары Васільеўны Ждановіч са згаданай вёскі, якая наракала, па-першае, на тое, што яны з мужам, нягледзячы на папярэднія звароты, дагэтуль не ведаюць уласнага адраса, па-другое, мусілі самі заплаціць 100 тысяч рублёў трактарысту за расчыстку дарогі, паколькі нанятая сельскім Саветам тэхніка ўсё ніяк не магла дабрацца пасля вядомых снегападаў да іх жылля. Пайсці на такі крок людзей прымусілі наступныя абставіны (гэта важна нагадаць, паколькі яны тлумачаць занепакоенасць сям'і). Сама Тамара Васільеўна — гіпертонік, калі б нешта здарылася, нават «хуткую дапамогу» людзі не змаглі б выклікаць (ды і зноў жа — куды, калі адрас невядомы?). А яшчэ незадоўга да згаданых падзей з заяўніцай пражываў яе 86-гадовы бацька, інвалід вайны, які потым лёг у шпіталь.

І вось на тую публікацыю мы атрымалі афіцыйны адказ са Смалявіцкага райвыканкама. Шчыра скажам, ён выклікаў пэўнае здзіўленне. Чамусьці склалася ўражанне, што не ў сітуацыі спрабавалі разабрацца, а даказаць і заяўніцы, і нам, што ўсё ішло «па графіку» (караценькая вытрымка з далейшага адказу). Таму мы палічылі неабходным даць яго з рэдакцыйным каментарам. Падставай для яго сталі дадатковыя размовы з нашай заяўніцай, якія адбыліся двойчы — адразу пасля выхаду матэрыялу і пасля атрымання адказу з райвыканкама.

«4.02.2010 года паміж Жодзінскім сельвыканкамам і ДРБУ-123 быў заключаны дагавор на выдзяленне тэхнікі для расчысткі вуліц ад снегу ў вёсках, размешчаных на тэрыторыі сельсавета. У гэты дзень былі расчышчаны цэнтральныя вуліцы ў вёсках: Бабін Лес, Арлова, Тачылішча, Замлынне, Расошнае, Белая Лужа, Паддуб'е, Прыбор'е, Ялавіца, Калюжкі. Вуліцы ў вёсках расчышчаліся, зыходзячы з катэгарыйнасці. Праезды ў вёсках, пад'езды да іх павінны былі расчышчацца ў апошнюю чаргу і выдзяленне тэхнікі для гэтых мэтаў было запланавана на 9.02.2010 года.

9.02.2010 года паміж Жодзінскім сельвыканкамам і ДРБУ-123 дадаткова быў заключаны дагавор для расчысткі пад'ездаў, праездаў у вёсках сельскага Савета, а таксама ў мікрараёнах новай забудовы, а менавіта: у мікрараёне паблізу в. Калюжкі і мікрараёне паблізу в. Паддуб'е. Вышэйназваныя работы па расчыстцы ад снегу прылеглых або другасных дарог былі праведзены ў адпаведнасці з запланаваным графікам і ў тэрмін».

А Тамара Васільеўна настойвае, што на той момант прынамсі дарогу да яе дома ўжо не трэба было расчышчаць, бо гэта зрабіў наняты трактарыст. І сведка-сусед гатовы тое пацвердзіць. Можна яшчэ нагадаць, што напярэдадні за цэлы тыдзень жанчына некалькі разоў звярталася ў сельскі Савет з пытаннем: калі ж з'явіцца тэхніка для расчысткі. І ёй ніводнага разу не сказалі, што 9 лютага, хоць «выдзяленне тэхнікі для гэтых мэтаў было запланавана». Можа, тады і згаданай сітуацыі не ўзнікла б? Ведаеце, практыка паказвае, што даволі часта пазбегнуць канфлікту дапамагаюць своечасова сказаная адным бокам добразычлівыя словы, і яны ж — пачутыя другім. Дарэчы, адноўкавыя, калі хто заўважыў, даты — выхаду матэрыялу ў газеце і «дадаткова заключанага дагавора» — мы схільныя лічыць простым супадзеннем.

«Па факце прысваення паштовага адраса жылому дому, які на праве ўласнасці належыць мужу Ждановіч Т.В., паведамляем, што рашэннем сельвыканкама ад 29.12.2009 года прысвоены паштовы адрас жылому дому з пазнакай нумара дома і наймення завулка ў в. Калюжкі (зав. Магістральны, 1).

У сваім звароце ў газету «Звязда» Ждановіч Т.В. паведаміла, што пражывае і з'яўляецца жыхаркай в. Калюжкі разам са сваім мужам, аднак ні яна, ні яе муж у в. Калюжкі пастаянна не пражываюць і не маюць часовай рэгістрацыі. Вышэйназваныя грамадзяне зарэгістраваныя па адрасе ў Жодзіна».

Гэтыя словы Тамара Васільеўна парыравала лаканічна: «а як мы маглі зарэгістравацца, калі не ведалі свайго ўласнага паштовага адрасу?» Цікава, той, хто складаў афіцыйны адказ, сам змог бы зарэгістравацца ў падобных умовах? Называючы сябе жыхаркай вёскі Калюжкі, наша заяўніца гаварыла пра сваё фактычнае месца пражывання на той момант.

«На выказванні Ждановіч Т.В. пра тое, што каля трох месяцаў таму яна звярнулася ў сельвыканкам наконт прысваення адрасу, паведамляем, што заява аб прысваенні паштовага адрасу жылому дому, што належыць мужу заяўніцы, паступіла ў сельвыканкам 3.12.2009 года. Сесіяй сельскага Савета дэпутатаў 29.12.2009 года было вынесена рашэнне аб прысваенні назвы завулку ў в. Калюжкі, па якім размешчаны жылы дом мужа заяўніцы. Пасля чаго было вынесена рашэнне сельвыканкама аб прысваенні нумара дому. Заява Ждановіч Т.В. была разгледжана ў месячны тэрмін без парушэнняў тэрмінаў».

Тамара Васільеўна гатовая паспрачацца наконт тэрмінаў, але гэта не самае галоўнае.

— Так, сапраўды, рашэнне сельвыканкамам было прынятае 29 снежня мінулага года. Але ж мы пра яго не ведалі! Нам ніхто — ні вусна, ні пісьмова — пра тое не сказаў! Затое як выйшаў матэрыял у «Звяздзе» 9 лютага гэтага ўжо года, мужу літаральна праз дзень патэлефанавалі і сказалі, што жыллю прысвоены паштовы адрас, — распавяла ў тэлефоннай гутарцы наша заяўніца.

Зноў

г. ВИТЕБСК 15.04.2010

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Здание мастерской, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Боровая, д. 9, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 250/С-27778 (здание специализированное коммунального хозяйства – здание мастерской), одноэтажное кирпичное, 1985 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша рулонная, общая площадь 98,5 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000001001207, площадь 0,0923 га для содержания и обслуживания здания мастерской, срок аренды 25 лет. Использование – под специализированное здание здравоохранения и предоставления социальных услуг.	49594309	4959430
СО СНИЖЕНИЕМ НА 20 ПРОЦЕНТОВ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА				
2	Здание бывшего пункта централизованного наблюдения, расположенное по адресу: Витебская область, Миорский район, г. Дисна, ул. Советская, 10, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 211/С-8654 (здание неустановленного назначения – пункт централизованного наблюдения), одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, общая площадь 36,7 кв.м, объем 152 куб.м, фундамент б/бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша а/волнистая. Земельный участок: с кадастровым номером 223351000001000037, площадь 0,0133 га для размещения административного здания, срок аренды 50 лет.	10350204	1035020
3	Административное помещение, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский район, г. Браслав, ул. Советская, 4, помещение 2, и здание специализированное автомобильного транспорта, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский район, г. Браслав, ул. Советская, 4, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: - изолированное помещение с инвентарным номером 210/D-2038, общая площадь 118,3 кв.м, объем 470 куб.м, стены бревенчатые, перекрытие деревянное, крыша а/волнистая; - капитальное строение с инвентарным номером 210/С-11692 (одноэтажное п/блочное), общая площадь 33,9 кв.м, объем 94 куб.м, фундамент бутобетонный, перекрытие деревянное, крыша а/волнистая. Земельный участок: с кадастровым номером 220850100002000024, площадь 0,0232 га для обслуживания недвижимого имущества, срок аренды 40 лет. Назначение – для размещения административно-производственного объекта. Использование – для размещения административно-производственного объекта.	41228670	4122867
4	Неиспользуемые капитальные строения: здание административно-хозяйственное с колодцем и асфальтобетонным покрытием и сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, расположенные по адресу: Витебская область, Бешенковичский район, г.п. Бешенковичи, ул. Володарского, 49, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8416 – одноэтажное бревенчатое здание, фундамент бутовый, перекрытия деревянные утепленные, крыша шиферная, общая площадь 128,9 кв.м, 1988 г. постройки; - пристройка кирпичная; - холодная пристройка кирпичная; - колодец, ж/б кольца; - дворовое покрытие – асфальт, общая площадь 776 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8415 – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бутовый, перекрытия железобетонные, крыша шиферная, общая площадь 75,4 кв.м, 1988 г. постройки. Земельный участок: площадью 0,1468 га для обслуживания административного здания и построек, кадастровый номер 220555100001001826, срок аренды – 55 лет. Ограничения в использовании земельного участка – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадью 0,0230 га, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В площадью 0,0096 га. Использование – для обслуживания административного здания и построек.	61087286	6108728
СО СНИЖЕНИЕМ НА 50 ПРОЦЕНТОВ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА				
5	Неиспользуемое недвижимое имущество, расположенное по адресу: Витебская область, Городокский район, дер. Вировля, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение – мастерская (инв. № 201/С-837), двухэтажное кирпичное с навесными ж/б панелями общей площадью 587 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная, водопровод, канализация, отопление местные, электроосвещение; - капитальное строение – насосная (инв. № 201/С-10545), одноэтажное кирпичное здание общей площадью 47,5 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная; - капитальное строение – склад (инв. № 201/С-10544), одноэтажное здание, стены кирпичные, сборные ж/б панели общей площадью 435,6 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная; - капитальное строение – административное здание, столовая с асфальтобетонными площадками возле здания (инв. № 201/С-10540), двухэтажное кирпичное здание общей площадью 513 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная, водопровод, канализация, отопление местные, электроосвещение; - капитальное строение – котельная с металлической трубой (инв. № 201/С-824), одноэтажное кирпичное общей площадью 154 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная, водопровод, канализация местная, электроосвещение; - капитальное строение – весовая с гаражом, ограждением и воротами (инв. № 201/С-10542), одноэтажное кирпичное здание общей площадью 128,4 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная; - капитальное строение – корпус грохочения с галереей, площадкой под галереей бетонной (инв. № 201/С-838), одноэтажное, стены – стальные и асбестоцементные листы по металлическому каркасу, кирпичные общей площадью 1048 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша – асбестоцементные листы; - капитальное строение – трансформаторная (инв. № 201/С-10543), одноэтажное здание, стены кирпичные общей площадью 52,3 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша совмещенная рулонная; - капитальное строение – корпус третичного дробления (инв. № 201/С-10541), одноэтажное, стены – асбестоцементные листы по металлическому каркасу общей площадью 192 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент ж/б, крыша – асбестоцементные листы; - капитальное строение – корпус вторичного дробления с тремя галереями (инв. № 201/С-836), одноэтажное, стены – стальные листы по металлическому каркасу, кирпичные общей площадью 784 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша – асбестоцементные листы; - капитальное строение – корпус первичного дробления с галереей (инв. № 201/С-839), одноэтажное, стены – стальные листы по металлическому каркасу, кирпичные общей площадью 427 кв.м, 1994 г. постройки, фундамент и перекрытия ж/б, крыша – асбестоцементные листы; - очистные сооружения (инв. № 201/С-11125), артскважина бесфильтровая глубиной 86 м (инв. № 201/С-11133), ограждение металлическое 66,28 п.м (инв. № 201/С-11134), водонапорная башня металлическая емкостью 15 куб. м (инв. № 201/С-11127), емкость металлическая для дизельного топлива объемом 16 куб. м (инв. № 201/С-11120), емкость металлическая для дизельного топлива объемом 16 куб. м (инв. № 201/С-11122), емкость металлическая для дизельного топлива объемом 16 куб. м (инв. № 201/С-11119), емкость металлическая для дизельного топлива объемом 16 куб. м (инв. № 201/С-11121), емкость металлическая для бензина объемом 14 куб. м (инв. № 201/С-11123), емкость металлическая для бензина объемом 14 куб. м (инв. № 201/С-11124), противопожарный резервуар железобетонный емкостью 150 куб. м (инв. № 201/С-11126), сети электроснабжения протяженностью 3405 метров (инв. № 201/С-11131), слаботочные сети протяженностью 85 метров (инв. № 201/С-11132), водонапорные сети протяженностью 420 метров (инв. № 201/С-11130), канализационные сети протяженностью 258 метров (инв. № 201/С-11129), тепловая сеть протяженностью 22 метра (инв. № 201/С-11128). Земельный участок с кадастровым номером 221881801101000001 площадью 10,6612 га для содержания и обслуживания объектов недвижимости сроком аренды 99 лет. Ограничения в использовании 0,2483 га – охранные зоны линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт.	1633731489	163373148

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ: Лота № 1 – Государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», телефон в Витебске (0212) 36 93 52.; Лотов №№ 2, 3, 4 – Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактный телефон в г. Витебске (0212) 48 76 87; Лота № 5 – Республиканское унитарное предприятие «Дорстройиндустрия», телефон в г. Минске: (017) 167 27 37.

Условия продажи единого предмета аукциона:

Лот № 1:

- заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с Полоцким горисполкомом и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок после получения решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет;

- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Лот № 2:

- заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка.

Лот № 3:

- заключение победителем аукциона с Браславским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права аренды на земельный участок, получение право удостоверяющих документов в Браславском бюро Полоцкого филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на реконструкцию или строительство объекта в срок, не превышающий двух лет.

Лот № 4:

- заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка.

Лот № 5:

- заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на реконструкцию объекта в срок, не превышающий 2 года.

1. Аукцион состоится 15 апреля 2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, **без нотариального засвидетельствования**; индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования**; иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 14.04.2010 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 15.04.2010 с 14.00 до 14.45**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 2 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

НА КУБЕ ЗАГІНУЎ СЛОНІМСКІ ПАРАШУТЫСТ АЛЯКСАНДР МАЗЫРКА

У пачатку сакавіка па Слоніме папаўзлі чуткі, што на Кубе забілі слонімскага спартсмена Аляксандра Мазырку

Мне ўдалося знайсці нумар хатняга тэлефона гэтага спартсмена, але на тэлефонны званок так ніхто і не адказаў. Тады прыйшлося звязацца з людзьмі, якія займаюцца парашутным спортам, бо Аляксандр Мазырка займаўся менавіта гэтым відам спорту, любіў аўтастопам падарожнічаць па свеце.

Аляксандр вырашыў аўтастопам праехаць і паглядзець Кубу. 4 студзеня на самалёце ён вылецеў у тую далёкую краіну. Там планаваў на якім-небудзь веласіпедзе праехаць увесь востраў. Нават думаў адтуль махануць на Гаіці, каб дапамагаць пацярпелым ад землятрусу.

«Апошнюю эсэмэску ад Сашы я атрымаў 20 студзеня, — прыгадвае яго сябра Алесь Голуб. — Ён пісаў, што абгарэў на сонцы, але даволі крута адпачывае на Карыбскім моры і пра ўсё раскажа, калі вернецца ў Беларусь».

29 студзеня паведамілі, што Аляксандр Мазырка загінуў. У пасольстве Рэспублікі Беларусь на Кубе сябрам і родным сказалі, што слонімскі юнак падарожнічаў з нейкім кубінцам, які і падазрэецца ў яго забойстве, што забілі беларуса 21-22 студзеня ўначы, калі той спаў. Невядомы выпадак стукнуў Аляксандра каменем па галаве — магчыма, з-за рэчаў, якія Аляксандр Мазырка браў з сабой: тэлефон, фотаапарат і адзенне. Як мы ведаем, на Кубе толькі нядаўна з'явіліся тэлефоны і мабільная сувязь, але яны там вельмі дарагія.

Аляксандру Мазырку быў 31 год. Ён нарадзіўся ў Зэльве, скончыў там школу. «Мы з дзяцінства з ім марылі пра тое, як будзем служыць у якім-небудзь спецназе, скакаць з парашутам, — прыгадвае Алесь Голуб. — У студзені 1997 года мяне прызвалі ў войска, а Саша ўжо вучыўся ў Беларускай політэхнічнай акадэміі. Неўзабаве я ад яго атрымаў ліст, дзе Саша апісваў, як ён першы раз скокнуў з парашутам у мінскім аэраклубе. Я вырашыў, што таксама хутка скокну з парашутам. Летам я прыехаў паступаць у ваенную акадэмію і быў здзіўлены, калі ля прыёмнай камісіі ўбачыў Сашу Мазырку. Я памятаю, як ён марыў стаць ваенным лётчыкам і лятаць на самалётах, але тады ён быў студэнтам політэхнічнай акадэміі, дый вучыўся ён на спецыяліста па рамонце і эксплуатацыі лятальных апаратаў. Але Саша не паступіў у ваенную акадэмію — не прайшоў медкамісію. Бяда ў тым, што да таго моманту ён ужо быў спартсменам-парашутыстам, і яму для працягу сваёй спартыўнай кар'еры патрэбна была тая самая камісія, а прайсці яе ён ужо не змог бы».

Але Аляксандр Мазырка не спыняўся і не адчайваўся. Са здароўем у яго ўсё было добра. Праўда, трохі падводзіў зрок. Калі быў студэнтам, ён не толькі вучыўся, але займаўся парашутным спортам, працаваў вадзіцелем-перагоншчыкам у аўтапарку, вартаўніком на будоўлі, захапляўся таксама кікбоксінгам і плаваннем. «Мала хто сёння з людзей можа такім пахваліцца — ён не хваліўся, ён хацеў паспець усё», — успамінае Алесь Голуб.

Пасля заканчэння акадэміі Аляксандра Мазырку прызвалі ў армію ў спартроту, каб ён і ў войску займаўся сваім любімым парашутным спортам. Аляксандр у апошнія гады жыў у Слоніме, але лёс яго кідаў па ўсім свеце. Ён быў рамантыкам і аптымістам...

Аляксандра Мазырку пахавалі на зэльвенскіх могілках...

Сяргей ЧЫГРЫН.

Конкурс

За дасягненні ў галіне якасці — прэміі ўрада

Аб'яўлены 12-ы конкурс на сушканне Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці. Пачынаючы з 1999 года, лаўрэатамі прэміі стала 171 арганізацыя.

Прэтэндаваць на сушканне прэміі могуць юрыдычныя асобы незалежна ад формы ўласнасці. Прэмія прысуджаецца арганізацыям з колькасцю працуючых да 250, ад 250 да 1500 і звыш 1500 чалавек. Кірункі дзейнасці — вытворчасць нехарчовых тавараў бытавога прызначэння, харчовых тавараў і сельскагаспадарчай прадукцыі, прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння (акрамя ўзбраення і ваеннай тэхнікі), аказанне паслуг і выкананне работ. Галоўнымі крытэрыямі ўдзелу ў конкурсе з'яўляюцца дасягненне значных вынікаў у галіне якасці выкананых работ або аказаных паслуг, павышэнне іх канкурэнтаздольнасці, выкарыстанне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю, укараненне міжнародных стандартаў, задавальненне запытаў спажыўцоў.

Конкурс праводзіцца з улікам сучаснага менеджменту, мадэлі Еўрапейскай прэміі па якасці. Лаўрэаты і дыпламанты вызначаюцца ў два этапы: па выніках праверкі прадстаўленых матэрыялаў і правядзення экспертызы на месцах. Лаўрэатам уручаюцца дыплом і сімвал прэміі, даецца права выкарыстання на працягу пяці гадоў выявы эмблемы прэміі ў маркіроўцы прадукцыі і на яе ўпакоўцы. Штогод друкуецца і каталог лаўрэатаў і дыпламантаў конкурсу, які рассылаецца ў прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь за межамі.

Заявы і матэрыялы для ўдзелу ў конкурсе на сушканне Прэміі неабходна прадставіць да 1 чэрвеня гэтага года ў сакратарыят Камісіі пры Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі. Кансультацыі можна атрымаць у Беларускім дзяржаўным інстытуце стандартызацыі і сертыфікацыі: **г. Мінск, вул. Мележа, 3, тэл. (017) 262 52 54.**

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ЧОРНЫЯ» СПРАВЫ ПАРУШАЛЬНІКАЎ

Паблізу возера Чорнага ў Бярозаўскім раёне інспектары затрымалі трох грамадзян, у аўтамабілі ў якіх былі знойдзены тры мяхі з рыбай агульнай вагой больш за 147 кілаграмаў.

Канфіскаваныя і забароненыя прылады рыбалоўства: дзве сеткі, шэсць сеткавых экранаў і пад'ёмнік. У дачыненні да аднаго затрыманага ўжо заведзена крымінальная справа.

У начны час на рацэ Бобрык паблізу вёскі Муляраўка Петрыкаўскага раёна інспектары затрымалі трактарыста СВК «Агра-Пціч» і жыхара гарпасёлка Капаткевічы. Яны незаконна дабылі 170 асобінаў рыбы, чым нанеслі шкоду прыродным рэсурсам на суму больш за 8,8 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «Белспецконтракт» проводит 5-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности 16 апреля 2010 года

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч (износ).	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
32.	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 142652, дв. 568764	г. Гродно, в/часть 41780	1990	136199	6 000 000	600 000
33.	Автошасси Урал-43202 ш. 087254, дв. 177986	г. Орша в/часть 55083	1987	198980,5	9 000 000	900 000
34.	Рельсы ТВ-62, 379 п.м. 1 кат. (партия 23,5 тонн)	г. Витебск, Журжево в/часть 14848	2004	–	34 110 000	3 411 000
35.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, партия — 5 шт., 3 кат.	г. Бобруйск в/часть 20392	1983	–	1 900 000	190 000
36.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, партия — 10 шт., 4 кат.	г. Бобруйск в/часть 20392	1983	–	3 300 000	330 000
37.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14, партия — 30 шт., 3 кат.	г. Рось в/часть 18555	1978	–	10 500 000	1 050 000
38.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14 партия — 30 шт., 3 кат.	г. Рось в/часть 18555	1978	–	10 500 000	1 050 000
39.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-14, партия — 36 шт., 3 кат.	г. Рось в/часть 18555	1978	–	12 600 000	1 260 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00, **16 апреля 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 14 апреля 2010 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 16 апреля 2010 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com**

МИРСКИЙ ПОСЕЛКОВЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (КОРЕЛИЧСКОГО РАЙОНА ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

Лот-1 — на право заключения договора аренды земельного участка площадью 3,0016 га на 99 лет для строительства и обслуживания гостиничного комплекса в г.п. Мир, ул. Фестивальная, У-1. Кадастровый номер 423355100010010232, начальная цена 393 874 274 белорусских рубля. Ограничение в использовании земель: охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 Вольт площадью 0,7861 га. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в сумме 941 159 белорусских рублей и затраты на объявление в СМИ.

Лот-2 — на право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,7900 га на 99 лет для строительства и обслуживания культурно-развлекательного комплекса в г.п. Мир, ул. Первомайская, 80. Кадастровый номер 423355700001000972, начальная цена 209 465 340 белорусских рублей и потери сельскохозяйственного производства в сумме 5 034 700 рублей. Существует возможность подключения к инженерным сетям. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в сумме 949 399 белорусских рублей и затраты на объявление в СМИ.

Лот-3 — на право заключения договора аренды земельного участка площадью 1,1992 га на 50 лет для строительства и обслуживания комплекса гостевых домиков, базы отдыха в г.п. Мир, ул. Первомайская, 91. Кадастровый номер 423355700001000987, начальная цена 17 032 909 белорусских рублей и потери сельскохозяйственного производства в сумме 49 948 700 рублей. Участок расположен в водоохранной зоне водных объектов вне прибрежной полосы. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в сумме 1 053 916 белорусских рублей и затраты на объявление в СМИ.

Лот-4 — по продаже земельного участка в частную собственность гражданам РБ для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Гродненская область, Кореличский район, Мирский поссовет, д. Прилуки, У-4, площадь участка 0,2500 га. Кадастровый номер 423375707101000055. Начальная цена 70 675 белорусских рублей. Ограничение в использовании земель: водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос 0,2500 га и охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 Вольт на площади 0,0040 га. Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в сумме 859 643 белорусских рубля и затраты на объявление в СМИ.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3600518074265 в ЦБУ № 411 г.п. Кореличи филиала 416 г. Новогрудок ОАО «АСБ Беларусбанк», код 698, УНП 500008202. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения

Аукцион состоится **16.04.2010 года в 15.00** по адресу: Гродненская область, Кореличский район, г.п. Мир, ул. Первомайская, д. 2 (поссовет).

Заявление на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения **до 17.30 9 апреля 2010 года** по адресу: г.п. Мир, ул. Первомайская, д. 2 (поссовет).

ОАО «БОРИСОВБЫТСПЕЦСЕРВИС»

222525, г. Борисов-15, ул. Бр. Вайнрубов, 7

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 г. (млн. руб)

АКТИВ	Код стр.	На начало года	На отчетную дату
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	39	27
Доходные вложения в материальные ценности	130	1	0
Вложение во внеоборотные активы	140	95	96
ИТОГО по разделу I	190	135	123
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	62	60
Дебиторская задолженность	240	0	64
Денежные средства	260	140	239
ИТОГО по разделу II	290	202	363
БАЛАНС (сумма строк 190+290)	390	337	486
ПАССИВ	**Код стр.**	**На начало года**	**На отчетную дату**
III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ			
Уставный фонд (капитал)	410	45	28
Собственные акции, выкупленные у акционеров	411	–	-17
Добавочный фонд	430	18	119
Нераспределенная прибыль	450	101	190
Целевое финансирование	460	90	90
ИТОГО по разделу III	490	254	310
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Кредиторская задолженность	530	83	176
ИТОГО по разделу V	590	83	176
БАЛАНС (сумма строк 490+590)	600	337	486

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2009 г. (млн. руб)

Наименование показателей	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	1400	1176
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ услуг	020	225	199
Себестоимость реализации товаров, продукции, работ, услуг	030	1057	943
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	070	118	34
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы (за минусом НДС, акцизов и аналогичных обязательств платежей)	080	201	180
Операционные расходы	090	11	24
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	160	129
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	0	8
Внереализационные расходы	150	112	61
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	-112	-54
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД	**200**	**166**	**109**
Налог на прибыль, прочие налоги, сборы из прибыли	260, 250	74	46
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ	**300**	**92**	**63**
Информация о дивидендах и акциях			
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	5,00	3,00
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	830,00	296,00
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	24,80	15,40
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	1063	0
Информация о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	0,00	0,00
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	0,00	0,00
Среднесписочная численность работающих	человек	54	54
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):			
Стирка и обработка белья и других изделий, помывка военнослужащих срочной службы			

Достоверность отчета за период с 01.01.2009 по 31.12.2009 подтверждена аудиторским заключением по бухгалтерской (финансовой) отчетности ОДО «Аудитстрой» от 03.02.2010 г.

УНН 600009802.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Кіназала

«Оскар» з жаночым тварам

ГАЛОЎНАЙ уладальніцай «Оскараў» сёлета стала рэжысёр Кэтрын Бігелоў. Менавіта яе ваенная драма «Уладар буры» атрымала статуэтку ў галоўнай намінацыі — «Лепшы фільм». Усяго ж гэтая стужка сабрала 6 «Оскараў», у тым ліку за лепшы сцэнарый, лепшы мантаж, лепшую работу гукарэжысёра і ўласна за лепшую рэжысуру. Між іншым, гэта першы выпадак у гісторыі «Оскара» — раней кінаакадэмікі ніколі не ставілі на п'едэстал жанчын-рэжысёраў.

Былы муж Бігелоў, рэжысёр Джэймс Кэмеран, які з нашумелым фільмам «Аватар» прэтэндаваў ажно на 9 узнагарод Амерыканскай кінаакадэміі, у выніку застаўся ўсяго з 3, дый тое ў тэхнічных намінацыях — за лепшыя спецэфекты, лепшую аператарскую работу і лепшую работу мастака-пастаноўшчыка (але, не забываемся, і з рэкорднымі касавымі зборамі — у сусветным пракаце «Аватар» зарабіў звыш 2,5 мільярдаў долараў ЗША). У суме на экс-сям'ю, зрэшты, «Оскараў» атрымалася якраз 9.

Прыз за галоўную мужчынскую ролю ўзяў Джэф Брыджэс за ролю старога музыканта ў фільме «Вар'яцкае сэрца», а «Оскар» за галоўную жаночую ролю трапіў у рукі Сандры Балак, якая сыграла ў фільме «Нябачны бок» жанчыну, чый прыёмны сын потым стаў славутым футбалістам. Дарэчы, напярэдадні тую ж Сандру Балак прызналі... горшай актрысай года, прысудзіўшы ёй антыпрэмію «Залатая маліна» за фільм «Усё пра Сціва» — прычым актрыса не пабаялася асабіста прыйсці за «ўзнагародай»! «Оскары» за лепшыя мужчынскую і жаночую ролі другога плану дасталіся адпаведна Крыстафу Вальцу за «Бясслаўных вырадкаў» і актрысе Монік за фільм «Пніся».

Лепшым анімацыйным фільмам стаў мультфільм «Уверх», а лепшым кароткаметражным ігравым фільмам, як ні перажывалі мы за ірландска-беларускія «Дзверы», была названая іншая стужка — «Новыя арандатары». Прыз за лепшы замежны фільм атрымала аргентынская кінакарціна «Сакрэт у тваіх вачах» Хуана Кампанелы, на рахунку якога ўжо ёсць галоўныя кінаўзнагароды ў Аргенціне і Іспаніі.

Што да самой цырымоніі, то, нягледзячы на тое, што ў апошні момант арганізатары выкраслілі са спісу ўдзельнікаў скандальнага брытанскага коміка Сашу Барона Коэна, а прамовы прызэраў былі бязлітасна скарочаныя, сёлетнюю прэмію паглядзелі больш за 41 мільён чалавек — хоць і не рэкорд, але і не спад цікавасці да «Оскара».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

САБАКА ЗНАЙШОЎ МЕТАДОН

Каб выявіць прыхаваны гандляром у кучы паперы наркотык, шмат часу не спатрэбілася.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, аператыўнікам аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Ленінскага РУУС паступіла інфармацыя, згодна з якой нейкі малады чалавек шукае пакупніка на буйную партыю метадону. Наркагандляра вырашана было браць адразу, тым больш у праваахоўнікаў мелася інфармацыя пра яго месцазнаходжанне: затрымалі дзялка ў кватэры дома № 4 па праспекце Ракасоўскага. Праўда, пры асабістым агляндзе ў 28-гадовага мінчаніна быў знойдзены толькі адзін пакецік з «дурманам», які заважыў менш, чым меркавалася, — усяго адзін грам. Тым не менш аператыўнікі вырашылі працягнуць пошукі: былі падставы меркаваць, што больш буйная партыя наркотыку знаходзіцца дзесьці ў кватэры. Каб выявіць яе, на месца здарэння тэрмінова быў выкліканы кінолаг са службовым сабакам. Разумная жывёліна ў лічаныя хвіліны адшукала схованку: больш важкі пакет з наркотыкам знаходзіўся ў кучы папер. Як высветлілася, у рукі да праваахоўнікаў патрапіў нідзе не працуючы, раней ужо судзімы за захоўванне наркотыкаў «бізнэсмен». Выявілася таксама, што ў поле зроку міліцыі ён трапляў менш за год таму, калі за збыт метадону была затрыманая яго сужыцелка, якая цяпер адбывае пакаранне. Мужчыну «свеціць» да 13 гадоў.

500 ЕЎРА ХАБАРУ — ЗА АРЭНДУ

У адносінах да дырэктара аднаго з камунальных прадпрыемстваў Наваполацка мясцовым міжрайаддзелам упраўлення дэпартаменту фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці ўзбуджаная крымінальная справа.

Паводле звестак прэс-службы Камітэта дзяржкантролю, падазраецца гэты кіраўнік у атрыманні хабару. У прыватнасці, як мяркуецца, у лютым ён атрымаў ад мясцовага жыхара ў якасці хабару 500 еўра. Апошні такім чынам расплаціўся з дырэктарам за станоўчае вырашэнне пытанняў, звязаных з прадстаўленнем у арэнду склада, што размешчаны на тэрыторыі прадпрыемства, без абавязковага заключэння дагавору арэнды.

Ігар ГРЫШЫН.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.37	18.04	11.27
Віцебск —	6.28	17.52	11.24
Магілёў —	6.27	17.54	11.27
Гомель —	6.23	17.51	11.28
Гродна —	6.52	18.19	11.27
Брэст —	6.52	18.21	11.29

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Тараса.*

К. *Яўгеніі, Аляксандра, Макара, Цыпрыяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

10 сакавіка

1520 год — створана «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага», славуты помнік беларускага летапісання. Гісторыка-літаратурнае сачыненне напісана на старабеларускай мове ў Вільні. Захавалася ў трох рэдакцыях.



1876 год — амерыканскі вынаходнік Аляксандр Бел у Бостане ўпершыню правёў гутарку па тэлефоне.

Цытата дня:

«Каб здзівіцца, дастаткова адной хвіліны; каб здзівіць — патрэбны доўгія гады».

Клод Адрыян Гельвецый (1715—1771), французскі філосаф.

АГОНЬ У АБРАДАВАЙ ПРАКТЫЦЫ

Агонь і яго хатняя ўтаймавальніца — печ — даволі шырока выкарыстоўваліся ў шматлікіх вясельных і памінальных абрадах. Агонь — гэта жыватворны ачаг, які не проста падтрымліваў гаспадарку, але мог пэўным чынам паўплываць на лёс чалавека або прадказаць яго. Калі на змярканні, адвячоркам гаспадыня запальвала агонь, каб можна было сесці за прадзіва або ткацтва, а тым часам нехта з дамачадцаў лаяўся ці проста гучна гаварыў, то жанчына настойліва перапыняла іх.

● Калі дровы паварушыць качаргой і яны хутка разгарацца, гэта значыць, што адсутныя ў доме гаспадар ці гаспадыня знаходзяцца ў добрым здароўі і вясёлым настроі.

● Калі збіраешся ў далёкую дарогу, перад тым як выйсці з хаты, топку печы абавязкова трэба зачыніць засланкай.

● Аб няшчасці сведчыла поўнае затуханне жару, прыгатаванага для таго, каб распаліць цяпло назаўтра раніцай.

● Асаблівай пашанай сярод еўрапейскіх народаў карыстаўся так званы «чысты агонь». Калі ў якой-небудзь вёсцы пачыналася эпідэмія яшчуру, то нехта з мужчын браў два ліпавыя або ясеневыя брускі і старанна цёр іх да таго часу, пакуль не з'явіцца язычок полымя. Гэтым агеньчыкам падпальвалі старую салому, траецкі «май», свежыя яловыя галіны. Праз густы дым праганялі ўвесь вясковы статак. А кожны гаспадар браў з вогнішча па адной галавешцы і нёс дадому, каб запаліць уласнае цяпельца і тым самым перасцерагчы ад хваробы ўсё жывое. Агонь, здабыты такім чынам, называлі «жывым», бо ён узнікаў, жывіў сам, як дар прыроды.

● На Беларусі вядомыя легенды і павер'і пра агонь зусім іншага характару. Вешчунамі смерці лічацца так званыя «балотныя агні». Існуе павер'е, што «балотны агонь» свеціцца ў тым месцы, дзе ляжыць труп немаўляці. Старыя людзі перакананыя, што «балотныя агні» часта можна ўбачыць над магілай нядаўна спачыўшых людзей. Мільгаючы ў начной цемры, яны лёгка могуць збіць з дарогі любога падарожніка, каб заманіць у балота і там патапіць яго. Некаторыя распавядальнікі казак упэўненыя, што такія агні загараюцца і на месцы кладаў, якія хавае ў сабе наша зямля.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ДВАЙНЫ «СЛУПНЯК»

Аўтарскі конкурс-9 працягваецца дванаццатым заданнем, а аўтарскі-10 — сёмым. У першым з іх міжнародны гросмайстар Уладзімір Матус (Масква) ажыццяўляе двайны «слупняк», у другім майстар ФМЖД Віктар Шульга (Мінск) — рэдкую ахвяру дамкі b8.

№ 9/12. **Белыя**: 15, 18, 19, 22, 29, 33, 39, 40, 42, 44 (10). **Чорныя**: 7, 8, 9, 11, 17, 21, 28, 31, 37 (9).



№ 10/7. **Белыя**: a1, a7, b2, d6, e5, f6, g5, g7, h2 (9). **Чорныя**: a3, a5, d8, e3, f2, f4, f8, g3, h6 (9).

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

У 17-ЫХ РАЗ!

Завяршыўся 36-ы чэмпіянат Беларусі па шашках-100 сярод жанчын. Перамогу ў ім святкавала міжнародны гросмайстар Ірына Пашкевіч — у 17-ы раз (!). Другое і трэцяе прызавыя месцы заваявалі сёстры Вольга і Дар'я Федаровіч. Вольга выканала бал міжнароднага майстра. Чацвёртай была міжнародны майстар Вольга Садоўская, пятай — нацыянальны майстар Наталля Герасімовіч. Усе яны засталіся ў вышэйшай лізе і на наступны год.

Пазнаёмцеся з цікавым эпізодам гульні: **Белыя** (Ірына Пашкевіч): 15, 27, 32, 33, 34, 35, 37, 39, 43, 45, 47, 48, 49 (13). **Чорныя** (Ганна Вузлік): 2, 4, 6, 7, 8, 9, 10, 16, 18, 23, 24, 25, 30 (13). Чорныя пайшлі на размен 1...24-29, але белыя пабілі так, што потым правялі камбінацыю з выйгрышам шашкі: 2. 35:24! 29:38 3. 34-30 4. 39:30 16-21 5. 27:16 6. 37-31 7. 47-41 36:47 8. 30-25 47:20 9. 25:1 2-7 10. 1:12 18:7. Прыгожа! Аднак чорныя здолелі выратаваць партыю. Баявая нічыя.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

Аўтарскі-9/9 (У. Матус): 22, 2, 10, 4, 49x. **Аўтарскі-10/4** (В. Шульга): e7 (f8:b4) b8, f4, c1, g5, f2x. **«Дамачныя канцоўкі»** (М. Грушэўскі): № 2. f8, g1, l h6, b4, d8x. l d4?, h8 (b6) c3 (bc5) h6 (b4 ll)=. ll (d4?, b2) e5x.

Сам сабе псіхолаг

ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД ПРЫГАЖОСЦІ — МАНІЯ

ПСІХОЛАГІ б'юць трывогу: у жыхароў мегаполісаў апошнім часам з'явілася новая манія, ледзь ці не больш небяспечная, чым усе астатнія. У яе аснове ляжыць даведзенае да абсалюту імкненне да прыгажосці, якое ператварае жыццё ў пекла.

Да залежнасці ад уласнай цялеснай прыгажосці, або б'юці-аддыкцыі, схільныя каля 30 % жанчын і 15 % мужчын. Адна з яе самых вядомых формаў — гэта анарэксія, хвароба, пры якой навязлівае жаданне стаць больш стройнай даводзіць ахвяру да апошняй ступені знясілення. Анарэксія можа сведчыць пра жаданне быць іншай, больш прывабнай — напрыклад, вядомай мадэллю. А гэта ў далейшым можа прывесці не толькі да падмены вобразу, але і да падмены свайго «я». Гэта таксама адна з формаў самападману.

З шырокай распаўсюджанасцю ў XXI ст. салярыяў высветлілася, што многія, асабліва моладзь ва ўзросце 14—25 гадоў, проста не могуць жыць без іх паслуг — з'явілася танарэксія, або залежнасць ад загару. Так, ультрафіялет хавае многія дэфекты скуры (прышчы, драпіны), аднак спецыялісты раяць не злоўжываць частымі наведваннямі салярыя, а абмежавацца курсам з 5-6 візітаў за паўгода.

Існуе і хваравітая залежнасць ад касметыкі — да яе, як сцвярджаюць псіхолагі, больш за ўсё схільныя жанчыны ва ўзросце ад 28 да 38 гадоў. У асабліва запушчаных выпадках у жанчыны, якая апынулася ў грамадскім месцы без макіяжу, псуецца настрой, пачынаецца істэрыка. Для заспакаення ёй неабходны мэйк-ап па ўсіх правілах — з прымяненнем танальнага крэму, пудры, румян, тушы і ценяў.

Нярэдка дамы становяцца закладніцамі складаных і дарагіх касметычных працэдур (ботакс, ліфтынг), надзвычай распаўсюджанай стала мамапластыка — хірургічнае павелічэнне грудзей. Усё часцей пад нож дзеля прыгажосці кладуцца і мужчыны (дастаткова ўспомніць Майкла Джэксана).

Яшчэ адной крыніцай хваравітай залежнасці, як ні дзіўна, нярэдка становяцца заняткі спортам. У надзеі набыць ідэальную фігуру яе ахвяры настолькі захапляюцца фітнэсам, што насуперак рэкамендацыям спецыялістаў пачынаюць трэніравацца кожны дзень і нават падчас хваробы. Ім здаецца, што, прапусціўшы адзін дзень заняткаў, яны распаўнеюць і ўжо ніколі не адновяць былую форму. Псіхолагі сцвярджаюць, што сярод кліентаў спартклубаў такіх каля 5 %.

Няма нічога дрэннага ў імкненні да прыгажосці, у жаданні перакрэсліць тое, што, як мы лічым, падкрэсліць неабходна, — твар, загарэлае спартыўнае цела, стройнасць, якая сімвалізуе здароўе. Але калі імкненне добра выглядаць узведзена ў культ, гэта не прыводзіць ні да чаго добрага.

Празмернае захапленне навязаным «глянцавым» ладам жыцця прыводзіць да парушэння гармоніі вобразу і да страты свайго «я», адсутнасці наладжаных сацыяльных кантактаў: імкнучыся схаваць нявіпэўненасць у сабе, жанчыны і мужчыны хаваюцца ў гэтым вобразе ад жыцця і ад сябе.

ТЫ АДНА ТАКАЯ, НЕПАЎТОРНАЯ...

У аснове ўсіх залежнасцяў, звязаных з прыгажосцю, ляжыць заніжаная самаацэнка. Нярэдка яе правакуюць недарэчная або грубая крытыка знешняга выгляду з боку маці і іншых блізкіх, жарты равеснікаў.

Калі вы заўважылі, што вашы дзеці, маладыя сваякі або сябры цяжка перажываюць сапраўдныя або ўяўныя заганы сваёй знешнасці, пастарайцеся ім дапамагчы. Вось некалькі простых парад.

■ Часцей гаварыце прыемныя рэчы, хваліце знешнасць чалавека, прыкмячайце добрыя прыродныя даныя.

■ Не крытыкуйце ў грубай форме нявмелы макіяж або неадпаведнае адзенне — лепш дапамажыце асвоіць няпростае майстэрства выглядаць і апранацца з густам. Калі не зможаце самі, запішыце дзіця на курсы візажыстаў або мадэлявання.

■ Старайцеся даваць парады не ў катэгарычнай, а ў мяккай форме, скарыстайце меркаванне аўтарытэтных для іх людзей.

■ Калі ж вашы кампліменты або парады адносна знешняга выгляду ўспрымаюцца ў штыкі, парайцеся з псіхолагам. Магчыма, патрэбная прафесійная дапамога.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Ведай сваіх

БЕЛАРУСКІЯ КРЫТЫКІ КАРАНАВАЛІ «БЕЗБІЛЕТНІКАЎ»

Чарговая неўміручая цырымонія ўшанавання беларускіх альтэрнатыўных музыкаў «Рок-каранацыя» адбылася сёлета на новай пляцоўцы (арганізатары абралі сталічны клуб «Рэактар», каб «ажывіць» дзею) і з новымі намінацыямі (усяго іх атрымалася 14, і гэта супала з парадкавым нумарам самой прэміі). Што ўсяляе асцярожны аптымізм — за невялікім выключэннем, і з новымі героямі.

Калі б на «Рок-каранацыі», як на Алімпіядзе, вёўся неафіцыйны медальны залік, яго выйгралі б з вялікім адрывам удзельнікі гурта «БЕЗ БІЛЕТА». Па выніках 2009 года Віталь Артыст і яго каманда ўзялі, па-першае, галоўную, вялікую карону — як «Гурт года», па-другое, перамаглі ў намінацыях «Альбом года» і «Кліп года» (адпаведна, альбом «Афрыка» і кліп на загаловачную песню з яго). Пры тым самі артысты сціпла заўважалі, што для іх галоўная ўзнагарода — гэта ўласна канцэрт, сустрэча з публікай.

«Песняй года», па рашэнні музычных крытыкаў, журналістаў і прадзюсараў, стала кампазіцыя «Ляпіса Трубяцкога» — «Ружовыя акуляры», а «Выканаўцам года» назвалі Зміцера Вайцюшкевіча. Тытул новай «Рок-князёўны», што ў рынцыпе мала каго здзівіла, атрымала салістка гурта «Naka» Анастасія Шпакоўская. Як «Дэбют года» было адзначана ўжо шмат на якіх айчынных цырымоніях ушанаванае трыа «The Toobes», як «Лепшы поп-рок праект» — гурт «Open Space». Не абышлі ўвагай арганізатары і старажылаў і дыназаўраў беларускага рока — так, гурт «Крама» перамог у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць», «Нейра Дзюбель» атрымаў у сваю калекцыю чарговую карону — «За вялікі ўнёсак у развіццё беларускага рока», а калектыў «Князь Мышкін» сваю хрустальную ўзнагароду ўзяў «За адданасць жанру». «Праектам года», бясспрэчна, стаў альбом «Тузін гітоў. Перазагрузка», на якім 12 вядомых айчынных артыстаў і калектываў у якасці эксперыменту змясцілі беларускамоўныя версіі сваіх хітоў. Вынік спадабаўся не толькі самім удзельнікам, слухачы таксама чакаюць працягу.

Як і анансавалі заснавальнікі прэміі Юрый Цыбін і Павел Кашырын, сёлета ў спіс дабавіліся новыя намінацыі. Гэта «Лепшы рэп-праект», дзе пальму першынства ўпэўнена трымаў «Нестандартны варыянт» (а хто б сумняваўся) і «Вяртанне года», у якім слухачы і крытыкі шчыра віталі гурт «Жнюв». Юбілейны канцэрт гурта N.R.M., нягледзячы на тое, што і яго саліст Лявон Вольскі, і ўласна гурт адмовіліся прысутнічаць на цырымоніі, спаслаўшыся на празмерную занятасць, быў ушанаваны асобнай каронай як «Падзея года».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Нефармат

СЕЗОННАЯ ХВАРОБА

Захварэць можа кожны. Асабліва ў вірусанебяспечны сезон, а таксама ў міжсезонне. Вось і я захварэла, падхапіла ўвесь набор: ад ламоты ў касцях да нуднага кашлю і майго «фірмовага» слязлівага насмарку. Гэта называецца знайшла сабе хваробу за свае грошы. Закарцела ж мне напярэдадні дня нараджэння купіць сабе нейкую абнову. За ёю, той абновай, накіравалася на далекаваты Варшаўскі рынак. Так называецца рынак у Брэсце недалёка ад пераходу «Варшаўскі мост». Пацягнулася туды, бо там і раней у адной гандляркі купляла нядрэнныя рэчы. Гандляркі той не знайшла, рынак наогул апусцеў халадамі. Памерала некалькі ўзораў у другой, адну нават выбрала. Але ж пакуль мерала пяць мадэляў, зуб на зуб не трапляў — на дварэ яшчэ стаялі маразы. Змерзла, адным словам. І праз тры дні, як і належыць чалавеку з вірусам, мела шкляныя вочы, адсутнасць голасу і поўную слабасць — самы звычайны грыпозны стан.

Найперш, як вучаць псіхолагі, я паспрабавала знайсці станоўчыя моманты ў сваім стане. І прыйшла да высновы: як добра, што захварэла цяпер, а не раней, калі ўвесь свет аж вар'яцеў ад наступлення каварнага «свінога» грыпу і яго інфармацыйных наступстваў. Тады было б проста страшней хварэць. А цяпер, калі самая цяжкая ноч, якую, відаць, можна назваць крызісам, мінула, было нават прыемна, што ўсе ў доме праяўляюць клопат, што ў аптэку кідаюцца па першай просьбе. Бо, як казала Фаіна Ранеўская, уся любоў ні халеры не вартая, калі ў аптэку схадзіць няма каму.

Так што, таблетак і спрэяў хапала, давялося пазмагацца пэўны час з рэспіраторным захворваннем амаль усім арсеналам лекаў, які прапануе паслужлівая рэклама. Бо хутка выздаравець найчасцей здараецца ў казках. А са мной такое здаралася толькі двойчы. Адзін раз у студэнцкія гады на Дзень Перамогі мы з сяброўкай-аднакурсніцай вырашылі паехаць у Маскву. Білеты купілі, з начлегам дамовіліся, а за дзень да ад'езду мяне літаральна зваліла з ног прастуда. Мы вельмі засмуціліся, падумвалі нават здаць тыя білеты. Але вылечыць мяне ўзяўся наш сусед па інтэрнаце, зараз дэкан прэстыжнага факультэта адной са сталічных ВНУ. Ён прынёс у гранёнай шклянцы, напоўненай на тры чвэрці, «народнага сродку» ўзору, відаць, сваіх віцебскіх краёў. У мяне вочы акруглiліся ад перспектывы такой тэрапіі, але ж вельмі хацелася ў Маскву. Я там яшчэ ніколі раней не была... А старэйшы таварыш раіў, абапіраючыся на досвед свайго дзеда, дзедавых землякоў. Адным словам, мая сяброўка аж рот разявіла ад здзіўлення, калі я залпам выпіла ледзь не ўсё змесціва пасудзіны. Яна потым, каб лепш усвядоміць убачанае, праглынула рэшткі, а грамадзе аб'явіла, што ім мяне расцерла. Ніколі болей я не адважвалася паўтарыць тыя эксперыменты. А тады... вы не паверыце, назаўтра я прачнулася здаровай. Не ведаю, ад чаго, можа ад самаўнушэння ў спалучэнні са «сродкам». І мы паехалі ў Маскву.

І я да гэтай пары памятаю, як пахла скошаная на газонах у Крамлі трава (у Мінску тады было халадней, касіць яшчэ не было чаго).

Другі раз цудоўнае выздараўленне адбылося са мной, калі працавала ў абласной газеце. Тады, дакладна ведаю, дапамаглі толькі высілкі волі. Я пакутавала ад холадавай алергіі: на ўсім целе, а таксама на твары і руках выступілі чырвоныя плямы. Яны ўжо, здаецца, пачалі сыходзіць, але былі яшчэ даволі прыкметныя. У кабінеце працаваць з такім тварам яшчэ магчыма, а вось выходзіць у людзі не вельмі хацелася. Ды каляжанка раптам падарыла ідэю. У горад на адзін дзень прыехаў паэт Еўтушэнка — можна ўзяць інтэрв'ю, калі не спаць у шапку. Мне вельмі хацелася тады ўзяць інтэрв'ю ў знакамітасці. Спачатку мы высветлілі праграму паездкі. Аказалася, што да яго сустрэчы з мэрам, дзе я намерылася паэта пераняць, заставалася дзве гадзіны. Гэты час я піла гарачую мятную гарбату, перагортвала ўсе кніжкі паэзіі і прозы аўтара, якія хутка ўдалося знайсці. І за дзве гадзіны тыя плямы як рукой зняло. Інтэрв'ю адбылося, і расійскі паэт, які пражывае ў Аклахоме, падараваў мне свою кніжку з цікавым надпісам. А запомнілася найбольш, што ў Аклахоме ён сумуе па яблыках-антонаўках, якіх у Амерыцы няма... Мне таксама хацелася духмяных антонавак, калі я хварэла. Толькі дзе іх купіш цяпер? Але ж, дарагі чытач, ужывай вітаміны, трымай ногі, і не толькі, і цяпло і не хварэй!

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Усміхнемся!

— Фіма, што вы ўвесь час маўчыце?

— Каб я ў такі мароз рукі з кішэняў вымаў?..

☺

Бабуля Майка Тайсана ўкладвала ўнука спаць з двух удараў.

☺

Поўная жанчына — сяброўцы.

— Я хаджу ў басейн на плаванне. Кажуць, ад гэтага можна схуднець.

— Глупства — паглядзі, як выглядае кіт!

☺

Самую вялікую яечню ў свеце прыгатавалі працаўнікі яраслаўскай птушкафабрыкі, калі ім выдалі зарплату выкрабленым прадуктам.

Яечня заняла ўвесь кабінет, машыну і касцюм дырэктара.

☺

Муж — жонцы.

— Калі б ты мяне сапраўды кахала, ты б выйшла замуж за каго-небудзь іншага...

☺

Святкуе 70-гадовы юбілей адмірал у адстаўцы. Яго жонка водзіць гасцей па хаце, паказвае пакоі, карціны. Каля адной вялікай фатаграфіі ў пазалочанай рамцы спыняецца і кажа:

— А гэта лінкор «Адважны», якім я 20 гадоў камандавала праз свайго мужа.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.
Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 1160. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12